Людзьмі звацца! —
Янка Купала

Літаратура і Мастацтва

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 г.

ШТОТЫДНЁВІК МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Пятніца, 21 снежня 1990 г. № 51 (3565) ● Цана 10 кап.

ЗАЯВА

ініцыятыўнага камітэта па стварэнні (адраджэнні)

Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады

Рэальна ацэньваючы наш цяжкі сённяшні дзень,

з трывогай думаючы пра дзень заўтрашні, пра будучыню роднай Беларусі, пра шляхі яе далейшага сацыяльна-эканамічнага і нацыянальна-дзяржаўнага развіцця,

усведамляючы, што неабходнай умовай для выхаду з крызісу і стварэння сапраўды цывілізаванай грамадзянскай супольнасці, сапраўды дэмакратычнай, прававой дзяржавы з'яўляецца існаванне такіх інстытутаў, як шматпартыйнасць, разнастайнасць формаў уласнасці і палітычных структур, свабоднае выяўленне думак, перакананняў і інтарэсаў,

мы прыйшлі да высновы, што ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі павінна заняць належнае месца беларуская сацыял-дэмакратыя.

Мы прыйшлі да высновы аб неабходнасці стварэння (адраджэння) Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады.

Мусім нагадаць, што гэтая партыя ствараецца не адвольна, што яна мае пад сабой адпаведны гістарычны грунт, адпаведныя карані, традыцыі, вопыт. Ля вытокаў беларускай сацыял-дэмакратыі (у летапісе нацыянальна-вызваленчага руху яна пазначана складанаскарочанымі назвамі БСГ, БСДРГ, БСДП, БСДРП) стаялі такія выдатныя палітычныя, грамадскія і культурныя дзеячы, як А. Луцкевіч, А. Уласаў, К. Кастравіцкі (Карусь Каганец), А. Пашкевіч (Цётка), В. Ластоўскі, А. Бурбіс, З. Жылуновіч (Цішка Гартны), А. Смоліч, А. Прушынскі (Алесь Гарун), Я. Дыла, Б. Тарашкевіч, А. Чарвякоў, С. Рак-Міхайлоўскі і інш. Звяртаючыся да тэарэтычнай спадчыны беларускай сацыял-дэмакратыі, пераконваешся, што многае ў ёй як нельга лепш адпавядала гісторыка-сацыяльным і прыродным асаблівасцям краю, духоўнаму складу і нацыянальнаму характару жыхара Беларусі. Яе ідэі не толькі не страцілі сваёй актуальнасці, але набываюць сёння асаблівы сэнс: зямля — сялянам і прыярытэтнае развіццё сельскай гаспадаркі; добраахвотная кааперацыя; сацыяльныя гарантыі работнікам; дэмакратычная ўлада, парламенцкая рэспубліка; незалежная, суверэнная Беларусь.

Пераклікаецца з нашымі сённяшнімі клопатамі і спадзяваннямі жаданне пачынальнікаў беларускай сацыял-дэмакратыі бачыць у грамадстве «роўнае багацце, а не роўную беднасць», разглядаць «сацыялістычны парадак» як «натуральную вышэйшую форму ў развіцці гаспадарскага жыцця». Задоўга да Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, да Пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, да Парыжскай хартыі для новай Еўропы яны ставілі пытанне аб гэтых правах і свабодах, гаварылі пра неабходнасць пераўтварэнняў, якія дадуць магчымасць асобе чалавека «вызваліцца з паднявольнай адміністрацыйнай «апекі», «вольна і шырока развіць свае прыродныя здольнасці, ухіліць нездаровыя, дэмаралізуючыя ўплывы няволі і прыціску».

Адзін са «смяротных грахоў», якія прыпісвалі беларускай (гэтак жа, як і ўсёй еўрапейскай) сацыял-дэмакратыі яе апаненты, — гэта арыентацыя на рэформы, на рэфармісцкі, а не гвалтоўны шлях пераўтварэнняў, яе ўстаноўкі на сацыяльнае супрацоўніцтва, на вырашэнне спрэчных пытанняў і канфліктных сітуацый мірнымі сродкамі. Сёння мы з'яўляемся сведкамі своеасаблівай рэабілітацыі гэтых «грахоў». Сёння такую палітыку мы называем «новым мысленнем», «негвалтоўным светам», «узаемнай павагай і супрацоўніцтвам», «вяршэнствам закона» і г. д. Момант ісціны высвятляе пазітыўны вопыт сацыял-дэмакратыі, яе несумненныя заслугі перад чалавецтвам.

Спадзяёмся, што на новым гістарычным вітку адыграе сваю станоўчую ролю, плённа паслужыць верай і праўдай свайму народу і тая партыя, пра неабходнасць стварэння (адраджэння) якой ідзе размова.

Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Грамада (БСДГ, Грамада) уяўляецца нам:

— як левацэнтрысцкая партыя парламенцкага тыпу;

— як партыя гуманістычных прынцыпаў і агульначалавечых каштоўнасцяў;

— як партыя палітычнага рэалізму, нацыянальнай згоды і грамадзянскага міру;

— як партыя абароны грамадзянскіх, сацыяльных і палітычных правоў і асноўных свабод чалавека незалежна ад яго паходжання, нацыянальнасці, веравызнання і грамадскага становішча;

— як партыя адраджэння нацыянальнай самасвядомасці і самавызначэння народа на аснове Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР;

— як партыя ўзважаных падыходаў, канструктыўных рэформаў і пазітыўных праграм, цывілізаваных, негвалтоўных метадаў у сваёй дзейнасці;

— як партыя дыялогу і супрацоўніцтва з усімі дэмакратычнымі, прагрэсіўнымі сіламі.

(Працяг на стар. 2).

Камп'ютэрызацыя: погляд збоку.

Фота А. ШАБЛЮКА.

17 снежня ў Маскве адкрыўся IV З'езд народных дэпутатаў СССР. Сярод пытанняў, вылучаных на парадак дня, такія важнейшыя для лёсу краіны, як меры па пераадоленні крызіснай сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сітуацыі і аб агульнай канцэпцыі Саюзнага дагавора і парадку яго заключэння. З дакладам «Пераходзіць ад слоў да справы, рашуча рухацца наперад» выступіў Прэзідэнт СССР Міхаіл Гарбачоў. Выказаныя ім прапановы сталі прадметам гарачай дыскусіі не толькі на з'ездзе, але і ва ўсім грамадстве.

ПРАГРЭС ці «КАРЭННЫЯ ЗМЕНЫ»?

Пра дзве прапановы Прэзідэнта

У ДАКЛАДЗЕ на IV З'ездзе народных дэпутатаў СССР Прэзідэнт выступіў з прапановай правесці рэферэндум па двух пытаннях: аб Саюзным дагаворы і аб прыватнай уласнасці на зямлю.

Першая прапанова, думаю, не можа выклікаць прынцыповых пярэчанняў. Больш за тое, трэба прызнаць, што такая пастаноўка пытання адпавядае самой сутнасці нацыянальнага суверэнітэту. Асобны індывід не складае нацыі, значыць, не з'яўляецца яе суб'ектам. Нацыянальнасць неадчуджальная і, значыць, не можа быць некаму дэлегавана. Менавіта з гэтай прычыны не могуць выступаць у якасці суб'ектаў нацыі і органы дзяржаўнай улады. Суб'ектам улады з'яўляецца толькі народ, таму яму і толькі яму аднаму належыць права вырашаць, як ён мае ажыццяўляць свой нацыянальны, у тым ліку і дзяржаўны суверэнітэт.

Насцярожвае іншае: форма, у якой гэтая праблема пастаўлена. Я цытую гэтае месца з даклада: «Мы зыходзім з непахіснасці прынцыпу: кожны народ мае права на самавызначэнне. Але менавіта народ у цэлым. Лепшай формай яго волевыяўлення з'яўляецца рэферэндум. І я выношу на разгляд з'езда прапанову — правесці па ўсёй краіне рэферэндум, каб кожны грамадзянін выказаўся «за» ці «супраць» Саюза суверэнных дзяржаў на федэратыўнай аснове. Вынік рэферэндума ў кожнай рэспубліцы і з'явіцца канчатковым вердыктам».

Тут адразу ж з'яўляюцца два пытанні. Пытанне першае: што азначае «народ у цэлым»? Калі маецца на ўвазе, што толькі народ у цэлым з'яўляецца носьбітам нацыянальнага суверэнітэту, то гэта так. Як я ўжо казаў, ні асобны індывід, ні дзяржаўныя органы ўлады такой суверэннасцю не валодаюць. Калі ж

(Працяг на стар. 2).

(Пачатак на стар. 1).

Паведамленне аб намеры стварыць (адрадзіць) БСДГ упершыню публічна абвешчана на рэспубліканскім форуме інтэлігенцыі, які адбыўся 1 снежня г. г. у Доме літаратара і быў прысвечаны тэме «Інтэлігенцыя ў нацыянальным адраджэнні і ажыццяўленні суверэнітэту Беларусі». Мяркуючы па станоўчай рэакцыі ўдзельнікаў форуму, ідэя стварэння нацыянальнай сацыял-дэмакратычнай партыі даўно выспявала ў грамадскай свядомасці.

Мы мяркуем, што БСДГ стане часткай міжнароднага сацыял-дэмакратычнага руху, будзе супрацоўнічаць з сацыял-дэмакратычнымі, сацыялістычнымі рабочымі (лейбарысцкімі) партыямі і атрымае статус правадзейнага члена Сацыялістычнага Інтэрнацыяналу. Гэта пашырыць нашу магчымасць удзельнічаць у еўрапейскім працэсе, уносіць сваю лепту ў будаўніцтва агульнаеўрапейскага дому.

Мікалай АКСАМІТ — народны дэпутат БССР, Анатоль ВЯРЦІНСКІ — народны дэпутат БССР, Мікола ГІЛЬ — пісьменнік, Яўген ГЛУШКЕВІЧ—народны дэпутат БССР, Анатоль ГУРЫНОВІЧ — намеснік старшыні Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў, Лявон ДЗЕЙКА — народны дэпутат БССР, Уладзімір ЗАБЛОЦКІ — народны дэпутат БССР, Эдвард ЗАЙКОЎСКІ — кандыдат гістарычных навук, Сяргей ЗАКОННІКАЎ — пісьменнік, Мікола КІЙКА — эканаміст, вядучы спецыяліст выканкама Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў, Уладзімір КОНАН — доктар філасофскіх навук, Мікалай КРЫЖАНОЎСКІ — народны дэпутат БССР, Уладзімір КУЛАЖАНКА — доктар эканамічных навук, Сяргей НАВУМЧЫК — народны дэпутат БССР, Вадзім САЛЕЕЎ — дацэнт Беларускага політэхнічнага інстытута, Зміцер САНЬКО — намеснік галоўнага рэдактара выдавецтва «Навука і тэхніка», Анатоль СІДАРЭВІЧ — публіцыст, Сяргей ТАРАСАЎ — супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР, Міхась ТКАЧОЎ — доктар гістарычных навук, Алег ТРУСАЎ — народны дэпутат БССР, Яўген ЦУМАРАЎ — народны дэпутат БССР, Ігар ЧАРНЯЎСКІ—народны дэпутат Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў, Міхась ЧАРНЯЎСКІ — кандыдат гістарычных навук, Георгій ШТЫХАЎ — доктар гістарычных навук, Эрнест ЯЛУГІН — пісьменнік.

Ад ініцыятыўнага камітэта

Па ўсіх пытаннях, звязаных з утварэннем Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады, можна звяртацца па тэлефоне: 46-43-15 (вечарам і ў выхадныя дні) ці па адрасе: 220095 Мінск, паштовая скрынка № 34, Трусаву А. А.

ПРАГРЭС, ЦІ «КАРЭННЫЯ ЗМЕНЫ»?

(Пачатак на стар. 1).

маецца на ўвазе «новая гістарычная супольнасць», якая называецца «савецкім народам», то гэта — ідэалагічная пустышка, якая нарадзілася ў нетрах сусла ўскай канцылярыі. Ясна, што пустышка не можа валодаць правам суверэннасці. Як «савецкі чалавек», які жыве на тэрыторыі Беларусі, я проста не маю права вырашаць за беларускі народ — быць альбо не быць Беларусі ў складзе Саюза. Адзінае, што я маю права патрабаваць — гэта няўхільнага захавання маіх грамадзянскіх і палітычных правоў.

Праўда, тут узнікаюць свае цяжкасці. Кіруючыся «мудрым вучэннем» пра тое, што нацыі не сёння-заўтра адамруць (а, магчыма, не ў меншай ступені старым рымскім правілам — падзяляй і валадар, мы так кроілі палітычную карту Саюза, што дзяржаўныя межы рэспублік сталі там і тут не супадаць з этнічнымі межамі. І гэта таксама нельга ігнараваць. Было б і антыправавым, і амаральным пазбаўляць людзей, якія апынуліся ў іншых рэспубліках, магчымасці злучыцца са сваім народам толькі таму, што нейкаму «таварышу» па палітычных або якіх іншых матывах уздумалася паставіць памежны слуп у гэтым, а не ў іншым месцы. Дзеля таго, што праблема, пастаўленая Прэзідэнтам, не такая простая, як яна, відаць, уяўляецца і яму, і ягоным саветнікам.

Пытанне другое: што азначае гэтае «за» або «супраць» Саюза суверэнных дзяржаў? Асабіста я, напрыклад, і «за» і «супраць» — у залежнасці ад таго, які дагавор мне прапануюць. Ці не хоча часам Прэзідэнт спачатку прагаласаваць «за» ці «супраць» і толькі пасля гэтага «напоўніць» Саюзны дагавор «гуманным, дэмакратычным» зместам? У такой абстрактнай пастаноўцы альтэрнатыва «за» або «супраць» — падман. Нельга прапаноўваць народам і рэспублікам ката ў мяшку. Праект новага Саюзнага дагавору можа быць вынесены на рэферэндум не раней, чым будзе прыняты яго канчатковы праект.

ШТО ДАТЫЧЫЦЬ другой прапановы Прэзідэнта, то яна ў прынцыпе не можа быць прымальнай, бо пасягае на неад'емныя правы чалавека. У арт. 17 Усеагульнай Дэкларацыі правоў чалавека сказана: «Кожны чалавек мае права валодаць маёмасцю як аднаасобна, так і сумесна з іншымі». І далей (арт. 23): «Кожны чалавек мае права на працу, на свабодны выбар працы, на справядлівыя і спрыяльныя ўмовы працы і абарону ад беспрацоўя». Пад правам валодаць маёмасцю тут маецца на ўвазе, вядома, права ўласнасці, а не права на штаны, які кожны з нас (ва ўсякім разе, пакуль яшчэ) носіць. Кожны чалавек па самой прыродзе сваёй суверэнны і ў якасці такога з'яўляецца суб'ектам уласнасці.

Ёсць правы дзяржавы, але ёсць і правы грамадства. Гэтую мудрасць мы, дзякаваць Богу, пачалі, здаецца, спасцігаць. Трэба пайсці далей і прызнаць: ёсць правы грамадства, але ёсць і правы асобы, правы кожнага асобнага чалавека, неад'емныя яго правы. Ні дзяржаве, ні грамадству не дадзена на іх пасягаць. І калі ва ўсім Саюзе знойдзецца ўсяго толькі адзін чалавек, які жадае мець у сваёй уласнасці надзел зямлі і працаваць на ім, ні дзяржава, ні грамадства не могуць пазбавіць яго гэтага права, бо гэта не ўваходзіць у іх кампетэнцыю. Грамадства павінна жыць па законах, і не проста па законах, а па законах, заснаваных на неад'емных правах чалавека, а не на бальшавісцкім партыйным Статуце з яго патрабаваннем падпарадкавання меншасці большасці. Пра адносіны паміж грамадствам і кожнай асобай дакладна сказана ў той жа Дэкларацыі, артыкул 29 якой сведчыць: «Пры ажыццяўленні сваіх правоў і свабод кожны чалавек падвяргаецца толькі такім абмежаванням, якія ўстаноўлены законам выключна з мэтай забеспячэння належнага прызнання і павагі правоў і свабод іншых і задавальнення справядлівых патрабаванняў маралі, грамадскага парадку і агульнага дабрабыту ў дэмакратычным грамадстве». Усё. І не больш за гэта. Мы ж, абвясціўшы на ўвесь свет нашу прыхільнасць да правоў чалавека, не супраць, мяркуючы па ўсім, тут жа ўціснуць іх у пракрустава ложа ідэалогіі «гуманнага, дэмакратычнага сацыялізму» — гэтага магічнага круга, накрэсленага партакратыяй для перабудовы.

Мы гаворым пра карэнныя змены адносін уласнасці на сяле. Пакуль гэтыя «карэнныя змены» зводзяцца да аднаго: ператварэння ўчарашняга раба ў калона. Гэта, вядома, прагрэс. І ўсё ж. Трэба даць, нарэшце, нашаму шматпакутнаму селяніну права выбару, права быць гаспадаром свайго лёсу, а не цацкай у руках задаволенага сваім «сацыялістычным выбарам» бюракрата.

В. АКУЛАЎ,
доктар філасофскіх навук.

Беларусь—Славакія: творчыя сувязі

У час падпісання дагавора. Фота Ул. КРУКА.

У Міністэрстве культуры рэспублікі адбылося падпісанне Пратаколу аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствам культуры Славацкай Рэспублікі і Міністэрствам культуры Беларускай ССР на 1991—1992 гады. Ім прадугледжана развіццё раўнапраўных дружалюбных адносін, устанаўленне двухбаковых культурных кантактаў, умацаванне творчых узаемасувязей дзеячаў культуры і мастацтва абедзвюх рэспублік. Падкрэслена, што бакі праяўляюць зацікаўленасць у развіцці прамога супрацоўніцтва паміж абласцямі, гарадамі, раёнамі рэспублік, установамі культуры і мастацтва, творчымі саюзамі і таварыствамі. Такія кантакты ажыццяўляюцца на аснове дагавораў аб непасрэдным супрацоўніцтве, у якіх вызначаецца аб'ём, форма і спосаб фінансавання культурнага абмену.

Прадугледжана арганізацыя конкурсаў, фестываляў, семінараў, сімпозіумаў, выставак і

«МНЕ ДАДЗЕНА БАЧЫЦЬ РОЗУМ...»

Дарожная сустрэча

— Гэтыя імпартныя аўтобусы не на нашых цётак разлічаны, — прамовіла немаладога веку кабета, размяшчаючыся побач са мной. Я ехала ў Дом творчасці «Іслач», а яна ў ракаўскі санаторый да хворага ўнука. Сама сабой завязалася гаворка. Высветлілася, што Станіслава Савельеўна Корзун не толькі пра цэны і талоны ахвотна разважае (на чым міжволі ўсе жанчыны цяпер зацыклены), але і свабодна арыентуецца ў грамадскіх падзеях і палітычных плынях. Чытае ўсесаюзную і рэспубліканскую прэсу, сочыць за тым, што адбываецца на сесіях Вярхоўнага Савета БССР.

— Прама скажу вам: я за апазіцыю. Чаму? Праўду гаварыць. Вось хоць бы і пра зямлю. Яе трэба раздаваць людзям у прыватнае карыстанне. Бо яна ж людская, яе адбіралі ў людзей. І ў дзеда майго некалі адабралі. Багаты і культурны быў чалавек, парабкаў не трымаў, бо сям'ю меў вялікую — 16 душ дзяцей. Яго б забілі, мабыць, каб трое сыноў у Чырвонай Арміі не ваявалі.

Субяседніца паправіла пуховую хустку на галаве і прадоўжыла:

— Добра выступаў на сесіі Адамовіч. Разумны чалавек, рэальна на ўсё глядзіць. Замежных калгасаў у нас не так многа, большасць ледзьве канцы з канцамі зводзіць. Там толькі спецыялісты ды канторскія — жонкі спецыялістаў — жывуць прыпяваючы. На сесіі хто супраць прыватнай уласнасці на зямлю галасаваў? Дырэктары і старшыні. Яны сябе чамусьці аграрыямі завуць. Простая Маня перш падумала б добранька, на якую кнопку націснуць, а гэтым што? У іх свой інтарэс.

Адны вядомыя парламентарыі тут жа атрымалі з'едлівыя характарыстыкі, другія былі ўхвалены.

— Мне дадзена бачыць розум. З дэпутатаў, напрыклад, Ганчар дужа разумны і адукаваны. Як ён выступае, то рабочыя прыціхнуць і слухаюць. Якія рабочыя? Са страдарожскага БМУ. Я хоць і на пенсіі, але старажую яшчэ. На мае 78 рублёў сёння надта не пражывеш.

І Пазняк за Ганчара не дурнейшы, — вяртаемся да парламенцкіх дэбатаў, — але яму неахвотна слова даюць.

І расказала мне Станіслава Савельеўна, як яна 25 сакавіка на сталічны мітынг БНФ трапіла. Накіроўвалася з унукам у царкву, ды прыблудзіла. (Хацела блаславенне атрымаць, едучы на магілу загінуўшага бацькі ў Варшаву.) Ідзе па плошчы Леніна а вакол міліцыі ўсё больш і больш становіцца. Ачапілі плошчу, і бачыць цётка, што апынулася як бы ў ланцугу. Пытаецца ў аднаго служкі закона:

— Як мне к храму прайсці?

Той паціскае плячыма — не ведае. А другі, з пагонамі маёра, і зусім не зразумеў пытання:

— А што гэта такое?

Цётка не ўстрымалася ад іранічнай рэплікі ў яго адрас, а сама сабе зрабіла вывад, што міліцыянеры не мінскія, прывезены аднекуль здалёку. Сустрэчныя расталкавалі ёй, што плошчу ахоўваюць, што мітынг адбудзецца ў скверы Янкі Купалы.

Дасюль яна мала чула пра БНФ. На мітынгу, не пазбаўленым, як ёй падалося, рысаў тэатральнасці, яна пачала распытваць удзельнікаў:

— А Васіль Быкаў падтрымлівае Народны фронт?

Пачула станоўчы адказ і супакоілася. Быкава яна чатала ўсяго («У дачкі-настаўніцы ёсць падпіска яго твораў») і пераканана, што такі мудры чалавек памыляцца не можа.

Мяркуючы па дасведчанасці і літаратурнай мове, я і саму яе прыняла б за былую настаўніцу. Аказалася — не, пошту

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

ЦІ ДАПАМОЖА ТАКАЯ «РАКІРОЎКА»?

Ці ведаў калектыў нашага Рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры, што пасля двух дзесяцігоддзяў сваёй работы, літаральна праз месяц пасля юбілею, атрымае паведамленне аб... ліквідацыі ўстановы? І кастрычніка 1970 года пастановай Савета Міністраў СССР інстытут быў адкрыты, а 2 лістапада 1990 г. калегія Міністэрства культуры БССР пастанавіла яго ліквідаваць разам з Рэспубліканскім навукова-метадычным цэнтрам. Дзеля чаго? Высветлілася, дзеля стварэння навукова - даследчага інстытута культуры.

Пасяджэнне калегіі было, відаць, закрытае, таму што кіраўніцтва нашага інстытута пра яго нічога не ведала. «Папера» зверху прыйшла да нас толькі 26 лістапада. Крыху раней, да пасяджэння калегіі, у інстытуце выступіў першы намеснік міністра культуры БССР У. Гілеп. Ён пазнаёміў супрацоўнікаў з чарнавым накідам рэарганізацыі Міністэрства культуры, выказаўся супраць стварэння НДІ і заадно супакоіў, што нас гэта пературбацыя не закране. Але з пастановы ад 2 лістапада мы даведваемся, што менавіта У. Гілепу было даручана ўзначаліць работу па ліквідацыі вышэйпрыгаданых устаноў культуры і стварэнні навукова-даследчага інстытута.

Думка аб стварэнні ўласнага НДІ, безумоўна, імпануе многім. Але ці будзе на карысць самой культуры рэспублікі ліквідацыя галаўной і адзінай у сваім родзе ўстановы па «падсілкоўванні» шматтысячнага атрада работнікаў культуры новымі ведамі і вопытам?

За 20 гадоў работы ў інстытуце павысілі кваліфікацыю звыш 26 тысяч работнікаў культуры і мастацтва. Штогод у сценах інстытута навучаецца больш за 1700 спецыялістаў. Другі год працуе школа менеджэраў. Штогод у інстытуце праз таварыства «Радзіма» знаёмяцца з беларускай культурай дзесяткі нашых суайчыннікаў з Бельгіі, Польшчы, Галандыі, Канады і іншых краін. Звяртаюцца да нас і спецыялісты народнай адукацыі. Большасць работнікаў культуры сваю прафесійную падрыхтоўку могуць набыць толькі ў нашым інстытуце. Аналіз паказвае, што пасведчанне пасля месячнага курса навучання ў інстытуце з'яўляецца адзіным дакументам амаль для 30 працэнтаў сельскіх работнікаў клубаў і бібліятэк, якія ўвогуле не маюць спецыяльнай адукацыі.

Сотні лепшых вучоных і спецыялістаў Беларусі і іншых рэспублік далучаны да вучэбнага працэсу ў ІПК. На базе інстытута не раз праводзіліся ўсесаюзныя семінары.

Але самае каштоўнае для нас — задаволенасць вучобай саміх слухачоў. Нездарма дырэктар ДМШ з Мазыра Э. Максімава на пасяджэнні «круглага стала» 28 лістапада г. г. у прысутнасці супрацоўнікаў Міністэрства культуры заявіла: «Стажыроўка ў сталіцы неабходная. Мы побач з новымі ведамі, атрыманымі ад буй-

г. д. Указваецца, што абодва бакі будуць падтрымліваць камерцыйныя абмены выканаўцамі і калектывамі, кантакты паміж тэатральнымі, музычнымі і іншымі ўстановамі. У рэпертуар музычных, тэатральных, балетных і эстрадных калектываў рэспублік мяркуецца ўключыць выдатныя творы аўтараў рэспублік.

Плануецца ў 1991 годзе правесці ў Мінску фестываль «Славянскія тэатральныя сустрэчы», падтрымліваць удзел у мерапрыемствах, прысвечаных славянскай супольнасці.

За Міністэрства культуры БССР пратакол падпісаў міністр культуры Беларусі Я. Вайтовіч, за Міністэрства культуры Славацкай Рэспублікі — намеснік міністра культуры Славакіі М. Ковач. Я. Вайтовіч і М. Ковач абмяняліся прамовамі.

Наш кар.

разносіла, мае ўсяго тры класы адукацыі — тое, што паспела набыць да вайны. Потым было пекла — канцлагеры ў Жлобіне, Рагачове, Красным Беразе, дзе ў дзяцей бралі кроў, і нарэшце самы страшны — Азарычы, участак балота, абцягнуты калючым дротам. Два тыдні пад адкрытым небам, ды калі — у лютым-сакавіку, з дзвюма меншымі сястрычкамі.

— Вызваляў нас у 1944 дзявочы батальён. Каго выносілі, хто за мокрыя полы шынялёў чапляўся, хто сам клыпаў. Дзевяць тысяч малых вывелі тады за суткі, начаваць ніводнае дзіця не засталося, а чарнобыльскіх дзяцей дык каторы год ніяк не могуць з бяды вывесці! — са скрухай гаворыць Станіслава Савельеўна.

Яна ўспомніла, як летась выступала на рэспубліканскім злёце. (Па ініцыятыве Дзіцячага фонду сабралі тых, хто зведаў у дзяцінстве жахі фашысцкіх канцлагераў). Размаўлялі пра Ельцына і Караткевіча, пра апошнія публікацыі «Труда» і «Советской Белоруссии». Нядаўнюю рэспубліканскую падзею — XXXI з'езд КПБ — мая спадарожніца каменціраваць не стала. Абмежавалася кароткім:

— Пра сябе думаюць людзі.

І калі яна ў Ракаве, развітаўшыся, выйшла з аўтобуса, я падумала: вось табе і тры класы адукацыі! Не ведаю, як кухаркі, а такія паштаркі, напэўна, маглі б кіраваць дзяржаваю...

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ.

ных спецыялістаў, мелі магчымасць сустракацца з калегамі і іншымі работнікамі, якія навучаюцца ў ІПК. Калі павышэнне кваліфікацыі аддадуць у раёны, то сама сутнасць гэтага працэсу страціць у якасці і аб'ёме».

Ды і калектыўнае пісьмо на імя міністра культуры рэспублікі, якое напісалі дырэктары дзіцячых музычных школ і школ мастацтваў,— пра тое ж.

Шкада, што супрацоўнікам інстытута так і не давялося пагутарыць з міністрам. У нас ёсць нямала прапаноў па ўдасканаленні сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў ва ўмовах пераходу да рыначных адносін, па рэалізацыі ідэі бесперапыннай адукацыі работнікаў культуры, па структурнай рэарганізацыі самога ІПК. Але логіку такой арганізацыйнай «ракіроўкі» нам зразумець цяжка.

В. МАЛЫГІН, І. ТРАФІМАВА, І. СКРЫПНІК, М. ДРАГІНА, Л. НІКІЦІНА, Л. МАСЮКОВА, І. БАРСУКОЎ — супрацоўнікі Рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры (усяго 21 подпіс).

«ЖЫХАР НАВАГРУДСКАГА РАЁНА В. Свораб звярнуўся ў мясцовы саўгас «Дубкі» з просьбай даць яму ў арэнду адкорм бычкоў. Там пайшлі насустрач, напачатку паабяцаўшы зямельны ўчастак, пашу, кармы для жывёлы. Карыстаючыся нявопытнасцю Свораба, кіраўнікі гаспадаркі далі яму падпісаць дагавор, згодна з якім арандатар мушаны быў узяць на адкорм 15 выбракаваных цялят, якія адставалі ў вазе і росце. Двое бычкоў неўзабаве, як кажуць, адкінулі капыты. Замест іх арандатар вымушаны быў за свае грошы купляць новую жывёлу. Завярцеўся Свораб каля тых адкормачнікаў на паўтара гады, не атрымліваючы ад саўгаса амаль ніякай дапамогі. Бульбу на корм жывёле яму прадавалі па самай высокай цане, сілас — сапсаваны. Так што даводзілася арандатару летам з раніцы да вечара махаць касой, абкашваючы ўздоўж дарог траву бычкам. І вось вынік: арандатар не толькі нічога не зарабіў, а яшчэ застаўся вінен саўгасу 7200 рублёў 96 капеек — менавіта на такую суму саўгас падаў на яго іск у суд. Там, праўда, іск задаволілі толькі на тры тысячы рублёў, але і гэта для яго вялікая сума. У Васіля Свораба вялікая сям'я: ён з жонкай і чацвёра малых дзяцей. Я чуў, што да Свораба неўзабаве павінны прыйсці судавыканаўцы, каб за доўг саўгасу забраць з хаты дзіцячую радасць — тэлевізар, а таксама апошнюю матэрыяльную падтрымку сям'і — карову.

Паважаная рэдакцыя, надрукуйце, калі ласка, гэты мой ліст, памажыце чалавеку выкараскацца з бяды. Колькі можна цярпець гэты здзек калгасна-саўгаснай сістэмы з простага чалавека!

Я. Война, выхавацель Адампальскай спецшколы Навагрудскага раёна».

Судовая справа Васіля Свораба

Чалавек паспрабаваў быць арандатарам...

ХАЧУ КРЫХУ СУПАКОІЦЬ аўтара ліста. З хаты Свораба нічога не ўзята. Я размаўляў з судовым выканаўцам Навагрудскага раённага суда Валянцінай Акімаўнай Лебедзь, якая прызналася, што сапраўды мела намер апісаць маёмасць арандатара, але калі прыехала да яго, дык жахнулася — такой галечы, па яе словах, яна ніколі не бачыла. «Што ж тут было забіраць?» — нібы апраўдваючыся, казала мне судавыканаўца.

Потым мне самому давядзецца пабыць у хаце Васіля Васільевіча, і магу засведчыць, што сапраўды, акрамя старэнькага тэлевізара і нейкага падабенства канапы, прысунутай да сцяны з абадранымі шпалерамі, тут нічагусенькі не было. Не, зманіў — у кутку стаяла яшчэ палічка з кнігамі, пра якія гаспадар з непрыхаваным гонарам сказаў — «Мая бібліятэка».

Вось такая яна, экспазіцыя майго аповяду. Гісторыя, з якой я судакрануўся ў час камандзіроўкі ў Навагрудак, па маім перакананні, перарасла раённыя рамкі і па ёй, пэўным чынам, можна меркаваць аб пакутлівых праблемах, якімі жыве беларуская вёска, аб тым, што чакае яе заўтра.

ДЫК ШТО Ж ЗДАРЫЛАСЯ з арандатарам Васілём Свораба? З тэкстам дагавора паміж ім і саўгасам «Дубкі» я пазнаёміўся ў Навагрудскім раённым судзе. Старшыня суда Ігар Аркадзьевіч Енка, даведаўшыся пра мэту майго візіту да яго, заўважыў, што па-чалавечы яму шкада Свораба, але закон ёсць закон і суд абавязаны быў узяць для разгляду іск саўгаса «Дубкі». Усё-такі нейкую палёгку мы арандатару зрабілі, — сказаў Ігар Аркадзьевіч, — іск у поўным аб'ёме задаволены не быў, з сямі з нечым тысяч прысудзілі выплаціць толькі тры».

Старшыня суда распарадзіўся прынесці мне судовую справу Свораба, і, дэманструючы прыязь да карэспандэнта газеты, якую ён, па яго словах, вельмі паважае, запрасіў працаваць з дакументамі ў яго кабінеце.

Гартаю даволі ёмістую папку. Дагавор, даведкі, табліцы з разлікамі, якія павінны засведчыць віну «падсуднага». Не буду стамляць чытача пераказам усіх перыпетый гэтага канфлікту, скажу толькі, што адразу ж кінулася ў вочы нераўнапраўнасць бакоў, якія заключылі дагавор аб арэндзе. Адзін з іх — саўгас, дыктаваў свае ўмовы другому ва ўльтыматыўнай форме: «Арандатар павінен забяспечыць», «Арандатар абавязаны», «Арандатар нясе адказнасць» і да т. п. За што нясе адказнасць сам саўгас, было сказана досыць цьмяна і няпэўна.

Сёння «высокія бакі» без нянавісці адзін аб адным гаварыць не могуць. У саўгасе Свораба інакш не называюць, як гультаём, абібокам, няўмекам. Кажуць, што жывёла ў яго стаяла па шыю ў гноі, што ён амаль не карміў яе. «Бачыце, яму было дорага купляць кармы ў саўгасе», — з абурэннем гаварыла мне калгасная бухгалтарка. Скончылася ўсё тым, што саўгас ледзь не гвалтам адагнаў бычкоў Свораба на сваю ферму.

Як, пэўна, здагадваецца чытач, Васіль Васільевіч і яго жонка Алена Іванаўна мелі наконт усёй гэтай гісторыі свой, дыяметральна процілеглы пункт гледжання. На іх думку, саўгас наўмысна рабіў усё, каб арэнда не дала належных вынікаў. Яны ўспаміналі, як былы дырэктар саўгаса Каляда распарадзіўся не прадаваць ім бульбы, не даваць выпасаў для жывёлы, як мушаны былі карміць бычкоў сапсаваным сіласам. Адным словам, крыўд назапасілася многа. Успамінаю я словы на судзе прадстаўніка саўгаса: «Гаспадарка выканала свае абавязацельствы перад арандатарам толькі на шэсцьдзесят працэнтаў». Але не магу я забыцца і на карціну, якую намалявалі мне ў саўгасе: калі арандатарскіх цялят выводзілі з хлява, яны былі такія нягеглыя, што ледзь трымаліся на нагах.

Асцярожна, выбіраючы словы, кажу, што, можа, яму, школьнаму настаўніку малявання («Я вельмі здольны мастак», — заўважыў ён між іншым), няварта было б браць на сябе той арандатарскі клопат. «Чаму? — крыўдзіцца Васіль Васільевіч. — Вы паглядзіце, колькі ў мяне сельскагаспадарчай літаратуры — і як па-навуковаму карміць жывёлу, як вырошчваць добры ўраджай». Кніжкі такія я ў яго сапраўды бачыў, але, відаць, дапамагалі яны яму слаба.

Цяпер у Свораба нарадзілася ідэя ўзяць у асабістае карыстанне гектараў дзесяць зямлі, каб вырошчваць на ёй розныя сельскагаспадарчыя культуры. «Дзесяць гектараў — гэта нямала, — кажу я. — Як вы з імі ўправіцеся без тэхнікі?» — «Тэхніка будзе, — упэўнена адказвае Васіль Васільевіч, — мне абяцаюць у адным месцы прадаць трактар». Ён просіць пагаварыць наконт тых дзесяці гектараў з дырэктарам «Дубкоў». Я потым перадам просьбу Свораба новаму дырэктару саўгаса Вячаславу Вітальевічу Качану, і той паглядзіць на мяне, як на дзівака. «Што вы, што вы, — здзівіцца ён, — ды ў яго на прысядзібным участку расце толькі бур'ян».

ШТО І КАЗАЦЬ, «прожектер» усё-такі гэты Свораб. Але ні ў якім разе не хачу яго крыўдзіць. Многія з тых, хто ведае Васіля Васільевіча, гаварылі пра яго як пра сумленнага, далікатнага, цнатлівага чалавека. Узважыўшы ўсё гэта, не магу не абурацца незвычайнай жорсткасцю, з якой абышліся з ім, хай і няўдалым арандатарам.

Каторага чытача, магчыма, зацікавіць, з чаго склаліся тыя сем з нечым тысяч рублёў, якія Свораб аказаўся вінен саўгасу. Растлумачу. Узяўшы на адкорм 15 бычкоў, арандатар, згодна з дагаворам, павінен быў у дамоўлены тэрмін здаць іх саўгасу па 450 кілаграмаў кожны. Бычкі, як ужо гаварылася, вагі такой не набралі, і «недабраныя» кілаграмы памножылі на закупачную цану, з чаго і выйшла, што арандатар нанёс гаспадарцы страту на 7200 рублёў 96 капеек. Вось такая арыфметыка...

Я хачу зрабіць тут невялікае адступленне. Звяртаюся да вас, Вячаслаў Вітальевіч. Дырэктарам вы сталі не так даўно і вашага подпісу няма ў тых іскавых дакументах. У час нашай гутаркі вы сказалі, што нават былі рады, калі суд зменшыў іскавую суму на «карысць» арандатара. Але ж і тры тысячы для яго вялізныя грошы, варта толькі адным вокам зірнуць, як жыве ягоная сям'я. Помніце, Вячаслаў Вітальевіч, я спытаў у вас, ці такой ужо руплівай працай вызначаюцца ўсе без выключэння жывёлаводы саўгаса? Вы адказалі, што, вядома, далёка не ўсе. Пасля гэтых вашых слоў старшыня раённага аграпрамысловага аб'яднання Іван Міхайлавіч Пярко, з якім я прыехаў у саўгас і які прысутнічаў пры нашай размове, заўважыў, што штатны даглядчык, па віне якога жывёла не набрала б патрэбнай кандыцыі, у крайнім выпадку быў бы пераведзены на іншую працу, але судзіцца з ім за гэта, спаганяць з яго грошы саўгас не стаў бы. Вы пагадзіліся з гэтым, заўважыўшы, што не былі б супраць, каб суд наогул не прызнаў саўгасны іск, або прысудзіў плаціць Сворабу чыста сімвалічную суму, каб вам адчытацца перад рэвізорамі.

Не ведаю, Вячаслаў Вітальевіч, ці пагодзіцеся вы са мной, але, на маю думку, у тым асуджэнні вашымі сялянамі Васіля Свораба бачыцца мне іх рэакцыя на чалавека, якому захацелася выбіцца з агульнага гурту, працаваць на сябе, жыць сваім розумам. Ці не таму, як сведчаць шматлікія факты, у многіх гаспадарках людзей, жадаючых стаць фермерамі, арандатарамі, па ўказцы раённага начальства «прапускаюць» праз агульныя сходы калгаснікаў, якія, як правіла, адмаўляюць аднавяскоўцам у такім праве. Прымешваецца, відаць, тут і звычайная чалавечая зайздрасць, маўляў, ім усё, а нам нічога... Я чуў пра вас, Вячаслаў Вітальевіч, як пра чулага, гуманнага чалавека, і таму дазволю сабе звярнуцца да вас з просьбай — скасаваць доўг Свораба саўгасу. У рэшце рэшт, не са злодзеем, не з пачварнай асобай вы маеце справу. Ці ж справядлівым будзе так жорстка яго караць? У наш суровы век нам так не хапае спагады да бліжняга, умення дараваць адзін аднаму...

Сяму-таму можа падацца, што аўтар, звярнуўшыся да гэтай гісторыі, свядома ці не свядома лье ваду на млын працаўнікаў прыватнай уласнасці на зямлю, арандатарства. Гэта яны, маўляў, змогуць цяпер сказаць: «Бачыце, каму разбуральнікі калгаснага ладу хочуць аддаць зямлю!»

Так, у вачах нейкай часткі сялян саўгаса «Дубкі» Свораб пэўным чынам скампраметаваў ідэю арэнднага падраду, але ж гаворка ідзе тут толькі пра адзін такі выпадак, і ён не дае падстаў для нейкага абагульнення. Нарэшце, за шэсцьдзесят гадоў існавання калгасная сістэма скампраметавала сябе шмат разоў і, тым не менш, не збіраецца здаваць сваіх пазіцый.

(Працяг на стар. 4).

Судовая справа Васіля Свораба

(Пачатак на стар. 3).

ПРА ЎСЕ ГЭТА ішла ў нас гаворка з Іванам Міхайлавічам Перкам, у кабінеце якога мы заседзеліся. Сумоўнік мой — сярэдніх год, трывала скроены мужчына, расказаў, што родам з гэтых мясцін, некалі з бацькам працаваў на зямлі, потым, вывучыўшыся, займаў розныя кіруючыя пасады, звязаныя з сельскай гаспадаркай, пакуль не трапіў на цяперашнюю — старшыні аграпрамысловага аб'яднання раёна, першага намесніка старшыні і райвыканкома.

Трэба сказаць, што і гэта наша гаворка спачатку «круцілася» вакол асобы Свораба. Здзівіла рэзка негатыўнае стаўленне Івана Міхайлавіча да гэтага чалавека. Ён, аказалася, у курсе ўсіх перыпетый таго няўдалага арандатарства, неаднойчы, па яго словах, прыязджаў да Сворабаў, цікавіўся, як у іх ідуць справы. «Падвялі яны нас!» — з прыкрасцю рэзюмаваў Пярко.

Пазней я даведаюся, што з самага пачатку, з падачы райаграпрама, пра новаяўленага арандатара ўзняла шум абласная прэса, прысвечаны яму сюжэт прайшоў па Гродзенскім радыё і тэлебачанні. І раптам —такі канфуз. Цень ад яго, як я зразумеў, нейкім чынам лёг і на Івана Міхайлавіча. Дадамо яшчэ, што Свораб быў першым і адзіным на Навагрудчыне арандатарам, і сярод раённага начальства былі людзі, зацікаўленыя ў яго пэўным іміджы. Каб у тым жа Гродне маглі сказаць — вунь як шануюць новае на Навагрудчыне...

Цікаўлюся ў Івана Міхайлавіча, як ён успрыняў рашэнне з'езда народных дэпутатаў Расійскай Федэрацыі ўвесці прыватную ўласнасць на зямлю. Ён зацягваецца цыгарэтай і, гледзячы некуды ў бок, вымаўляе: «Няма ў мяне на гэта адназначнага адказу». Потым, усміхнуўшыся, дадае: «Ведаеце, майго бацьку, калі ў нас, у заходніх абласцях Беларусі, пачалася калектывізацыя, ледзь не залічылі ў кулакі, бо ў яго было восем гектараў зямлі. Але неяк абышлося. Уступіў ён у калгас, дзе, як і ўсё жыццё, працаваў старанна. Але, скажу вам па шчырасці, душа яго да таго калгаса не ляжала. Неаднойчы казаў мне: «Вось пабачыш, калгасы гэтыя доўга не пратрымаюцца, ну яшчэ пятнаццаць, яшчэ дваццаць гадоў, бо сапраўдны селянін працаваць гуртам, дзе адны па-сапраўднаму рупяцца, а другім—абы дзень ды ноч— не будзе».

— Мудры стары, — заўважаю я.

— Мудры то мудры, ды справа зайшла надта далёка, сяляне цяпер зямлю ва ўласнае карыстанне не возьмуць і пад прымусам...

Мне ўжо неаднойчы даводзілася чуць катэгарычнае: ніхто зямлю не захоча ўзяць. Але я б сказаў — пакуль што ўлады не надта кідаюцца, каб яе і даць. На Навагрудчыне выявіўся яшчэ адзін кандыдат у фермеры — А. Хіневіч, пенсіянер, былы аграном, старшыня калгаса, які папрасіў даць яму ў арэнду ўсяго пяць гектараў зямлі. Але пакуль выйшаў дазвол, давялося чалавеку пахадзіць па пакутах. Безвынікова звяртаўся да старшыні сельсавета Мельнікава, старшыні райвыканкома Турка, Івана Міхайлавіча Пярко, да землеўпарадкавальніка Кошара. З апошнім я размаўляў. Міхаіл Лаўрэнцьевіч растлумачыў, што яшчэ не «спушчаны» з Мінска пэўныя ўказанні на гэты конт. У Дзяржаграпраме рэспублікі, куды ён званіў, сказалі: «Пачакай».

Як сведчаць сацыялагічныя апытанні, за перадачу зямлі ў прыватнае карыстанне выказалася 46—48 працэнтаў апытаных. Гэта па краіне. Крыху меншыя лічбы дало і апытанне на гэтую тэму на Беларусі.

Так, сапраўды, большасць сялян пакуль што не гатова гаспадарыць на ўласнай зямлі. Гэта нейкім чынам і натуральна. Аграрная палітыка партыі за 60 гадоў рассяляніла вяскоўца, вынішчыла ў ім уласніка і гаспадара, ператварыла ў наёмнага падзёншчыка. Не сакрэт, што ўсё гэта спрыяла ўзнікненню сярод значнай часткі вяскоўцаў і ўтрыманцкіх настрояў.

Разумею рызыкоўнасць гістарычных паралеляў, але нешта падобнае, мне здаецца, у нас ужо было. Я маю на ўвазе сялянскія бунты супраць адмены прыгоннага права ў 1861 годзе. Сёння гэта ўспрымаецца як нонсенс, а тады многія прыгонныя лічылі, што, пазбавіўшыся памешчыка, яны губляюць у яго асобе свайго абаронцу. Ці не падобным чынам чапляюцца сёння многія сяляне за «чырвонага» памешчыка — калгас?

І ў гэтую маю камандзіроўку мне шмат разоў давялося чуць скаргі на адсутнасць належнай дапамогі дзяржавы сельскай гаспадарцы, і толькі, маўляў, таму вёска апынулася ў гаротным становішчы. Але, даруйце, толькі за мінулы год калгасна - саўгасная сістэма краіны атрымала крэдытаў на 250 мільёнаў рублёў. Беларусь толькі за дзесяць месяцаў гэтага года атрымала на сельскагаспадарчыя патрэбы крэдытаў на 700 мільёнаў рублёў. Як сказаў мне начальнік фінансавага аддзела Дзяржаграпрама БССР Анатоль Іосіфавіч Ціхановіч, трэцяя частка калгасаў і саўгасаў рэспублікі знаходзіцца ў вельмі цяжкім фінансавым становішчы. «Цяпер мы з надзеяй, — сказаў ён, — чакаем, што нам спішуць 1,4 мільярда рублёў. Адпаведная пастанова ўрадам ужо прынята.

«ЗА ЗЯМЛЮ, ЗА ВОЛЮ, за лепшую долю» — пад гэтым лозунгам бальшавікі схілілі на свой бок мільёны сялян у гады рэвалюцыі, грамадзянскай вайны. А потым... Потым нагульнавы з давыдавымі раскулачылі ціткоў, якія, паверыўшы таму лозунгу, пачалі да сёмага поту ўкалваць на абяцанай Савецкай уладай зямлі.

Гэта нашчадкі нагульнавых-давыдавых сёння палохаюць нас голадам у тым выпадку, калі сялянам дадуць зямлю ў прыватнае карыстанне. Быццам бы мільёны людзей не памерлі галоднай смерцю акурат пры калгасным ладзе. Ды і сёння пустыя паліцы прадуктовых магазінаў, картачкі, купоны, талоны на масла, цукар, муку, крупы, здаецца, гавораць самі за сябе.

Ды, аказваецца, не ўсім і гавораць. Пра гэта думалася ў час трансляцыі пасяджэнняў чарговай сесіі Вярхоўнага Савета БССР, дзе разглядаўся закон аб зямлі. Помню, выступала народная дэпутатка ад ветэранаў, персанальная пенсіянерка, і на мяжы істэрыкі крычала ў мікрафон, што яна ў маладосці была парабчанкай і не хоча, каб на яе зямлю прыйшлі новыя памешчыкі-капіталісты. Другі народны дэпутат абвінавачваў апазіцыю ў тым, што яна выступае за тэрміновы разгон калгасаў. Але ж апазіцыя БНФ, прапануючы свой варыянт Закона, мела на ўвазе, і гэта было шырока абвешчана, шматаблічнасць і роўнасць формаў уласнасці — дзяржаўнай, калгасна-кааператыўнай і прыватнай. Маўляў, хай спаборнічаюць. Трэці прамоўца задаваў рытарычнае пытанне: «Як гэты селянін, узброены толькі рыдлёўкай і віламі, будзе гаспадарыць на сваёй зямлі?». Слухаў яго і думаў, што пры жаданні можна знайсці выйсце і з такога становішча. У 20-я гады пры аднаасобным яшчэ гаспадаранні добра зарэкамендавалі сябе таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі. Можна ствараць і своеасаблівыя раённыя, ці міжраённыя машынна-трактарныя станцыі, дзе фермер мог бы ўзяць у арэнду трактар, камбайн, сеялку, аўтамашыну. Хто-хто, а ён бы лічыў кожную капейчыну ўзятага крэдыту, выкарыстоўваў бы яго з максімальнай карысцю.

Але ж апалагетаў калгаснага ладу, якіх у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Савета была большасць, гэтыя пытанні не цікавілі. Ім важна было захаваць уладу, прывілеі камандна-бюракратычнай сістэмы, у якой прыватызацыя зямлі выбівае глебу з-пад ног.

...У кабінет Івана Міхайлавіча Пярко зайшоў галоўны заатэхнік райаграпрама і, скоса зірнуўшы на мяне, напаўголаса паведаміў начальніку, што званілі з Гродна, з аблаграпрама, пыталіся, чаму раён мінусуе з надоямі, за апошні тыдзень — на 300 грамаў з каровы. Іван Міхайлавіч нічога не адказаў і пачаў некаму званіць...

Жыццё ішло па старой каляіне...

Міхась ЗАМСКІ.

Навагрудак—Мінск.

У клубе імя Ф. Дзяржынскага ў Мінску грамадскасць горада адзначыла 80-годдзе з дня нараджэння народнага артыста СССР Г. Цітовіча. На вечары выступіў мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага народнага хору БССР імя Г. Цітовіча М. Дрынеўскі, мастацтвазнаўца З. Мажэйка, паэт У. Карызна. Пасля ўрачыстай часткі адбыўся канцэрт, на якім выступілі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці рэспублікі і артысты народнага хору БССР.

Выступае М. Дрынеўскі.

Фота Ул. КРУКА.

Мікола МАЛЯЎКА

Шумяць дзяржаўныя трыбуны

Шумяць яны, дзяржаўныя трыбуны,
Шумяць па ўсёй краіне нашай бурна,
Шумяць ужо каторы год...
Маўчыць, не дзякуе народ.

Шумяць трыбуны — ад імя народа.
А сам народ працуе на заводах,
У полі выцірае пот,
Але — не лепш жыве народ.

Шумяць трыбуны... Новыя законы
Штампуюцца на з'ездах, як талоны,
Цячэ і абяцанак мёд,
Але — зняверыўся народ.

Шумяць яны, дзяржаўныя трыбуны,
Шумяць па ўсёй краіне нашай бурна,
Шумяць ужо каторы год...
Ці загаворыш ты, народ!

Пні прагрэсу

У век тэхнічнага прагрэсу
Хапае пнёў без галавы,
І вось ужо на месцы лесу
Гуляе вецер палявы.

Прагрэсу пні, яны не дрэмлюць,
Вядуць з прыродаю вайну:
На хлебным полі садзяць дрэвы,
У лесе сеюць збажыну.

На дол упаўшы, вянуць кроны
І засыхаюць карані —
Усюды, дзе ў кутках зялёных
Сядзяць яны, прагрэсу пні.

Як быццам з добраю душою,
Пра хлеб клапоцяцца, чуваць,
А хлеб купляем за мяжою,
Бо пні — нялёгка карчаваць.

Партрэт

«Перабудоўвацца трэба —
І рухне застою сцяна!» —
Як гром сярод яснага неба
Ударыла навіна.

Вялікія змены недзе,
Не цэніць час халуёў —
І ён у сваім кабінеце
Парадак ідэйны навёў.

За шафу прыбраў, як закрэсліў,
Партрэт, пад якім палысеў,
А сам у старое крэсла
Пад новым партрэтам сеў.

Чорны воран

Воран, а не белы лебедзь
Заляцеў у Курапаты —
І раскінуў крылы ў небе,
І вісіць, нібы распяты.

Спадарожнік чалавечы,
Да крыві здавён ахвочы,
Ён кружыў над полем сечы
І выдзёўбваў паўшым вочы.

Апавіты сумнай славай,
Не сканаў без сіл, праклятый,
А з мінуўшчыны крывавай
Даляцеў у век дваццаты.

Здрадзіў вольніцы птушынай,
Дзе ні пройдзе — там магіла:
Чорны воран стаў машынай,
Што людзей на смерць вазіла.

Смагу ён не мог спатоліць,
Гэты птах з абслугай злою,
Быццам і жывіўся толькі
Чалавечаю крывёю.

Браў міністра, генерала,
Каваля ў глыбінцы дзесьці,
А дарослых меней стала,
Дык не грэбаваў і дзецьмі.

І жывую памяць — сведку
Смерці іх, невінаватых,
Ён хацеў пасля навекі
Тут схаваць, у Курапатах.

Бачым, і цяпер лятае
Над магіл раскрытай тайнай,
Быццам зноў машына тая
Стала воранам звычайным.

Заклінаем мы і небам,
І зямлёю заклінаем,
Каб не ён, а белы лебедзь
Пралятаў над родным краем.

Будзе ранняя зіма

Кажуць, будзе ранняя зіма.
І бядуе мама: дроў няма.
А навошта тыя дровы,
Жар бярозавы, сасновы!
Да вясны, да градаў самых,
Забіраю ў горад маму,
Адзінокую ўдаву.
Цёпла ў доме, дзе жыву,
І не страшны ёй завеі —
Грэюць маму батарэі.
Пакідае родны кут,
А душа — зімуе тут,
І, каб цёпла ёй было
У хаце ціхай, дзе святло
Не ўсміхнецца ў час зімовы,
Мама думае пра дровы.
Цела целам, ды спярша
Клопат пра цябе, душа.
І бядуе мама: дроў няма.
Кажуць, будзе ранняя зіма.

Ананасы

Дабро запомніцца навекі.
Вітаем землякоў-гасцей:
Прывезлі дарагія лекі
І ананасы для дзяцей.

Гляджу малыя дзеці нашы
Аж разгубіліся на міг:
Яны як з казкі, ананасы, —
Не знаюць, як і есці іх.

Жывём пад дэфіцыту прэсам,
Не мае капіталу ўрад —
І сталі ўжо далікатэсам
І яблыкі і вінаград.

Баімся піць ваду з крыніцы,
Баімся браць, прыйшоўшы ў лес,
Грыбы, суніцы і чарніцы —
Айчынны наш далікатэс.

Вязуць з-за свету ананасы,
Вязуць усё, што ёсць, сюды —
У нашы бедныя калгасы,
У нашы школы і сады.

Глядзім, бацькі, і ледзь не плачам,
Хаця і ўдзячны землякам:
Пасылкі раздаюць бясплатна,
Як міласціну жабракам.

О божа, сорамна і горка:
Няўжо мы самі, без гасцей,
Не зможам вылечыць ад гора,
Адзець і накарміць дзяцей!

Лейкемія

Звялася,
Сэрца ные ў маці —
І не знаходзіць месца ў хаце:
Зірне на кнігі, на падушку —
Усё напомніць пра дачушку.
Заплюшчыць вочы, ды не спіцца,
Ніба сама яна ў бальніцы,
І думкі змрочныя, цяжкія:
Дачушку мучыць
Лейкемія.
А як смяялася, спявала,
Душа адтайвала, бывала,
Ад шчэбету яе, ад смеху.
Расла без слёз, бацькам на ўцеху.
Ці ўстане, ачуняўшы, з ложка
Яна, Чарнобыля заложнік!
Урад пакуль не дапамог,
Адна надзея ў маці —
Бог.
І пачала маліцца Богу.
Ды ў сенцах, будзячы трывогу,
Забразгацела клямка звонка,
Зайшла суседка-паштальёнка,
Зайшла — і зноўку сэрца ные:
Прынесла грошы —
Грабавыя.

Друкуючы артыкул З. Пазняка, мы ўсведамляем, што некаторыя выказаныя ім думкі (нават форма і тон іх выказвання) будуць не даспадобы не толькі палітычным апанентам нашага аўтара, але і тым, хто, спачуваючы ідэям БНФ увогуле, хацеў бы ад лідэра руху большай памяркоўнасці.

Разам з тым, артыкулы і пішуцца для таго, каб актывізаваць грамадскую думку. Усе разам мы, напэўна, здолеем адсекчы нейкія крайнасці і выпрацаваць здаровы погляд на тыя працэсы, якія адбываюцца вакол нас. Спадзяёмся, што ў гэтым дапаможа і сённяшняе выступленне З. Пазняка, у прыватнасці, яго тэзіс аб тым, што любая палітыка, любыя ідэі, любое супрацьстаянне не вартыя выедзенага яйка, калі гіне асоба ці несправядліва церпіць чалавек...

Зянон ПАЗНЯК,
старшыня Сойма БНФ «Адраджэнне», народны дэпутат БССР

РАСКОЛ

Каму і навошта ён патрэбны?

НЯДАЎНА я вярнуўся з паездкі ў Гродзенскую вобласць, дзе спатыкаўся з працоўнымі калектывамі. Партыйныя функцыянеры і пенсіянеры спрабавалі месцамі арганізаваць ідэйны «адпор» на ўзроўні пытанняў пра «памешчыкаў» і «капіталістаў». Аднак зацікавіла мяне не гэтая банальная акалічнасць.

Тэлефануе чалавек і кажа, што, маўляў, майце на ўвазе, маю палавіну паклікалі ў партком — нешта рыхтуюць... Тут жа тэлефануе кабета і папярэджвае, што, маўляў, мой дурань пацягнуўся ў гаркам — рыхтуюць правакацыю... «Вы хотите возвратить кулаков и бендеровцев (?), а коммунистическая партия во главе с Лениным дала нам счастливую жизнь», — піша мне іншая кабета, ветэран партыі... «Што гэта за разгул старых ідыётаў, — абураецца мой наступны карэспандэнт, — мы ж іх усіх кормім»... «Мы построили социализм — самое передовое общество на земле. Не скрою, были ошибки и искривления...» — пачынае да мяне ліст наступны «ветэран»... Такі вось сацыяльны калейдаскоп.

Засмучае не рэліктавая псіхалогія, а сам факт, што нашае грамадства пачынае ўжо расколвацца на бытавым узроўні. Гэтае раз'яднанне асабліва выявілася пад час небывалай па маштабе кампаніі дэзінфармацыі і паклёпу супраць БНФ, арганізаванай у лістападзе гэтага года партыйнай прэсай, на тэлебачанні, усімі сродкамі прапаганды і агітацыі.

7-ГА ЛІСТАПАДА 1990 года таталітарная сістэма на Беларусі атрымала адчувальны ўдар. Упершыню за 73 гады непадзельнага панавання партыйная наменклатура не змагла арганізаваць «святочную дэманстрацыю працоўных» у сталіцы Рэспублікі. Сапраўды, якія здравіцы ў «гонар» КПСС стане крычаць працоўны без шкарпэтак, без чаравікаў, купіўшы па талонах кіло макаронаў у месяц на сям'ю? Не адважыліся арганізаваць і «народны мітынг». Абмежаваліся «мітынгам наменклатуры», сціплым і нешматлікім. А ў самым цэнтры плошчы, якраз насупраць трыбуны, стаялі палаткі галадаючых.

У той жа дзень па галоўным сталічным праспекце пракрочыла шматтысячная антыкамуністычная дэманстрацыя і адбыўся антыкамуністычны мітынг, пад час якога да манумента У. І. Леніну былі пакладзены «дары» яго партыйна-дзяржаўнай сістэмы — атрыбутыка (пудзіла) ГУЛАГА, НКВД, голаду, рэпрэсій, «сацыялістычнага выбару». Гэтае тэатралізаванае дзеянне ў традыцыях культуры нашага народа: з мінулым, якім бы трагічным яно ні было, развіваюцца са смехам, з гумарам і алегорыяй. Сімвалічны акт адбыўся, нягледзячы на тое, што кіраўніцтва і функцыянеры ОМОН груба перашкаджалі патрабаванням народных дэпутатаў БССР прапусціць да помніка дэлегацыю з дзесяці чалавек для вяртання «дароў». Быў парушаны закон і парадак органамі правапарадку. Аб правапарушэнні народныя дэпутаты падалі заяву ў суд.

Рэакцыя КПБ на гэтыя падзеі была блізкай да істэрыкі. Антыдэпутацкая кампанія, якую праводзіць партнаменклатура, узмацнілася яшчэ больш. З'явілася нястрыманая, месцамі паклёпніцкая, палітычная заява Бюро ЦК КПБ; пачалася ўсеагульная дыскрэдытацыя БНФ. Падключылі парткамы, пракуратуру, пенсіянераў.

Змест допісаў і заяў розных «ветэранскіх» арганізацый сведчыць, што гэтыя людзі страцілі кантроль над сваімі словамі, над элементарнай логікай і сэнсам. І такімі трыццатымі гадамі патыхнула ад гэтых лістоў! Фенаменальная псіхалогія. Сталіністы — людзі асобага складу: толькі запахла ганеннем, толькі пачулі кліч «кусі» — тут як тут, цэлай чарадой. Няшчасныя людзі, скалечаная свядомасць. Лепш пайшлі б у царкву ды паспавядаліся...

Але вярнуся да таго, з чаго пачаў. Раскол грамадства, абвастрэнне дзеянняў партбюракратыі не можа не засмучаць. Пачынаючы з 30-га кастрычніка 1988 года Беларускаму народнаму фронту, які знаходзіцца фактычна на паўлегальным становішчы, удаецца стрымліваць агрэсіўнасць КПБ-КПСС. Шляхам, перш за ўсё, сваёй гуманістычнай кансалідуючай палітыкі. Сёння БНФ — адзіны з усіх аналагічных рухаў у СССР, які прынцыпова дапускае ўдзел камуністаў у сваіх арганізацыях, прытым нават партыйных функцыянераў (для апошніх ёсць адзінае абмежаванне — яны не могуць мець кіруючага становішча ў БНФ).

Такія дачыненні пагрунтаваны на прынцыпе гуманізму, дзе мерай усіх каштоўнасцей з'яўляецца чалавек, яго асоба, яго жыццё. Любая палітыка, любыя палітычныя ідэі, любое палітычнае супрацьстаянне не вартыя выедзенага яйка, калі гіне асоба ці несправядліва церпіць чалавек. Бальшавіцкі светапогляд аб'ядноўваў і не раздзяляў ідэалогію ад носьбіта гэтай ідэалогіі. Таму барацьба з ідэалогіяй прывяла ў нашай краіне да барацьбы з людзьмі, да чалавеканенавісніцтва, да тэрору і генацыду. Гуманістычная канцэпцыя, не прымаючы ідэалогію, змагаючыся супроць яе словам, логікай, вобразамі, фактамі і г. д., рашаючае значэнне пакідае за самім яе носьбітам, за чалавекам, які робіць выбар сам, — ніхто яго сілком не прымушае, не пагражае, не ставіць у безвыходнае становішча. Мы адасабляем суб'ект таталітарнай ідэалогіі (чалавека) ад самой гэтай ідэалогіі і змагаемся за яго асобу і свабоду.

У ПАЛІТЫЧНАЙ БАРАЦЬБЕ згодна гуманістычнай канцэпцыі нельга заганяць праціўніка ў кут, заўсёды трэба пакінуць яму хоць адны адчыненыя дзверы, каб ён мог выйсці і пераасэнсаваць свой стан. Такі падыход пры палітычных расколах грамадства, пры грамадскім супрацьстаянні дазваляе пры любым зыходзе захаваць гуманістычнае адзінства людзей, нацыю, яе супольнасць.

У камуністычную партыю ўступалі адны па перакананні, другія ашукаўшыся, трэція з-за кар'еры, чацвёртыя ад сацыяльнай безвыходнасці, пятыя з нейкай грамадскай мэтай, шостыя па разнарадцы і г. д. Кожны член КПСС, які мае партбілет, нясе палітычную адказнасць за агульныя справы сваёй партыі. Інакш быць не можа ў палітычнай арганізацыі. Аднак ніхто не можа адказваць па суду за яе калектыўныя злачынствы, калі ён сам гэтых злачынстваў не рабіў. Такім чынам, трэба аддзяляць палітычную, маральную адказнасць усіх камуністаў за палітыку КПСС і — індывідуальную юрыдычную адказнасць канкрэтных асобаў за канкрэтныя дзеянні ў партыі.

Гуманістычная канцэпцыя палітычнай барацьбы не перашкаджае Беларускаму народнаму фронту ставіць самыя вострыя патрабаванні аб адказнасці за злачынствы, аб судзе, аб антынароднасці і роспуску КПСС-КПБ, бо пры гэтым захоўваецца гуманістычны і прававы статус асобы, чалавека, які знаходзіцца ў КПСС, захоўваецца яго волевыяўленне і права выбару. Роспуск КПСС ажыццяўляецца шляхам вываду парткамаў і партагранізацый з прадпрыемстваў, шляхам дэпартызацыі дзяржаўна-прававых органаў і войска, шляхам нацыяналізацыі партыйнай маёмасці і, нарэшце, шляхам агітацыі камуністаў пакідаць шэрагі КПСС. Вось гуманістычны спосаб пазбаўлення ад таталітарызму, які знікне як туман, а людзі, нацыянальнае адзінства, народ застануцца.

30 чэрвеня — 1 ліпеня 1990 года была склікана канферэнцыя БНФ, на якой былі абмеркаваны адносіны да камуністычнай ідэалогіі і камуністаў.

Востра паўстала пытанне аб удзеле камуністаў у руху БНФ. Пасля працяглых дыскусій канферэнцыя пацвердзіла палажэнні статута БНФ аб супрацоўніцтве членаў КПСС у Народным фронце, абгрунтавала неабходнасць іхняга ўдзелу ў БНФ і адначасна распрацавала спосабы накіравання стыхійнага антыкамуністычнага руху ў арганізаваныя формы. Былі прынятыя адпаведныя дакументы.

Такая палітыка дала станоўчыя вынікі, у БНФ цяпер шмат былых камуністаў, якія плённа працуюць на карысць грамадства, дэмакратыі, беларускага заканатворства і культуры.

Усё, пра што я тут пішу, добра вядома партыйнай наменклатуры. Нічога канструктыўнага супраць нашай пазіцыі яны не могуць прапанаваць. Таму ўзяліся за традыцыйную сваю зброю — дэзінфармацыю насельніцтва, хлусню, паклёп, ашуканства, выстаўленне ўдзельнікаў і лідэраў БНФ у якасці новых ворагаў народа, нацкоўванне на іх пенсіянераў, ветэранаў партыі. Аказваецца, гэта БНФ імкнецца да захопу ўлады (у камуністаў, вядома), да таталітарызму і дыктатуры, да крыві і нават да «людаедства». І, канечне ж, не КПСС вінавата ў тым, што абабралі народ, што няма чаго абуць і адзець, што пустыя паліцы, што працуем як у дзіравае вядро, немаведама для каго, што чарнобыльская радыяцыя, што начальства незаконна атрымлівае шыкоўныя кватэры, за бясцэнак скупляе дзяржаўныя дачы, што народ бяднее, а наменклатура багацее, стварае прамысловыя асацыяцыі, свае прадпрыемствы, банкі, кааператывы... Не КПСС вінаватая, значыць, а незарэгістраваны дэмакратычны рух БНФ і яго нешматлікія дэпутаты, што выкрываюць у Вярхоўным Савеце наменклатурнае ашуканства.

У канцы 1988 года арганізаваўся Беларускі народны фронт, і ўжо ў 1989 праламаў злачынна-сакрэтную сцяну чарнобыльскага маўчання. Памятаеце «Чарнобыльскі шлях», «Гадзіну смутку і маўчання», «Чарнобыльскую асамблею народаў», экалагічныя мітынгі, паніхіды, сімпозіумы, артыкулы, заявы замежным карэспандэнтам, інтэрв'ю, сумесныя дзеянні з Акадэміяй навук БССР, зборы подпісаў, патрабаванні і г. д. Што рабіла ў адказ кіраўніцтва Рэспублікі? За «Чарнобыльскі шлях» цягнула ў суд лідэраў БНФ, перашкаджала дзейнасці камітэту БНФ «Дзеці Чарнобыля», які арганізаваў замежную дапамогу, паспрыяў тысячам чарнобыльскіх дзяцей і тысячам чарнобыльскіх сем'яў. Можа, каб не БНФ, маўчалі б дагэтуль пра радыяцыйны генацыд і не мелі б перспектывы вылезці з чарнобыльскай гразі?

Канечне, партыйная наменклатура памятае пра гэта пасвойму. Канечне, ёй не падабаецца адкрыццё Курапатаў, абнародаванне яе махінацый, сведчанне яе інтэлектуальнай бясплоднасці ў Вярхоўным Савеце і бяздарнасці ў палітыцы. Таму яна паклёпнічае на Народны фронт, імкнецца давесці, што не патрэбная яго справа нацыі; што не дзеля людзей працуе Народны фронт, а каб захапіць уладу; што Народны фронт — гэта не палітычна свядомая дэмакратычная частка народу, а купка экстрэмістаў; што БНФ — гэта тое самае, што і КПБ, толькі з палярным знакам і г. д. Маўляў, дзейнічайце, грамадзяне, хапайце адзін аднаго за чубы, высвятляйце палітычныя адносіны, можа, і забудзем, чаму мы так кепска жывем, хто намі кіруе і хто ў гэтым вінаваты.

ДЭЗІНФАРМАЦЫЙНАЯ КАМПАНІЯ, штучна паднятая ў друку, грунтуецца на паказе тэндэнцыйна змянціраванага і адпаведна каментаванага тэлерэпартажу, цэнтрам якога стаў эпізод 7 лістапада каля помніка Леніну. Вядома ж, не паказалі, як топчуць кветкі самі амонаўцы, не далі паслухаць, што казалі народныя дэпутаты. А шкада, бо я, напрыклад, не толькі характарызаваў палітычнае становішча на Беларусі, але імкнуўся выказаць і прынцыповыя адносіны БНФ да помнікаў Леніну.

Помнік той ці іншай асобе выяўляе тры асноўныя функцыі — гістарычную, эстэтычную, ідэалагічную. Са змяненнем палітычных абставін ідэалагічная функцыя помніка можа змяншацца, знікаць, набываць супрацьлеглае значэнне, выклікаць адваротныя ацэнкі і ўступаць у рэзкую супярэчнасць з грамадскімі поглядамі людзей. Могуць быць часткова пераасэнсаваны эстэтычныя ацэнкі, але гістарычная функцыя помніка застаецца, прытым з цягам часу ўзрастае. Таму пры аб'ектыўным падыходзе да культуры і гістарычным яе разуменні ні пры якіх абставінах нельга шкодзіць, псаваць і тым больш разбураць помнікі, бо яны адлюстроўваюць гісторыю, якую павінны ведаць не толькі мы, але і будучыя пакаленні людзей. Пры гэтым з пункту гледжання гісторыі не мае прынцыповага значэння, каму пастаўлены помнік — вялікаму гуманісту ці жорсткаму тырану. Трэба толькі называць іх сваімі імёнамі.

Аднак гісторыя паказвае таксама, што калі пáдае злачынная тыранія, грамадства ніколі не даруе і не захоўвае помнікаў тырану, імкнецца знішчыць сведчанні свайго заганнага ідалапаклонства. І дарма, бо праходзіць час, забываецца трагедыя і, глядзіш, з'яўляюцца новыя сумніцельныя куміры. Так адраджаецца зло. Тут парадокс, — каб спыніць эстафету зла, трэба захоўваць яго сведчанні.

Іншая справа, што такія помнікі патрабуюць функцыянальнага пераасэнсавання. Лепш за ўсё іх перамясціць у спецыяльныя музеі — тэрыторыі пад адкрытым небам. Менавіта такое рашэнне мы прапануем для шматлікіх скульптур У. І. Леніна. Эстэтычнага значэння пераважная большасць з іх не мае, затое гістарычная іх каштоўнасць безумоўная. Уяўляю такі музей, куды будуць прыходзіць нашы свабодныя нашчадкі — паглядзець на «манументальную прапаганду» эпохі сацыялізму. Шкада толькі, што неабдумана паразбівалі помнікі Сталіну (як і Гітлеру на Нямеччыне). Без іх уяўленне пра сацыялізм будзе няпоўным. Дарэчы, каб адчуць псіхалагічны і пазнаваўчы эфект такой выставы гісторыі са знакам мінус, раю схадзіць у Маскве на станцыю метро «Плошча Рэвалюцыі». Гэта гатовы музей скульптуры і пластыкі перыяду сталінізму, дзе вы за гадзіну даведаецеся пра эпоху і пра бальшавікоў не менш, чым з літаратуры, прачытанай за год.

Тое, што многія помнікі У. І. Леніну будуць дэмантаваны, можна не сумняваццa. Гэта пытанне часу. Антычалавечая палітычная публіцыстыка, сілавы захоп улады, тэрор, канцлагеры, экспрапрыяцыя хлеба і штучнае стварэнне голаду, вынішчэнне сялянства і грамадзянская вайна, ЧК, генацыд і масавыя расстрэлы людзей ад прастытутак да царскай сям'і, знішчэнне рэлігіі і духавенства — хіба У. І. Ленін не меў да гэтага дачынення?

З 1918 па 1922 год пры непасрэдных указаннях і палітычным кіраўніцтве У. І. Леніна і яго акружэння на тэрыторыі былой Расійскай імперыі было расстраляна, забіта, заморана голадам і катаваннем 13,1 мільёна чалавек, з іх толькі 800 тысяч загінула з абодвух бакоў на франтах грамадзянскай вайны («Наш современник». 1989, № 4, с. 166). Варта адзначыць, што да так званых «эксплуататарскіх класаў» належала тады ў Расіі толькі каля 4 мільёнаў чалавек. З іх 2 мільёны эмігравалі за мяжу.

13 мільёнаў ахвяр за 5 гадоў — гэта ў асноўным сяляне, інтэлігенцыя, духавенства. У 1920 годзе сам Уладзімір Ільіч пісаў: «Пролетариат гигантские жертвы принес для военных задач, на которые пришлось отдать десятки миллионов крестьян».

Ці ўзяць сакрэтны ліст У. І. Леніна ад 19 сакавіка 1922 года да членаў Палітбюро аб правядзенні расправы над праваслаўным духавенствам з мэтай запалохвання Царквы, з прапановай расстраляць «чем больше.., тем лучше» і «с такой жестокостью, чтобы они (праваслаўныя святары. — З. П.) не забыли этого в течении нескольких десятилетий». (Известия ЦК КПСС, 1990, № 4, с. 192—193). Згодна гэтаму плану было расстраляна дзеля пострахy звыш васьмі тысяч чалавек, у тым ліку Петраградскі мітрапаліт Веніямін.

Дарэчы, варта пачытаць дзелавую перапіску У. І. Леніна з 1917 па 1922 год. Больш за ўсё мяне ўразіла яго ўказанне расстрэльваць «неакуратных» салдат Чырвонай Арміі і салдацкія сем'і, якія былі заложнікамі...

ШТО Ж УВАСАБЛЯЕ сёння бронзавы правадыр у цэнтры Мінска? І тыя кветкі, што рэгулярна кладуць яму пад ногі? Што думаюць гэтыя людзі, на што спадзяюцца, на якія перспектывы?

27 ліпеня 1990 года Вярхоўны Савет БССР аднагалосна прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР. На XXXI з'ездзе КПБ гэтыя ж самыя дэпутаты фактычна адмовіліся ад Дэкларацыі, ад нацыянальнага войска, ад права чалавека на прыватную ўласнасць, выказаліся за падпісанне саюзнага дагавору на федэратыўнай аснове. Што гэта за двулікая «палітычная сіла»?

Хіба яшчэ трэба якія пытанні? Хіба яшчэ некаму незразумела, што пакуль кіруе гэтая дзяржаўна-палітычная карпарацыя, сваёй зямлі і сваёй уласнасці просты чалавек мець не будзе.

ranic

МАЙСТАР—
НАШ ПРОДАК

ВІЧ. Майстар—наш
к, «Народная асве-

Краўцэвіча расказ-
валася б, звычай-
талеркі, падкоўкі,
, але ўся справа ў
ны зроблены 400—
азад. Праз іх выву-
на даведацца, як
продкі, якой была
культура, сувязі з
одамі. Выданне ад-
першую чаргу
дапаможа ім выву-
ю Беларусі.

АЙЛА. Станоўчы ге-
рускай літаратуры.
родная асвета», 1990.
юбайла на матэры-
ьш значных твораў
літаратуры апош-
годдзяў ярасочвае,
роўвала яна сучас-
нсоўвала нядаўняе і
нулае. Перад чыта-
дзяць імёны пісьмен-
радстаўнікоў розных
.

КРОВИЩА
В ОГНЕ
ВОЙНЫ

УМЕНКА. Скарбы ў
ы. Мінск, «Беларусь»,

о звычайна: у агні
ў пакутавалі не толь-
Пад пагрозай зні-
наста знаходзіліся і
каштоўнасці. У кні-
кумені расказваецца
ды па выратаванню
ораў, якія сёння зай-
стойнае месца ў экс-
музеяў.

ИГОВОР
ВЕКА

ТАЎ. Прыгавор веку. Гі-
дакументальныя апо-
а рускай мове. Мінск,
сь», 1990.
гу вядомага пісьменні-
горыка Уладзіміра Яку-
йшлі дзве аповесці. У
«Падзенне другога Вер-
аворыцца пра апошнія
астыі Раманавых, па-
Стаўкі Вярхоўнага га-
мандуючага ў Магілёве,
ецца роля Грыгорыя
на ў набліжэнні да
ай рысы» расійскага
тва. У другой аповесці
аныя» расказваецца
гром так званага стра-
ўскага мяцяжу ў Гоме-
ы пабудаваны на бага-
хіўным матэрыяле.

Духоўны меч

«Мечъ и азъ, подражая Христу Господу, отъ уст моихъ испущаю, не человека убивающий, но злобы их и лукавства...»

С. ПОЛОЦКИЙ.

Ва ўмовах усёўзрастаючай цікавасці да свайго мінулага, да нацыянальнай культуры, традыцый свайго народа з'яўленне кнігі «Симеон Полоцкий. Вирши» з'яўляецца, несумненна, падзеяй вялікай важнасці. У зборнік увайшлі пераважна вершы, якія раней не публікаваліся, або тыя, якія на думку складальнікаў, характэрныя для творчасці Полацкага. І ў гэтым, на мой погляд, ёсць пэўны сэнс.

Падрыхтаваныя В. Быліні-ным і Л. Званаровай тэксты дазваляюць чытачу пазнаёміцца з ранняй творчасцю мысліцеля (беларускі перыяд); несумненную цікавасць выклічуць выкананыя В. Быліні-ным пераклады з польскай і лацінскай моў. Новыя грані ў творчасці Сімяона адкрыюцца чытачу дзякуючы знаёмству з раней не публікаванымі вершамі з «Вертаграда шматколернага».

Сімяон Полацкі вядомы большасці чытачоў як паэт-сілабіст. А разам з тым—і гэта падкрэсліваецца складальнікамі зборніка — творчасць мысліцеля ўяўляе сабой значную з'яву ў культуры беларускага народа. Таленавіты асветнік і грамадскі дзеяч, педагог і перакладчык, філосаф і выдавец — такім ведалі Сімяона яго сучаснікі. Спадчына Полацкага, што ляжыць ля вытокаў беларускай культуры, здольна даць вельмі многае для аднаўлення самасвядомасці народа, набыцця ім свайго аблічча, бо ў ім, кажучы тэрміналогіяй самога мысліцеля, «всякими... недуги одержимии обрящут по своей нужде полезныя былия и цветы».

Выказваючы шчырую ўдзячнасць складальнікам зборніка і ўлічваючы тое, што многія творы мысліцеля застаюцца неапублікаванымі, хацелася б выказаць некаторыя меркаванні з нагоды рэканструкцыі спадчыны Полацкага. Вядома, аналіз яго свецкіх твораў мае важнае гісторыка - літаратуразнаўчае значэнне. Аднак такі падыход дазваляе выявіць у лепшым выпадку асветніцкія, рэалістычныя элементы ў творчасці Сімяона. Скласці ж цэласнае ўяўленне можна толькі на падставе канцэптуальнага аналізу яго творчасці. Па гэтай прычыне хацелася б звярнуць увагу даследчыкаў і выдаўцоў, усіх тых, каму дарагая гістарычная спадчына беларускага народа, на той факт, што адкрыццё беларуса Полацкага для беларусаў яшчэ наперадзе. Новае прачытанне ўласнага мінулага дазволіць зразумець, дзе мы знаходзімся і куды трэба ісці. Наша духоўнае (і не толькі духоўнае) развіццё будзе ў многім вызначацца тым, як глыбока мы зможам спасцігнуць і ўвабраць у сябе тыя каштоўнасці, якія выпрацаваў наш народ за многія стагоддзі.

Такія, на наш погляд, павінны быць падыходы да адбору публікуемых матэрыялаў. У гэтай сувязі трэба адзначыць, што, не прэтэндуючы на ўсеабдымны характар зборнік адлюстроўвае некаторыя істотныя моманты развіцця беларускай народнасці і беларускай культуры. Мастацка - вобразнае адлюстраванне «пераломнага» перыяду ў жыцці народа даюць Сімяонавы «Метры на пришествие во град отчистый Полоцк... царя и великого князя Алексия Михайловича», «Стихи к осудару цару Алексию Михайловичу Великого и Малыя и Белыя Руси самодержцу». Разважанні пра лёс народа, культ асобы маскоўскага цара набываюць у гэтых творах манументальна - гістарычны характар, што сведчыць пра жывую сувязь мысліцеля з традыцыямі старажытна - рускага «витейства», фальклорам, дэкламацыямі Кірылы Тураўскага.

На мой погляд, В. Быліні-ну і Л. Званаровай удалося зрабіць многае для спасціжэння генезісу беларускай культуры. Ва ўступным артыкуле і каментарыях, акрамя біяграфічных даведак пра жыццядзейнасць Сімяона, робіцца спроба класіфікацыі свецкай спадчыны мысліцеля, вызначэння асноўных этапаў і тэндэнцый яго эвалюцыі, выяўлення характэрных асаблівасцей творчасці. Немалаважнае значэнне для чытачоў будуць мець і каментарыі да асобных твораў.

Паўната разумення спадчыны Полацкага не можа быць дасягнута без выяўлення ўзаемасувязі яго творчасці з эпохай, а таксама вырашаемымі на дадзеным этапе задачамі. І хоць складальнікамі зборніка зроблены спробы ў гэтых адносінах, яны яўна недастатковыя для фарміравання адэкватнага ўяўлення аб дзейнасці Сімяона. Хацелася б звярнуць увагу будучых даследчыкаў на той факт, што сацыякультурная дэтэрмінацыя дзейнасці Полацкага ў беларускі і маскоўскі перыяды розная. Адсюль і розніца вырашаемых ім задач. Калі для першага вызначальнай выступае грамадска - палітычная тэматыка, то маскоўскі перыяд яго дзейнасці звязаны з распрацоўкай маральна - аксеалагічных праблем на аснове

Симеон Полоцкий. Вирши. Мінск. «Мастацкая літаратура», 1990.

ЛАЧАФ-90

Пад эгідай Саюза пісьменнікаў СССР у Маскве прайшла ўстаноўчая канферэнцыя Усесаюзнай асацыяцыі пісьменнікаў баталістаў і марыністаў. Адкрыў яе старшыня Камісіі па ваенна-мастацкай літаратуры СП СССР І. Стаднюк. Прэзідэнтам асацыяцыі выбраны Ю. Вінаградаў.

Сярод віцэ-прэзідэнтаў — старшыня Камісіі па ваенна-мастацкай літаратуры СП Беларусі А. СУЛЬЯНАЎ. З ім гутарыць наш карэспандэнт А. Марціновіч.

— Анатоль Канстанцінавіч, стварэнне Усесаюзнай Асацыяцыі пісьменнікаў баталістаў і марыністаў — не даніна модзе, выбачайце?

— Даніна модзе? Адназначна скажу: не! Апошнім часам змяніліся адносіны да ваенна-мастацкай літаратуры. І змяніліся, на жаль, у горшы бок. На пісьменнікаў, якія працягваюць раскрываць тэму ратнага подзвігу, глядзяць ледзь не як на рэтраградаў. Іх кнігі неахвотна публікуюцца, аўтарам нават таленавітых твораў адмаўляюць у прыёме ў СП СССР. Камісіі ж па ваенна-мастацкай літаратуры — а яны ёсць у СП СССР, у пісьменніцкіх арганізацыях саюзных рэспублік, Масквы і Ленінграда — па сутнасці «бяспраўныя». Няма ў Саюзе пісьменнікаў СССР і спецыяльных выданняў, якія б найперш звярталі ўвагу на творы героіка - патрыятычнай тэматыкі. У трыццатыя гады такім выданнем быў часопіс «Знамя», заснавальнікам якога было ЛАЧАФ — Літаратурнае аб'яднанне Чырвонай Арміі і Флоту. Прыгадаем з сумам, што і ў Беларусі раней не абыходзілі ўвагай пісьменнікаў баталістаў і марыністаў. У прыватнасці, выходзіў у нас часопіс «Заклік».

— Даруйце, але хачу вам запярэчыць. Былі б выдатныя ці хоць бы значныя творы, а ў якіх часопісах яны будуць апублікаваны — не так і важна.

— Гэта, канечне, так, але ўсё ж пагадзіцеся: у сістэме нашага творчага саюза патрэбен адзіны цэнтр героіка - патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання словам. Мастацкім словам. Адсюль ўжо і неабходна ісці далей — ствараць выдавецтва, свае выданні і г. д. Такім цэнтрам, думаецца, і быў ЛАЧАФ, створаны ў 1929 годзе. Часопіс жа «Знамя» ўзнік у 1931 годзе. Ваенныя літаратары арміі і флоту разам з часопісам «Знамя» ўвайшлі ў склад Саюза пісьменнікаў СССР, а ЛАЧАФ перастаў існаваць у 1932 годзе.

— Значыць, створаная асацыяцыя баталістаў і марыністаў — свайго роду пераемніца ЛАЧАФа?

— Так, яна прызнае сябе праваспадчыннікам ЛАЧАФа з усімі юрыдычнымі і маёмаснымі правамі, якія вынікаюць у сувязі з гэтым. Усесаюзная Асацыяцыя пісьменнікаў баталістаў і марыністаў ствараецца, гаворыцца ў яе статуце, як добраахвотнае, творчае, незалежнае ад палітычных партый грамадскае аб'яднанне прафесійных пісьменнікаў і маладых літаратараў, што працуюць у галіне героіка - патрыятычнай тэматыкі. Членамі асацыяцыі могуць стаць таксама і супрацоўнікі літаратурна - мастацкіх рэдакцый выдавецтва Міністэрства абароны СССР, выдавецтваў «Патриот», «Граница», часопісаў «Советский воин», «Пограничник», «На боевом посту», «Советская милиция» і іншых.

— Ці не атрымаецца так, што асацыяцыя хоць і творчая, будзе своеасаблівым ідэалагічным прыдаткам для пэўных мэт?

— Гэта памылковае меркаванне. Канечне, асацыяцыя ствараецца ў мэтах аб'яднання на ідэйнай і творчай аснове прафесійных і маладых літаратараў, у мэтах каардынацыі іх сумеснай работы па патрыятычным і інтэрнацыянальным выхаванні працоўных, у першую чаргу моладзі, воінаў. Апавядаць пра ратныя будні воінаў і маракоў мы будзем з пазіцыі новага грамадска - палітычнага мыслення. І, вядома ж, зробім усё, каб узняць аўтарытэт Савецкіх Узброеных Сіл. Адначасова збіраемся выкрываць усё негатыўнае, што паслабляе любоў народа да арміі. Адным словам, і тут на першы план выходзіць тая ж праўда. Праўда і толькі праўда, якой бы яна жорсткай, драматычнай ці трагічнай ні была. Разам з тым, асацыяцыя пастараецца не замыкацца на праблемах сучаснай арміі і флоту, на падзеях Вялікай Айчыннай вайны. А грамадзянская вайна, а нядаўняя афганская? Ці шмат ёсць твораў, якія б сказалі пра іх праўду з вышыні нашага сённяшняга дня? Тое ж самае тычыцца і рэвалюцыйных падзей. А кінем позірк яшчэ далей, у нашу сівую мінуўшчыну. Спашлюся на прыклад Беларусі. Якія, карыстаючыся сучасным тэрмінам, «судьбоносные» падзеі тады адбываліся? Што мы пра іх ведаем ці, прынамсі, ведалі да нядаўняга часу? Возьмем Грунвальдскую бітву, паўстанне Васіля Вашчылы. Мне запярэчаць: першыя творы ўжо ёсць. Першыя ёсць—гэта, безумоўна, добра. А чаму адзін твор, два? Чаму не дзесяткі? Возьмем, напрыклад, Кулікоўскую бітву. Пра яе цэлая бібліятэка высокамастацкіх твораў. Такая ж бібліятэка павінна быць створана і пра тую ж Грунвальдскую бітву. Асацыяцыя і запрашае пісьменнікаў, сталых, маладых: пішыце, прапаноўвайце нам свае творы!

Па ўсіх пытаннях адносна дзейнасці асацыяцыі, супрацоўніцтва з ёю трэба звяртацца ў Камісію па ваенна-мастацкай літаратуры СП Беларусі ці да мяне асабіста па тэлефоне 36-51-46.

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

ПОЛАЦКАЯ САФІЯ: СКАРБ, ЯКІ НЕЛЬГА ДЗЯЛІЦЬ

У мінулым нумары «ЛіМ» змясціў карэспандэнцыю І. Жарнасек «Хто крыўдзіць праваслаўных?». Публікацыя атрымала розгалас. І гэта натуральна, бо лёс Полацкага Сафійскага сабора сёння хвалюе вернікаў і атэістаў, палачан і жыхароў іншых куткоў Беларусі. Мы абяцалі яшчэ раз вярнуцца да гэтай тэмы, і вось — «пастскрыптум» нашага няштатнага карэспандэнта.

Каму будзе належаць храм? Калі вернікам, то якім — праваслаўным ці каталікам? Ці, можа, Сафійка і надалей захавае свой сённяшні статус асяродка культуры. Вырашэнню гэтых няпростых пытанняў была прысвечана нарада ў Полацкім гарвыканкаме, што адбылася, як паведамляў «ЛіМ», 12 снежня. У размове прынялі ўдзел прадстаўнікі савецкай улады, Міністэрства культуры БССР, упаўнаважаны па справах рэлігіі Савета Міністраў рэспублікі А. Жыльскі, біскуп каталіцкай царквы на Беларусі Т. Кандрусевіч, епіскап Полацка-Віцебскай епархіі а. Дзмітрый, полацкія уніяты. На жаль, на сустрэчы не здолеў прысутнічаць мітрапаліт Філарэт, таму канчатковай дамоўленасці паміж рознымі канфесіямі не было дасягнута.

Але размова, пад час якой акрэсліліся пазіцыі яе ўдзельнікаў, адбылася. Большасць прысутных выказалася за тое, каб не спяшацца з перадачай Сафійкі вернікам.

Біскуп Тадэвуш Кандрусевіч звярнуўся да гарадскіх улад з просьбай знайсці ў Полацку месца, дзе маглі б адбывацца каталіцкія набажэнствы. Прадстаўнікі Полацка-Віцебскай епархіі настойвалі на тым, што Сафійскі сабор павінен належаць праваслаўным.

Хто ж мае большыя правы на Полацкую Сафію? А можа, надышоў час усім нам усвядоміць, што ёсць скарбы на нашай зямлі, якія дзяліць і нельга, і небяспечна?

А пакуль... Пакуль палачане чакаюць слова мітрапаліта Філарэта. Чакаюць яны і рашэння сесіі гарсавета.

Засталося дадаць, што нарада мела і практычны вынік. Каталіцкай абшчыне выдзелена месца для набажэнстваў. Яно, праўда, нічым не нагадвае храм Божы, ды вернікі задаволены і гэткай увагай да іхніх праблем: усё ж каляднае набажэнства ў Полацку сёлета адбудзецца не пад адкрытым небам...

Ірына ЖАРНАСЕК.

філасофскага аналізу. Эвалюцыя Полацкага - мысліцеля ідзе ў накірунку ад грамадска - палітычнага дзеяча, грамадзяніна і патрыёта свайго народа да асветніка і філосафа, чые думкі звязаны з клопатам пра лёсы народа, пошукамі шляхоў удасканалення чалавека і чалавецтва.

Цэнтральнае месца ў творчасці Сімяона займае праблема чалавека. Такая антрапалагічная ўстаноўка характэрна для многіх філасофскіх традыцый. Своеасаблівасць жа поглядаў Полацкага ў тым, што праблема гэтая вырашаецца ў сацыяльна - псіхалагічным, маральным ключы. Філасофія для Полацкага «нрав зол души исцеляет», г. зн. мае досыць практычнае прызначэнне. Гэта не практыцызм і тым больш не утылітарызм. Практычнасць для Сімяона — гэта хутчэй за ўсё маральная практыка, маральная творчасць. І ў гэтым, несумненна, прагрэсіўнасць поглядаў пісьменніка. Заслуга Сімяона ў тым і складаецца, што аб'ектыўна яго дзейнасць садзейнічала фарміраванню новага чалавека, гатовага вырашаць задачы, якія ставіць эпоха.

Істотным недахопам зборніка, на маю думку, з'яўляецца тое, што погляды Полацкага на прыроду чалавека, яго месца і ролю ў Сусвеце прадстаўлены занадта аднабакова. Мяркуючы па матэрыялах зборніка, маральныя прынцыпы Сімяона адыходзяць сваімі каранямі да сярэдняковага аскетызму. Думкі аб тленнасці і бессэнсоўнасці чалавечага існавання навяваюць вершы «Карціна чалавечага жыцця», «Песенька пра смерць», «Эпітафія прапаведніку», малююць нікчэмнасць і мярзотнасць чалавечага быцця.

Такое прадстаўленне поглядаў Полацкага досыць прамалінейнае і не адлюстроўвае сапраўднага становішча. На самай справе, погляды Сімяона на прыроду чалавека, яго ролю і прызначэнне ў гэтым свеце даволі супярэчлівыя, як і ўся яго творчасць. Створаны па вобразе і падабенстве творцы і надзелены разумнай душой, чалавек, на думку Полацкага, з'яўляецца вянцом прыроды і яе гаспадаром. Як свет створаны ў дзівоснай згодзе, так чалавек — добрым і цудоўным. Злое і пачварнае, на яго думку, ад няведання і свабоднай волі людзей. Таму Полацкі і разглядае ў якасці важнейшай задачы асвету чалавека; воля, абмежаваная мудрасцю, творыць дабро.

Творы, што ўвайшлі ў зборнік, даюць уяўленне і пра некаторыя іншыя грані творчасці Сімяона. У жанравых адносінах гэта самыя разнастайныя творы: «подобия» і «толкования», «образы» і «епитафия», «образов подписания» і «увещания» і г. д. Побач з вершамі грамадска-палітычнага і маральнага зместу ўключаны навукова-папулярныя («Новооткрытия»), дыдактычныя («Благоговейство»), гісторыка - патрыятычныя («Отчаяние короля шведского») і інш.

Няма сумніву ў тым, што і спецыялісты, і шырокае кола чытачоў сустрэнуць зборнік твораў выдатнага беларуса з ухвалой, з удзячнасцю да людзей, якія яго падрыхтавалі.

Н. ГРУДНІЦКІ.

«КЛОПАТ ЗАСЛУГОЎВАЕ ПАХВАЛЫ»

Сёлета, у год 95-годдзя з дня нараджэння Сяргея Ясеніна, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры набыў вельмі цікавую калекцыю «Ясенін і Беларусь», якую на працягу амаль трыццаці гадоў збіраў Уладзімір Міхайлавіч Фрыдман. Сціплы працаўнік аднаго з гомельскіх прадпрыемстваў, юнаком выпадкова сустрэўшыся з паэзіяй С. Ясеніна, ён праз усё жыццё пранёс любоў да яе.

У калекцыі — 112 зборнікаў С. Ясеніна на рускай мове, мовах народаў СССР і замежных мовах; усе зборы твораў паэта, якія выдаваліся ў нашай краіне. Шырока прадстаўлены кнігі творцаў ясенінскага акружэння.

Асабліва рэдкай з'яўляецца кніга пісьменніка і партыйнага дзеяча Г. Лялевіча «Сергей Есенин. Его творческий путь» (г. Гомель, «Гомельский рабочий», 1926 г.), яна захоўваецца толькі ў асобных вялікіх кнігасховішчах нашай краіны.

У калекцыі каля 200 даследаванняў і манаграфій, прысвечаных жыццю і творчасці С. Ясеніна, успамінаў сучаснікаў паэта.

Самастойнай часткай калекцыі можна лічыць «беларускую Ясеніняну», у якую ўваходзяць зборнікі вершаў Я. Пушчы, М. Лужаніна, А. Іверса, Н. Гілевіча, С. Грахоўскага, Я. Янішчыц з пранікнёнымі радкамі пра Ясеніна; кнігі з аўтографамі беларускіх перакладчыкаў паэта (А. Куляшова, Р. Барадуліна) і даследчыкаў творчасці С. Ясеніна, часопісы, экслібрысы беларускіх мастакоў (Я. Ціхановіча, А. Мельянца і іншых), значкі, медалі.

Ёсць у калекцыі амаль усе мініяцюрныя выданні твораў С. Ясеніна, якія выходзілі ў нашай краіне, 180 кніжных ясенінскіх знакаў-экслібрысаў, звыш 250 часопісаў і выразак з газет і часопісаў за перыяд з 1916 па 1987 г. з матэрыяламі пра паэта, 80 значкоў з выявамі Сяргея Ясеніна, фотаздымкі, ясенінскія паштоўкі, канверты, маркі, настольныя медалі, бюсты.

На падставе сабраных матэрыялаў і шматгадовай даследчай дзейнасці ў 1985 годзе У. Фрыдманам выдадзены бібліяграфічны паказальнік «Беларуская Ясеніняна (1925—1984 гг.)» — першае падобнае даследаванне не толькі ў Беларусі, а і ўвогуле ў саюзных рэспубліках. Кніга дае магчымасць даведацца, хто, калі ў якім беларускім выданні пісаў пра Ясеніна. Чытач мае магчымасць пазнаёміцца з бібліяграфіяй асобных выданняў паэта і перакладаў яго на беларускую мову. У якасці дадатка падабраны вершы беларускіх паэтаў, прысвечаныя С. Ясеніну, ясенінскія кніжныя знакі і вельмі цікавы дакумент «Письмо группы белорусских поэтов в газету «Комсомольская правда». Ліст гэты быў напісаны ў верасні 1926 года ў абарону С. Ясеніна ад фальсіфікатараў яго спадчыны.

Высокую адзнаку кнізе «Беларуская Ясеніняна», а таксама ўсёй вялікай збіральніцкай працы калекцыянера даў у лісце да У. Фрыдмана Ніл Гілевіч: «Думка мая самая добрая і пра гэту бібліяграфічную кніжыцу і пра ўсю Вашу работу ў галіне беларускай Ясеніняны. Сапраўды, гэты ваш душэўны клопат заслугоўвае высокай пахвалы і падтрымкі. Яго хочацца вітаць, бо нехта жа павінен дбаць і пра гэта, і жыць гэтым, і разумець, што гэта патрэбна людзям — для іх духоўнага росту і ўзвышэння».

Музей удзячны калектывам выдавецтваў «Юнацтва», «Беларусь» і «Ураджай» за матэрыяльную дапамогу ў набыцці гэтай калекцыі, якая дазволіць шырэй прапагандаваць сувязі братніх рускай і беларускай літаратур.

Н. ГАРЭЛІК,
малодшы навуковы супрацоўнік аддзела фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

Ці будзе храм у Курапатах?

Два гады назад у мінскім Палацы мастацтваў праходзіла Першая рэспубліканская выстава манументальнага мастацтва. Арганізатары прымеркавалі яе да 70-й гадавіны Ленінскага плана манументальнай прапаганды і 60-годдзя Саюза мастакоў БССР. Хоць экспанавалася тое, што мы і так добра ведаем па фотаздымках у мастацкіх, краязнаўчых выданнях і ў перыядычным друку, сабранае разам, яно выклікала здзіўленне не толькі ў гасцей з іншых рэспублік, але, здаецца, і ў саміх гаспадароў. Мы і раней ведалі, што ў пасляваенны час на Беларусі пабудавана нямала ўсялякіх помнікаў, мемарыяльных комплексаў і памятных знакаў —але каб столькі!.. Прычым, у эскізах, фрагментах у натуральную велічыню, на фотаздымках і слайдах была прадстаўлена толькі малая частка таго, што ёсць. Экспанавалася толькі тое, што зроблена на больш-менш прыстойным мастацкім узроўні і захоўваецца ў неблагім стане. Міжволі пачынаеш думаць пра тое, чаму насуперак законам дыялектыкі ў дадзеным выпадку колькасць не пераходзіць у якасць? Хопіць пальцаў адной рукі, каб пералічыць помнікі, якія ўспрымаюцца як нешта большае, чым памятны знак. Абеліск на мінскай плошчы Перамогі, «Хатынь», Курган Славы, помнік Я. Купалу ў Мінску — больш, здаецца, і няма. Між тым як помнікаў — тысячы.

У савецкім мастацтве ўвогуле, а ў манументальным, разлічаным на стагоддзі,—тым болей, заўжды на першым месцы была дзяржаўная ідэалогія, а ўжо потым — чалавек. І чалавек не сам па сабе, а як люстэрка «партыйнай» маралі і «класавых інтарэсаў. «Манументальная прапаганда» ў савецкай краіне напачатку мела мэтай увесці ў свядомасць людзей ідэю «сусветнай рэвалюцыі» замест расійскай праваслаўна-месіянскай ідэі, прыгаворанай бальшавікамі да знішчэння (натуральнае імкненне плагіятара — знішчыць ці схаваць далей ад чужых вачэй арыгінал). А потым, калі гэтая мэта была ў асноўным дасягнута, «манументальная прапаганда» звялася да апалагетыкі новага сацыяльнага ладу, да стварэння Сталініяны-Ленініяны і ўхвалення гераізму «чырвоных» у грамадзянскай вайне. Пасля 1945 года і XX з'езда адбылася ідэалагічная карэкціроўка: Ленініяна і Вялікая Айчынная вайна. Як нідзе ў іншых рэспубліках, гэта відаць на прыкладзе Беларусі. Нездарма Масква любіла ставіць нас у прыклад іншым ва ўсім, што датычыць сацыялізму, — зліццё моў, збліжэнне нацый, агульнасаюзныя інтарэсы, ідэйная загартаванасць...

Наш мастак звычайна пачынаў творчы шлях мемарыяльным знакам у памяць Вялікай Айчыннай, потым «дарастаў» да помніка правадыру. Многія беларускія скульптары за ўсё жыццё, акрамя «ленінаў» ды «воінаў-вызваліцеляў», увогуле нічога не ляпілі. Нешматлікія помнікі дзеячам беларускай культуры — Купалу, Буднаму, Багдановічу — як астраўкі ў моры савецкага афіцыёзу. Як выключэнне з правіла. Зыходзячы з папярэдняга вопыту, 1990 год можна лічыць суцэльным выключэннем. Праўда, па-ранейшаму выконваўся план па Леніініяне. У прыватнасці некалькі помнікаў правадыру пралетарыяту мяркуецца паставіць у мястэчках Чарнобыльскай зоны. Па-ранейшаму распрацоўваецца помнік «барацьбітам за Савецкую ўладу» для цэнтра Мінска. Незвычайнасць жа 1990 года ў іншым. Сёлета праводзіліся аж тры рэспубліканскія конкурсы на лепшае манументальнае вырашэнне тэм, нетрадыцыйных для нашага мастацтва. Прайшоў першы тур конкурсу на помнік ахвярам сталінскага генацыду ў Курапатах, два туры конкурсу на помнік загінуўшым у Афганістане, тры туры Скарынаўскага конкурсу. А на заканчэнні года абвешчана творчае спаборніцтва па ўвасабленні ў манументальных формах памяці шасці дзеячаў беларускай гісторыі і культуры дакастрычніцкага перыяду. Іх плануецца адкрыць на працягу трох бліжэйшых гадоў. Трэба прыняць да ўвагі, што за апошнія дваццаць гадоў такіх помнікаў паўстала чатыры-пяць, дык велізарны фронт работы, нечакана разгорнуты перад мастакамі, выклікаў у многіх з іх пачуццё роспачы. Выявілася непадрыхтаванасць беларускіх творцаў да сапраўднай работы, няздольнасць, прынамсі, многіх з іх выйсці за межы ваенна-рэвалюцыйных стэрэатыпаў.

Гэтая закамплексаванасць у найбольшай ступені выявілася ў праектах мемарыяла воінам-«афганцам», помніка ў Курапатах. Толькі ў дачыненні да Скарынаўскага конкурсу можна гаварыць аб станоўчых выніках. Па меншай меры тры з прапанаваных на конкурс праектаў могуць пры далейшай распрацоўцы стаць помнікам, вартым Першадрукара. Але ж мы, дзякуй Богу, маем і пэўны вопыт у скульптурнай Скарыніяне. Хоць прыгадаць вядомую скульптуру А. Глебава, зробленую яшчэ ў 1954 годзе.

Што ж датычыць «афганскай» тэмы, тут аўтары прадстаўленых на конкурс праектаў пайшлі найбольш простым (і найменш плённым) шляхам. Яны рабілі проста «ваенны» помнік, беручы за аснову існуючыя мемарыялы загінуўшым у Вялікую Айчынную. Менавіта гэтага чакалі ад іх арганізатары конкурсу (найперш ЦК ЛКСМБ). Ім патрэбны помнік у славу савецкай зброі, мемарыял, які павінен сцвярджаць, што нашы ахвяры ў імя «сацыялістычнага выбару і камуністычнай перспектывы» афганскага народа былі не марнымі. Самі ж «афганцы», калі меркаваць па кнізе водгукаў на выставе праектаў, бачаць помнік як сімвал пакаяння савецкай дзяржавы перад сваімі грамадзянамі, якія сваім жыццём заплацілі за яе ваенна-палітычную авантуру.

Праект помніка «афганцам», які на другім туры конкурсу адзначаны як лепшы, — гэта варыяцыя на тэму валгаградскага Мамаева кургана, дакладней, аднаго з фрагментаў мемарыяльнага комплексу — «сцяны-руіны», з якой выступаюць на гледача «людзі-камяні». Пасля Мамаева кургана, дзе гэта было адносна арыгінальнай знаходкай, вобраз «сцяны-руіны» неаднойчы ўключаўся ў многія вайсковыя мемарыялы. Зараз такое плануецца для Мінска. На невялікім астраўку на Свіслачы каля Траецкага прадмесця, дзе стаіць закладны камень «афганскага» помніка, аўтары створаць бетонныя «афганскія» горы з груба высечанымі «ў гарах» фігурамі савецкіх салдат. Прамая паралель афганскай вайны з Вялікай Айчыннай. Апалагетыка замест пакаяння...

Колькі слоў наконт месца для помніка. Першы варыянт, калі памятаеце, прадугледжваў пабудову помніка ў мікрараёне Чыжоўка. Пад час абмеркавання праектаў першага туру стала зразумелым, што «афганцы» хацелі б паставіць помнік ці на плошчы Леніна, ці ў якім іншым месцы, але абавязкова на Ленінскім праспекце. Аргументацыя была прыблізна такой: «Хай урад, які нас на гэтую вайну паслаў, увесь час мае помнік перад вачыма...» Тады без усялякага абмеркавання быў пастаўлены камень каля Траецкага прадмесця і такім чынам было закрыта пытанне аб месцы для помніка.

Але ці варта ставіць такі помнік побач з гандлёва-рэстаранным кварталам? Уяўляеце, што будзе там рабіцца штогод у Дзень паветрана-дэсантных войск, які «афганцы» адзначаюць як сваё «канфесійнае» свята?

Мемарыял у Курапатах. Ніводны з прадстаўленых на конкурс праектаў не можа быць прапанаваны да рэалізацыі. Такое меркаванне журы. Аднак журы спадзяецца, што на другім туры будзе знойдзена мастацкае вырашэнне помніка. І, глядзіш, недзе ў канцы будучага года будзе ў Курапатах мемарыял.

Складваецца даволі дзіўная сітуацыя. Увесь пасляваенны час пра Курапаты маўчалі. Нават калі ў 1988 годзе выйшаў у «ЛіМе» артыкул З. Пазняка і Я. Шмыгалёва «Курапаты — дарога смерці», прадстаўнікі ўлады ставілі пад сумненне факты, прыведзеныя ў артыкуле. Нават на тым першым несанкцыянаваным мітынгу ў Курапатах 3 ліпеня 1988 года людзі ад апарату надрывалі горла: «Усё мана! Тут пахаваны расстраляныя пасля вайны паліцаі» (другі тут жа сцвярджаў, што не паліцаі, а нямецкія афіцэры), але не бязвінныя ахвяры сталіншчыны. Усё ж пад націскам грамадскасці даецца згода на раскопкі ў Курапатах. І калі раскопкі і паказанні сведкаў яшчэ раз пацвярджаюць праўду Пазняка, робіцца ўсё, каб аспрэчыць прыведзеныя ім лічбы ахвяр. І толькі калі стала зразумела, што Курапаты ў вачах людзей ужо сталі нацыянальнай святыняй, і тут нічога ўжо нельга змяніць, тэрмінова ставіцца ад імя ўрада БССР закладны камень у Курапатах і прымаецца пастанова аб конкурсе на праект мемарыяла ахвярам рэпрэсій 30-х гадоў.

Вось такая перадгісторыя конкурсу. Думаю, уся гэта спешка трэба для таго, каб «перахапіць ініцыятыву», каб паставіць у Курапатах «свой» помнік з сярпом-молатам і чырвонай зоркай, дзе Вечны агонь запаліць першы сакратар ЦК КПБ.

Магу паўтарыць толькі тое, што ўжо пісаў у «ЛіМе» з нагоды конкурсу. Ідэя павінна саспець. А пакуль будзе дастаткова заканадаўча зацвердзіць за Курапатамі статус могілак, каб там не бадзяліся ўсялякія валацугі, не палілі вогнішчы, не раскопвалі магілы. Распрацоўваючы будучы мемарыял, трэба памятаць, што помнік у Курапатах ужо ёсць. Самі Курапаты — помнік... Не паўтарыць даўнюю, можна сказаць, класічную памылку, калі гістарычнае аблічча руінаў Брэсцкай крэпасці было знішчана пабудовай мемарыяла.

І яшчэ. На месцы пакутніцтва, на могілках па звычаях нашага народа заўжды ставіцца Крыж і Храм. Крыж пакут паўстаў у Курапатах і быў асвечаны летась. Ці будзе ў Курапатах Храм?

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

Анатоль КУДРАВЕЦ

СМЕРЦЬ НАЦЫЯНАЛІСТА

АПАВЯДАННЕ

Памяці майго земляка В. ГАНЧАРОНКА

ДЗВЕРЫ покоя расчыніліся разам з нецярплівым стукам у глухую дашчаную філёнку. Звычайна так смела заяўляюць аб сабе толькі свае. І праўда, на парозе стаяў Ён — жывы і светлы, як чаканая ява ці прыемны сон. Сухія шчэлепы абсыпаны рудой шчацінай, вялікія жоўтыя зубы скаляцца шчаслівай усмешкай: «А ўжо-ткі я цябе ўпільнаваў...»

Расхрыстаны салдацкі шынель без пагонаў, кірзавыя боты з пісягамі старой засохлай гразі. Апошняе я заўважыў пазней, ды і якое гэта магло мець значэнне.

Мы абняліся як родныя браты. І праз калянае сукно шыняля я неяк балюча адчуў худую касцістасць яго пруткага цела.

Мы не бачыліся гадоў пяць, калі не болей, але цяпер у мяне было так небагата часу і для радасці, хоць я і быў бясконца рады яму, і для роспытаў. Я запазняўся на лекцыі, а трэба было яшчэ забегчы перакусіць, і таму я спытаў яго без лішняй дыпламатыі:

— Ты снедаў?

— Не.

— Тады пайшлі.

— Пайшлі.

Закусачная, яна ж студэнцкая забягалаўка, была ў суседнім доме, і па дарозе туды мы паспелі перакінуцца колькімі пытаннямі, адказ на адно з якіх мяне сур'ёзна азадачыў.

— Адкуль ты зваліўся? — спытаў я.

— З Пячэрска.

— Магілёўскага?

— Ну.

Адказваў ён весела, з паспешлівай, наіўна-дзіцячай гатоўнасцю, нібы даўно чакаў гэтых пытанняў і даўно гатовы быў на іх адказаць.

Ён заўсёды любіў жартаваць, але тут я зразумеў, што ён не жартуе.

Пячэрск — вядомы сумнай славай гарадок для псіхічна нездаровых, а папросту, «ненармальных» людзей. Туды, як і ў кожны дурдом, трапіць было нашмат лягчэй, чым выграбціся адтуль. А тым болей выграбціся і раскатваць па свеце, быццам нічога не было... Яшчэ некалькі гарадкоў з гэтакай жа назвай раскідана па краіне, але магілёўскі ёсць магілёўскі.

І, мусіць, таму мне адразу ж успомніўся другі чалавек, Іван Сіняўскі — высокі, бяскроўна-белы юнак, што хадзіў па сёлах нашага раёна на самым пачатку вайны. Людзі казалі, што яго разам з іншымі хворымі выпусцілі з таго самага Пячэрска, калі да Магілёва сталі набліжацца немцы. Акуратна, па-гарадскому апрануты, ён заходзіў у чужую хату, як у сваю, і садзіўся за стол на покуце. Тым самым паказваў, што хоча есці. А чаго можна даць галоднаму чалавеку ў сяле? Перш за ўсё хлеба і малака.

Іван умудраўся есці так, што заўсёды нешта заставалася — ці хлеб, ці малако. Заставаўся хлеб — жаласлівая гаспадыня далівала малако, заставалася малако — адкройвала хлеба. І так да той пары, пакуль Іван не наядаўся.

Дзе б ні ішоў, што б ні рабіў, нават у хаце, за сталом, Іван мармытаў адны і тыя ж словы: «Над Масквой вялікай, златаглавай...»

Прамармытаўшы гэтыя словы, ён раптам замаўкаў, нібы слухаючы самога сябе, сіліўся ўспомніць далей, незадаволена матаў галавой: «Не, не так!» — і пачынаў зноў: «Над Масквой вялікай златаглавай... Не, не так...»

Гэта была як песня яго, як малітва, працяг якой ён не мог успомніць. Адчувалася, што яму было вельмі важна ўспомніць, што там далей, за першымі словамі, але хворая памяць не давала яму гэтага. Здавалася, яшчэ трошкі, яшчэ адно намаганне — і ён успомніць тыя забытыя неабходныя словы. Тады ён перастане быць тым Іванам, на якога з такой жальбой пазіраюць вясковыя бабы, тады светла-блакітныя вочы яго не будуць перасковаць з аднаго на другое, не маючы сілы ні на чым зачапіцца, а засвецяцца жывым асэнсаваным аганьком. Але...

Ён нядоўга і пахадзіў з гэтай сваёй малітвай. Недзе на пачатку зімы яго знайшлі забітага ля дарогі. Зрабілі гэта ці немцы, ці партызаны. Маглі і адны, і другія: і тыя, і другія не любілі лішніх вачэй, а Іван заўсёды ішоў туды, дзе былі людзі, і заўсёды са сваімі словамі: «Над Масквой вялікай, златаглавай... Не, не так...»

Дык вось, Пячэрск...

Мінск быў у пары ранняй восені, на вуліцы асядаў блакітны туман. Машыны далікатна, нібы шануючы людскія нервы, шамацелі шынамі па потным асфальце.

У закусачнай я пакінуў яго ля высокага з мармуровай крошкі століка, а сам узяў для абодвух традыцыйныя студэнцкія цефцелі, каву з малаком, па булцы з макам. Цефцелі тут умелі гатаваць смачныя, з добра вытаўчанай бульбянай кашай, не скупіліся на падліву.

Еў ён прагна, глытаючы, як качка, няжованае. Відно было, што добра прагаладаўся. Я спытаў, ці не ўзяць яшчэ порцыю. «Вазьмі»,—адказаў ён усё гэтак жа весела. Вірлаватыя бычыныя вочы яго свяціліся ўсё тым жа адкрытым шчырым бляскам.

Калі ён вымазваў хлебам падліву з другой талеркі, я спытаў у яго зноў:

— Дык праўда, адкуль ты зваліўся?

— З Пячэрска.

— Ты мне гаворыш гэта ўжо другі раз.

— Магу сказаць і трэці...— Цяпер позірк яго быў хутчэй сумны, чым вясёлы. Але зноў шырокі, як напродаж выскал вялікіх зубоў.

Жарты жартамі, але Пячэрск... Чаму Пячэрск?.. Я не стаў болей церабіць яго пытаннямі, настане час — усё праясніцца.

Выйшлі з закусачнай. Ён падахвоціўся правесці мяне да універсітэцкага гарадка.

— Калі ты прыехаў?

— Учора ўвечары.

— Дзе атабарыўся?

— У цябе! Гы-гы-гы!

— А начаваў дзе?

— На вакзале.

Як памятаю яго, з ім ніколі не было сумна. Гэта быў той Віктар, якога я ведаў і пяць, і дзесяць гадоў назад. Яго жарты мала разыходзіліся з праўдай, а праўда — з жартамі, хаця і там, і там вясёлага было мала. Ён прымаў жыццё такім, якім яно было, і тым самым вучыў іншых рабіць тое ж.

— Якія твае дадейшыя планы? — зноў спытаў я.

— На сёння?..

— Ну, хаця б на сёння...

— Пахаджу па Мінску... Ведаеш, два гады не бачыў яго і, прызнаюся, засумаваў. Пасля трэба зайсці ў міністэрства. Яны хочуць перавесці школу на рускую мову, а заадно вытурыць і мяне адтуль. Трэба бараніцца.

— Хто гэта «яны»?

Віктар часта не дагаворваў да канца, беручы, што чалавек ведае ці павінен ведаць, пра што талкуюць.

— Раённыя начальнічкі разам з дырэктарам.— Ён зморшчыўся, быццам яму раптам забалеў зуб: — Вось жа беларусы кругом, і дзеці беларускія, а «даёш Расею» — гы-гы-гы. Пасля загляну ў кнігарню, у тэатральныя касы: можа, пашэнціць узяць білеты куды. Ты ж не адмовішся пайсці са мной?

— Калі будзе куды... Па-мойму, дык і оперны, і купалаўцы яшчэ на выездзе.

— Пабачым.

Пабачым, дык пабачым?

— Трэба зайсці ў інстытут, можа, сустрэну свайго выкладчыка, ён мне вінен грошы. Цікавы чалавек, варта было б цябе звесці з ім. Некалі я здаваў яму гісторыю партыі, пяць разоў здаваў, на тым і падружыліся.— Віктар замоўк, нечаму ўсміхнуўся.— Ведаеш, надта рыхтавацца не было калі — дзве ночы запар разгружалі вагоны з дрыўмі, а калі папраўдзе, то і рыхтавацца не было вялікай ахвоты. Словам, я паспеў прагледзець два білеты і пайшоў. А раптам патрафіць. Шчасце — птушка выпадковая. Не патрафіла, узяў не той білет. Пацягнуў другі раз — зноў не тое. Пытаюся, ці можна паспрабаваць трэці раз. Адказвае: «Можна, толькі адзнака будзе зніжана на два балы». Пазірае на мяне і пасміхаецца: ці сам злодзей, ці злодзея ўгледзеў. Не пашанцавала і на гэты раз. Да заўтрага я прачытаў яшчэ два білеты, павысіў шанцы ўдвая. Прыходжу. Цягну раз — няўдача, другі — тое самае, тое ж і трэцім разам. Прымае ён. Смяецца: «Колькі білетаў прачытаў?» — «Чатыры».— «Прачытаеш усе — прыходзь. Прыму — хоць у інстытуце, хоць дома. А ў ведамасць пакуль што нічога ставіць не буду». Даў тэлефон свой хатні. Прымусіў прачытаць і падручнік, і шмат што іншае. На тым і падружыліся. Пасля і я ў яго грошы браў, і ён у мяне. Але апошні вінаваты ён — пазычыў трыста рублёў. Каб пашанцавала знайсці яго — мы былі б самымі багатымі людзьмі ў Мінску.

Мы стаялі на асфальтавай дарожцы. Спяшаючыся, паўз нас прабягалі студэнты, салідна праходзілі выкладчыкі, узмахваючы важкімі партфелямі, абмацвалі нас цікаўнымі позіркамі. Віноўнікам тых цікаўных позіркаў быў Віктар — няголены, нявыспаны, у расхрыстаным салдацкім шынялі, у нячышчаных ботах. Усім сваім выглядам ён нібы хацеў сказаць: «Вы тут гарадскія, чысценькія, а мы ў сяле такія... Не падабаецца?..»

Дзівак-чалавек, каго гэта абыходзіць? Такія дык такія... Яшчэ раз акінуўшы Віктара ўважлівым позіркам, я спытаў:

— І ты такі хочаш ісці ў міністэрства і ў інстытут?

— А што?

Ён быў флегматык. Заўсёдны флегматык.

— Нічога. Зробім так: ты ідзеш да мяне ў інтэрнат, паспіш, паголішся. Паглядзі ў шафе: там вісяць штаны, стаяць чаравікі. Прымерай. Нешта павінна падысці. Можаш не спяшацца: пакуль хлопцы на вайсковых зборах, я раскашую адзін. Абавязкова зрабі ўсё гэта і толькі пасля выходзь у горад. Вяртаешся ты першы — чакаеш мяне, вяртаюся першы я — чакаю цябе. Згода?

— Згода, толькі калі без сну: я гадзіны тры пакімарыў на вакзале. Не ведаю толькі, чым я «такі» нялюбы табе? Штаны на мне новыя, і боты новыя, нават абцасы не пазразаліся, у сяле толькі ў іх і ходзяць. Але калі табе так хочацца...

— Хочацца,— сказаў я.— Якія-небудзь грошы ёсць. Ці даць?

— На тэатр хопіць. Ды я ж казаў: мне вінаваты...

На тым пагадзіліся і разышліся кожны ў свой бок.

Віктар быў мой зямляк. Між яго і маёй вёскамі ляжала шэсць кіламетраў дарогі, але пазнаёміліся мы не дома, а ў горадзе, у педвучылішчы, куды я паступіў пасля сямі класаў. Мінуў першы месяц вучобы, я паспеў трохі абчасацца, трохі прывык сам думаць аб сабе, як раптам на адным перапынку ў аўдыторыю заходзіць сухашчавы рудаваты хлапец і густым, у нос голасам пытаецца:

— Хто тут Патупчык?

— Я Патупчык.

— Тады выйдзем у калідор.

— Выйшлі.

— Ты са Слабодкі?

— Са Слабодкі.

— А я з Селішча. Чуў пра такое? — Усміхаецца.

— Дзіва што чуў!

Кожны раз ідучы на чыгунку ці адтуль, я глядзеў на гэту невялікую, у адну вуліцу, вёсачку, што ляжала ў нізінцы ў нейкім кіламетры ад шляху. Звярнуць з дарогі і прайсці па Селішчы не давялося, хоць думка такая неаднойчы церабіла і ахвота была. Вунь яны, як у шапцы, хаты, хлявы, прысады, сабакі гаўкаюць — пачулі чужы дух.

— Дык будзем знаёмы,— сказаў зямляк і працягнуў вузкую, з чэпкімі пальцамі руку: — Віктар Мацюшонак. Калі што, шукай мяне ці тут, на лекцыях, ці на Вечаркевіча. Лепей на Вечаркевіча, бо на лекцыях я магу быць, магу і не быць.

«На Вечаркевіча» — гэта ў інтэрнаце педвучылішча, недзе на ўскраіне горада.

Дасюль я лічыў, што ў педвучылішчы я адзін з нашага балотнага клічаўскага боку, ажно ёсць яшчэ адна душа. Як вольна і смела ён дзержыцца! І гэты грубы голас, гаворыць — быццам у сябе на вуліцы.

Ён быў ужо на чацвёртым курсе. Трохі пазней ён расказаў, што пасля дзесяцігодкі паступаў у Мінск на філасофа — не прабіўся. «Мордай не выйшаў — чылых не прызнаюць». Каб не з'ядаць час, перакінуўся сюды, у педвучылішча. Узялі без экзаменаў і адразу на трэці курс.

— А хіба можна так?

— Узялі — значыць, можна.

Гэтак мы пазнаёміліся, гэтак сталі бачыцца. Хаця што такое «бачыцца»? Было, сустракаліся кожны дзень і па колькі разоў на дзень: калідоры адны, два паверхі. Было і іншае, як выпадала. Шукаць яго спецыяльна прычыны не выспела, але па тым, што не чутно было яго конскага рогату і некалькі дзён, і цэлыя тыдні, я здагадваўся, што яго не было ў педвучылішчы.

Неяк пасля ў студэнцкай насценгазеце я прачытаў яго верш. Было прыемна, што аўтар — мой добры знаёмы, нават болей—мой зямляк. У гэтым факце быў яшчэ адзін далікатны момант: ці то рэўнасць, ці суперажыванне. Справа ў тым, што я і сам спрабаваў пісаць вершы. Але выставіцца вось так смела на людзі не адважваўся. А калі прачытаў яго верш, смеласці маёй яшчэ паменела.

Верш быў, як цяпер сказалі б, «дзяжурны», да свята, на ўсю першую калонку зверху да нізу. Загаловак выведзены ярка-чырвоным алоўкам: «Великому Октябрю». То быў цэлы трактат з выхадамі ў філасофію, у далёкую і бліжэйшую гісторыю. Прысутнічалі ў вершы дзекабрысты і Пушкін, Маркс і Ленін, «Аўрора» і сцяг над рэйхстагам. Усё прадумана, выстраена ў адную лінію, лагічным вынікам якой мроіўся камунізм, які будзе пабудаваны калі не заўтра, то ўжо абавязкова паслязаўтра.

Усё ў вершы, як мне здавалася, было да месца, усё складна і прыгожа. Аўтар хадзіў па гісторыі, як па сваім садзе. І была там адна дэталь, на якой я спаткнуўся. У шэрагу слаўных імянітых асоб быў і беларус Каліноўскі. Як ён сюды трапіў? Ён нібы не вытрымліваў маштабнага параўнання з усімі, хто праходзіў у вершы. Мужычы заступнік, тутэйшы. Ваяваў з царом, з Мураўёвым, тыя і павесілі яго. Ён нібы быў чужы ў гэтай лініі. У вершы была такая фраза: «...коса Каліновского дремлет в застрешье». Што значыць гэта «дремлет»?..

З гэтымі сумненнямі я і падышоў да земляка, калі ён з хлопцамі курыў у заваротку калідора. Ён выслухаў мяне, усміхнуўся: было відаць, што пытанне яму і спадабалася, і нечым не спадабалася. Сказаў, як адсек: «Бач ты, яму Каліноўскі не спадабаўся. Трэба вучыць гісторыю. Настаўніку гэта ведаць не лішне, гы-гы-гы!»

Ён канчаў чацвёрты курс, а я першы. Гісторыю мы яшчэ будзем праходзіць. Калі мы засталіся ўдвух, я спытаў яго і пра другое:

— Чаму ты напісаў верш па-руску? Баяўся, што па-беларуску ніхто не зразумее?

І гаварылі мы ў педвучылішчы ўсе так, як гаварылі дома ў вёсцы, і насценгазета выходзіла па-беларуску.

Ён пільна паглядзеў на мяне, пасля зарагатаў:

— Надта любіш ты задаваць пытанні. Вось каб яшчэ навучыўся адказваць на іх.

Што праўда, то праўда: задаваць пытанні лягчэй, чым адказваць на іх. Але ж пытанні былі. І ён пакінуў мяне з імі.

Ён знікаў то на тыдзень, то на два, а то і на цэлы месяц. Не ведаю, як яму гэта ўдавалася, але ён заўсёды хадзіў у выдатніках, нават атрымліваў павышаную стыпендыю.

Неяк вясной пад канец заняткаў ён зноў расчыніў

дзверы ў нашу аўдыторыю, матнуў мне галавой. Я выйшаў.

— Хочаш, пачастую півам...

— Пачастуй.

Цераз вуліцу, насупраць педвучылішча стаяў дашчаны павільён—ні то маленькая сталоўка, ні то вялікі ларок. Сюды і прывёў ён мяне. Селі за квадратны, накрыты белай цыратай столік, Віктар узяў два кубкі піва. Пілі, здзьмухваючы пену, паціху прывыкаючы да гаркаватага смаку яго, бо ні Віктар, ні я піткамі не былі. Прычына нашага балю адкрылася проста: Віктар выйграў на аблігацыю трыццаць рублёў. Купіў кішэнны гадзіннік — круглае нікелявае дзіва на ланцужку, засталося яшчэ і на замочку. Віктар аж свіціцца ад нейкай унутранай узбуджанасці, пазірае на свет вясёлымі вірлаватымі вачыма. Такое з ім бывала рэдка. Ён болей выдаваў чалавекам маўклівым і засяроджаным, і толькі тыя, хто быў блізка знаёмы з ім, ведалі, што гэта не зусім так. На ім новы ў дробную клетачку светла-шэры касцюм з накладнымі кішэнямі. Касцюм сядзіць, як уліты, і робіць яго сухашчавую постаць аскетычна-строгай і непадступнай.

Я ведаў, што ў яго раман з аднакурсніцай, дачкой аднаго з міліцэйскіх начальнікаў горада,— хуткай, стройнай дзяўчынай з русымі косамі на высока ўскінутай галаве. Дзяўчына не для кожнага, але такога хлопца, як Віктар, можна кахаць. Мне здавалася, што сам Віктар ставіўся да яе калі не прахладна, то спакойна, і гэта яшчэ болей узвышала яго ў маіх вачах. Толькі так і павінен трымацца сапраўдны мужчына!

— Я нядаўна бачыў цябе з Нінай,— сказаў я.

— Дзе? — Вочы ўсё тыя ж глыбокія, рудыя, паспрабуй разбярыся — смяюцца яны ці сур'ёзныя.

— Ля Дома культуры.

— А-а-а... Ну і што?

— Прыгожая. І лёгкая, як пліска. Здаецца: дзьмухні — і паляціць...

Віктар далікатным позіркам паглядзеў на мяне, усміхнуўся:

— А ты паэт... «Дзьмухні — і паляціць...» Далёка не паляціць.— І дадаў: — Прыгожая — гэта праўда. А што далей...

— Як «што далей»?

— А так. Яны надта шмат думаюць пра сябе і лічаць, што ўсе павінны думаць толькі пра іх. А гэта немагчыма, і жыццё не на адных бабах стаіць. Ды і шэрпенне трэба, і яшчэ шмат што. Мама кажа пра[illegible] з прыгожай морды ваду не піць, трэба і да калодзежа збегаць.

— Ты сказаў «яны». Гэта што — усе дзяўчаты, усе бабы?

— Не, гэта метафара, гы-гы-гы. Ведаеш, што гэта такое?

— Гэта імя такое. Як Марфа ці Матруна,— пажартаваў я.— Ёсць у нас такія: адна гарбатая, другая касавокая.

Пра метафару я ведаў: я ж сам складаў вершы. А вось пра «бабаў»... Гэта ад мяне было аддзелена таемнай сцяной, і, вядома, нічога путнага параіць яму я не мог. Ды, відаць, Віктару гэта і не трэба было, бо ён неяк неўпрыкмет перакінуўся на іншае:

— Вы геаграфію прайшлі ўжо?

— Праходзім.

— Мáлыш чытае?

— Ага. Ведаеш, такі дзіўны дзед. «Устаў я неяк ранічкай, яшчэ да сонейка. Выйшаў па расе на бераг Біскайскага заліва. Салаўі аж надрываюцца, шпакі трэлі выводзяць. Сеў я пад бярозай і думаю: «Божа, усё тут добра, цёплае мора, высокае неба, прыгожыя пальмы, але дапамажы мне дабрацца да маёй роднай Беларусі!» — Сваім пераказам я спрабаваў падрабіць сіпаваты голас і расцяжную інтанацыю выкладчыка геаграфіі.— Дзе той Біскайскі заліў, дзе тыя пальмы. Гаворыць так, што можна падумаць, быццам ён і папраўдзе быў там, сядзеў пад бярозай і гэтак думаў...

— Дзіўны... Не проста дзіўны.— Віктар нацэленым вокам зірнуў на мяне, неяк адразу пасуровеў, скура на вострых сківіцах напялася, як на бубне.— А ты ведаеш, што ён ваяваў у нарвежскім супраціўленні? Уцёк з нямецкага палону і ваяваў. А пасля Перамогі даваёўваў ужо ў Сібіры. А ведаеш, што ён напісаў падручнік па гісторыі Беларусі. Дафеадальны перыяд, Полацкае, Слуцкае княствы, Вялікае княства Літоўскае... Напісаў, завёз у Мінск, а там нейкі прафесар даў такую рэцэнзію... Мáлыш і буржуазны нацыяналіст, і невук, і старажытнай гісторыі не ведае, і ў марксісцкай метадалогіі не разбіраецца... Словам, бяры за крылле — і туды, адкуль ён толькі што вярнуўся. Вось, можа, таму ён і сядзіць пад бярозай на беразе Біская...

Ні пра Нарвегію, ні пра падручнік я нічога не ведаў, але ўпарта паўтарыў:

— Усё роўна: бярозы там не растуць.

— Ну і хай не растуць. Галоўнае не гэта. Галоўнае, пра што ў чалавека душа баліць.

— А пра што яго душа баліць?

— Пра што?.. Пра такіх, як ты, дурняў. Гы-гы-гы!

Я не пакрыўдзіўся ні за гэты смех, ні за «дурня».

Шмат незразумелага мне было ў паводзінах майго земляка, шмат пра што хацелася распытаць у яго, але ён умеў трымацца на адлегласці, і пытанні мае адпадалі самі сабой. Але чым радзей мы бачыліся, тым болей мяне цягнула да яго. Ён быў магніт, я — маленькі цвічок, і патрэбен быў час, які б растасаваў усё па парадку. А часу заставалася мала, чацвёрты курс здаваў дзяржаўныя экзамены. Здаў экзамены і Віктар, атрымаў размеркаванне, а куды — я даведаўся толькі праз два гады.

...Мая родная Слабодка, спякотнае летняе сонца, нядзеля. З раніцы я пахадзіў з касой, добра намахаўся і прыемна расслаблены ляжу з кнігай на канапе ў хатняй прахалодзе. Нехта грукае ў сенцах, расчыняюцца дзверы — і ў праёме іх Віктар, а за ім Коля Буракоўскі — невысокі, светлавалосы хлапец. Ён таксама з Селішча, студэнт, будучы медык.

— Баяўся ісці адзін, дык узяў абарону,— смяецца Віктар, расперазаўшы зубы на ўвесь рот. «Абарона» сціпла маўчыць, адданымі мяккімі вачыма сграваючы свайго падабароннага.

Сядзелі за сталом, выпілі самагонкі, закусваючы салам і зялёным цыбуллім пер'ем. Гаварылі, перабіваючы адзін аднаго, нібы стараліся запоўніць пустату часу паміж апошняй і гэтай сустрэчамі.

Віктар прынёс, можа, з дзесятак сваіх вершаў і накід тлумачальнага слоўніка клічаўскай гаворкі. Гэта былі словы, якія рэдка сустракаліся ў літаратуры, а шмат якіх нідзе, акрамя як на Клічаўшчыне, мне чуць не даводзілася. «Вякнуў, вымерхаўся, карнавухі, посік, пэлька, суравое, сіціцца, чылы...» Канечне, для слоўніка іх было занадта мала, ды і наогул, выпусціць слоўнік, сабраны нейкім настаўнікам, мне здавалася, проста немагчыма. Я сказаў пра гэта Віктару, і ён надзіва лёгка пагадзіўся са мной. Відаць, сам разумеў гэта.

З вершамі было яшчэ цяжэй. Не толькі таму, што яны былі нейкія занадта простыя. Нібы падражанне ранняму Кандрату Крапіве. Яны расказвалі пра тое непрыгожае жыццё, якім жыла вёска. Расказвалі ні то жартам, ні то ўсур'ёз. Пра цётку Хрысціну, якая гоніць і прадае самагонку, каб заплаціць падатак. Пра школьнікаў, што ідуць босымі нагамі па бруку райцэнтра, каб купіць падручнікі, і не знаходзяць іх. Пра цётку Грыпіну, якую на вачах у людзей набіў старшыня, і ніхто за яе не заступіўся. Усё гэта была праўда, голая праўда, во яна кругом, куды ні паглядзі. Але... Мне здавалася, што ў вершах трэба пісаць пра нешта іншае — прыгожае, узнёслае. Як у Багдановіча: «Мне доўгае расстанне з вамі чарней ад вашых чорных кос...»

Было ў Віктаравых вершах такое, што адкідвала мае літаратурныя эмоцыі ўбок. Ва ўсіх вясковых бедах ён бачыў канкрэтных вінаватых. Імі былі камуністы і рускія.

— Пры чым тут адны і другія? — гарачыўся я.— Дрэнна жывём, бо такое жыццё. Была вайна, усё разбіта, развалена. А цяпер — глядзі...

— Што «глядзі»? На што «глядзі»?

— Хлеб ёсць. Во, бачыш, сала...

— Наеліся, аж з глоткі тырчыць.

— Не тырчыць, але жыць можна.

— А ты ведаеш, як трэба жыць? Як жывуць людзі?

— А як яны жывуць?

— Як? Па-людску. Разумееш, па-людску. Чалавек не павінен думаць, дзе ўзяць кавалак хлеба, каб не памерці з голаду. Гэта тое ж, як калі б ён думаў, дзе ўзяць паветра, каб дыхаць. Чалавек павінен думаць пра жыццё, якое яно прыгожае, якім яно павінна быць.

— Адкуль ты ведаеш, якім яно павінна быць?

— Ведаю.

То была праўда: ён ведаў шмат такога, думаць пра што я і не здагадваўся. Ён выкладаў нямецкую мову і беларускую літаратуру ў сярэдняй школе пад Бабруйскам, вучыўся на завочным аддзяленні інстытута замежных моваў. Не толькі дзяржаў у руках, а і чытаў нямецкія, англійскія, французскія газеты. Збіраў матэрыял для тлумачальнага слоўніка... Пісаў вершы, надрукаваць якія не адважыцца ніякі рэдактар. І пра гэта я сказаў шчыра, як мог. Але каб хоць неяк змякчыць момант, параіў паслаць вершы ў якую-небудзь газету. А раптам?..

— Нічога «раптам» не бывае. Я пасылаў ужо,— быў яго адказ.

— Ну і што?

— Вярнулі. Напісалі, што слаба. Што трэба чытаць Пушкіна і Лермантава, Купалу і Багдановіча. Вось і ты кажаш: «Мне доўгае расстанне з вамі...» Вучыцца ў класікаў... А як у іх вучыцца, калі іх даўно няма? Калі б яны жылі цяпер, то, можа, напісалі б такое... Яшчэ мудрэй, чым я, га? Га-га! Га-га-га! — Віктар быў Віктар: спачатку смех, а пасля... Пасля: што будзе, тое будзе.

— Дык навошта ты мне паказваеш?

— Можа, табе лягуць на душу?

— Дык я ж усё роўна не надрукую.

— А няхай. Галоўнае, каб ляглі.

Мне яны не «ляглі», хаця шмат што ў іх падабалася. Гэтая раскаванасць думкі, праўда да канца, без аглядкі. І словы, якімі гаварылі мужыкі ля крамы, збіўшыся ўкруга бочкі з півам, былі нашы словы. Але ўва мне сядзела яшчэ адна праўда — газетная. Там усё было і прыгажэй, і далікатней, і мякчэй. Дзве праўды ў адной душы. Верх узяла апошняя. Але Віктара і гэта не бянтэжыла. Ён адступіўся ад сваіх вершаў, быццам яны былі не яго. Пагаварылі — і добра. Можна гаварыць пра што іншае.

І мы гаварылі, радуючыся рэдкай магчымасці, што давала сустрэча. Гаварылі болей мы з Віктарам. Коля Буракоўскі слухаў, ласкава ўсміхаючыся сваімі карымі атласнымі вачыма.

Мы прайшлі па нашым пасёлку, паўз кузню, паўз былы панскі двор, ад абсады якога ўцалела ўсяго некалькі таўстых кашлатых ліпаў, а ад будынкаў — дзве канюшні і кладоўка. Па сухім ламаччы адолелі грэблю, прайшлі па пасёлку, што ляжаў за канавай, пад самым лесам. Ён і называўся Чырвоны Лес. Магчыма, гэту назву даў колер сасновай кары, якая гуляла чырвонымі фарбамі на ўсходзе і заходзе сонца, а можа, назвай стаўся ўсё той жа модны колер рэвалюцыйнага аптымізму. Пасёлак быў даўгі і ціхі, тут чамусьці нават сабак не дзяржалі, і мы прайшлі па вуліцы, зацененай яблынямі і ліпамі, несучы ў сабе спакой і лагоду сустрэчы, і яшчэ нешта большае, што нябачнымі ніткамі трымала нас разам.

Я правёў хлопцаў да суседняга сяла. Па дарозе выявілася, што там намячалася вяселле і, там у маўклівага Колі Буракоўскага была дзяўчына.

Вярнуўся я дамоў і на стале ўбачыў абодва Віктаравы сшыткі — з вершамі і з матэрыяламі для слоўніка. Ці то ён забыўся іх, ці пакінуў наўмысля. Так яны і засталіся ў мяне.

Сшытачак з вершамі недзе ўскорасці загубіўся, а матэрыялы для слоўніка я перадаў невысокенькай чарнавалосай рухавай жанчынцы, яна чытала ў нас лекцыі — вядомаму ў рэспубліцы спецыялісту па беларускай мове.

Здарылася гэта шмат пазней, але і сёння я шкадую, што зрабіў гэта, хоць было ў тым Віктарава жаданне. «Калі не зможаш скласці слоўнік сам — перадай у інстытут мовы, можа, хто іншы складзе». Ні ў адным з тлумачальных слоўнікаў, што выходзілі ў нас пасля, тых рэдкіх ягоных слоў я не сустрэў. І жанчына, якой я перадаў сшытак, таксама памерла.

Паміж тым прыгожым слабадскім днём і сённяшнім Віктаравым з'яўленнем у маім інтэрнацкім пакоі ляжала багата гадоў і багата што яны неслі за сабой.

Я скончыў педвучылішча, папрацаваў у школе, тры зімы адтанцаваў пад музыку вайсковай дысцыпліны і мурманскіх маразоў і вось пачаў трэці курс універсітэта.

Як і чым жыў Віктар гэтыя гады, я не ведаў. Ці ўспамінаў я пра яго? Успамінаў. І нашу першую сустрэчу, і куфаль гаркавага піва, выпітага пад гаворку пра Мáлышавых салаўёў на беразе Біскайскага заліва, і яго вершы, і пыльную вуліцу Чырвонага Лесу.

Ці ўспамінаў ён мяне? Відаць, таксама ўспамінаў, калі рашуча знайшоў тут.

Віктар чакаў мяне, нервова шнураваў па пакойчыку. Вочы яго блішчэлі, як пасля выпіўкі. Паголены, пастрыжаны, адпрасаваная кашуля ў чырвона-сінюю клетачку з накладнымі кішэнямі, чорныя калашыны штаноў запраўлены з напускам у наваксаваныя халявы вычышчаных ботаў. Гарнітур зборны, але сядзіць ладна, па-вясковаму ўрачыста, як адзнака нейкага змешанага вайскова-цывільнага стылю.

— О-то, браце,— раскінуў я рукамі.— Ты прыбраўся, няйначай, як Сталін на сустрэчу з генераламі.

— Ты не жартуй,— Віктар нібы спаткнуўся пасярод пакоя, стаў з насцярогай аглядаць сябе. Павінаваціўся:

— Я прымяраў твае чаравікі — ціснуць.

На стале ляжалі хлеб, кілбаса, памідоры. Віктар выйшаў за дзверы, вярнуўся з чайнікам, з рыльца якога пыхкала пара. Колішнія студэнты ведаюць, дзе што ляжыць і як што зрабіць.

Падаконнік быў заняты ладнай горкай перавязаных аборачкай кніжак.

— Бачу: ты дастукаўся да свайго даўжніка? — спытаў я.

— Ага, сустрэліся — і ён якраз пры грашах. Кажа: колькі разоў адкладваў — столькі і распускаў. Грошы — вада. Забег у інтэрнат, кніжкі забраў, слоўнікі. Хай паляжаць у цябе. А папраўдзе — мы з табой сёння багатыя людзі, і нас чакае «Дзяўчына з Палесся». Можа, трэба было б і пляшку ўзяць, ды я падумаў...

— Правільна падумаў. Скажы лепей, як твой паход у міністэрства?

— Ат! — Віктар махнуў рукой.— Не даюцца гаварыць, спіхваюць адзін другому, як дзядзьку ў Вільні. «Мы не можам ісці проці волі народа...» — «А подпісы бацькоў, іх пад дзве сотні,— гэта не воля?» — «Подпісы — гэта адно, мы можам табе іх тысячу назбіраць, а ёсць другая воля, вышэйшая...» — І ківок угору... Там, на небясі...

Елі кілбасу з памідорамі, пасыпаючы іх буйной соллю, пілі чай з маміным варэннем, залазячы лыжкамі ў двухлітровы слоік. Віктар гаварыў далей:

— Дык вось, народ! Прыслалі да нас новага дырэктара. Ён сам рускі, жонка — наша паляшуцкая русалка, біялогію вядзе, расказвае дзецям пра «дагістарычных іскупаемых». Дзеці нядоўга прывыкалі да яе, нюхам учулі яе вучонасць, на саму пераклінулі — «дагістарычная іскупаемая». Непадалёк у лесе вайсковая ракетная часць стаіць, колькі афіцэрскіх сем'яў. «А как же наши дети? Может, через несколько лет им в Среднюю Азию ехать придется, там тоже языки всякие...» Закруцілі, замуцілі — і пайшло. Раённае начальства туды ж, за іх. Выклікае мяне загадчык райана: «Чаго ты дабіваешся, Віктар Міхайлавіч?» — «Нічога не дабіваюся. Хачу, каб школа заставалася беларуская»,— «У цябе ж нямецкая мова, якая табе розніца?» — «Такая, Міхаіл Іванавіч. Не хачу калечыць дзяцей».— «А калі яны з беларускай школы едуць у рускі горад, мы не калечым?» — «Яшчэ як калечым».— «Вось бачыш. Ты ж разумны чалавек, хіба ты не адчуваеш тэндэнцыю? Усё ідзе на зліццё... І наогул...» — «Што «наогул»?» — «Літаратурны гурток — гэта нармальна, гурток па нямецкай мове — добра, а палітыка — гэта пагана. І перш за ўсё для цябе пагана». Вось так, школы няма, жыцця няма — адна палітыка. І спакойна так гаворыць, спакойна пазірае ў вочы, добры, ветлівы чалавек, учарашні настаўнік, сённяшні начальнік.

Віктар сам задаваў пытанні, сам адказваў на іх. Яму трэба было выгаварыцца, пачуць слова спагады ці разумення. І тое, і другое было, і ён гэта адчуваў. Не было толькі помачы, і я не ведаў, адкуль узяць яе.

— Другі раз мяне выклікалі ўжо ў міліцыю. Таварыш капітан, з маладых ды ранні. Гэты гаварыў рубам і без гэтай нікчэмнай ветлівасці. «Что за стишки вы читали возле районной столовой?» — «Свае. Сам прыдумаў, сам прачытаў».— «А как бы это посмотреть на них?» — «Я чытаю па памяці, што прыйдзе ў галаву, тое і чытаю».—«Ладно, прочтите по памяти».— «Вы ўсё роўна не зразумееце, яны па-беларуску».— «А вдруг кое-что и уразумею. Я ведь тоже из белорусов».— «Не. Гэта ж паэзія, імправізацыя. Тут найшло, тут забылася».— «Про бандита Никиту — это импровизация?» — «Усё імправізацыя, і пра Мікіту, і пра астатніх».— «Так вот что, импровизатор. Если ты перед мужиками или еще перед кем-нибудь и дальше будешь читать эти свои пасквили — отправлю туда, откуда трудно вернуться. Можно сказать: невозможно. Дорога с односторонним движением. И пойдешь ты туда не как жертва, не как борец за «националистическую идею...» — «Можа, за нацыянальную?..» — «...не как борец за националистическую идею, а как уголовник. Борца и мученика сделать из себя тебе не удастся. А вот воришка,— не вор, какой из тебя вор,— воришка, промышляющий по мелочам... Так вот, воришку... это я тебе обещаю, это я тебе устрою».

(Працяг на стар. 10—11).

СМЕРЦЬ НАЦЫЯНАЛІСТА

(Пачатак на стар. 8—9).

І, ведаеш, ледзь не ўстроіў. Мінае нейкі час, і раптам гром на школу: нехта зламаў замок на скрыні з вучэбнымі вінтоўкамі. Прапала дробнакаліберка, пяць пачкаў патронаў. Прыехаў участковы, узяў панятых, пачалі шукаць. І знайшлі. Пад страхой у хляве маёй гаспадыні. Усё акуратна загорнута ў мяшок, і мяшок гаспадынін, сушыўся на плоце, а пасля неяк прапаў. Усё падведзена як мае быць. І засудзілі б, калі б вучань рахубу іхнюю не заблытаў. Напісаў заяву, што гэта ён сарваў замок. І манціроўку паказаў, якой зрываў,—якраз падышла. І што мяшок загадзя з плота зняў. «Чаму вінтоўку не дамоў панёс, а пад чужую страху засунуў?» — «Хіба я малахольны, каб дамоў?» — «Тады навошта ўсё гэта?» — «Каб адпомсціць яму». Значыць, мне. Я не прызнаваў яго за паэта, вершы крытыкаваў. І па мове адзнакі заніжаў. Такі вось страшны яго вораг і такая помста. Перабунтаваў ён ім усю рахубу. Бацьку штрафанулі на трыццаць рублёў, а хлопца папярэдзілі, што калі ўтворыць яшчэ такое, то не паглядзяць, што няпоўналетні, уклеяць па ўсёй строгасці. Словам, багата было смеху, на ўвесь раён.

Смех смехам, а мяне агортваў усё большы непакой. Ніякай канкрэтнай прычыны для гэтага не было, але гэта Віктарава грамата, гэта яго шчырасць... Каму яны патрэбны? Хто іх ацэніць? Хіба што ўсё той жа міліцэйскі капітан?

На памяці ў мяне быў свой прыклад. Мы рыхтаваліся да экзамена па дыялектычным матэрыялізме, калі на Цэнтральнай плошчы горада скінулі манумент Сталіну. Аграмаднай цёмнай зданню ён узвышаўся пасярод квадратнай голай прасторы, ужо сваёй адзінотай і пастаянствам абяцаючы нешта страшнае. Расказвалі, што было ўсё так: закінулі стальную пятлю пад бараду, тузанулі танкавым цягачом — і вусатая бронзавая галава пакацілася па бруку, высякаючы іскры.

Сабраліся мы на кансультацыю, хаця якая кансультацыя, калі радыё клейміць «культ» і «бацьку народаў» галаву адкручваюць. Прыйшоў выкладчык, стомлена сеў за стол. Нехта спытаў у яго: «Культ — гэта ёсць. А ці не можа ўсё гэта паўтарыцца? Ну, не сёння, не заўтра, хай пазней трошкі. Ці не можа ўсё паўтарыцца?»

Выкладчык чалавек быў станоўчы. Прынамсі, мы так лічылі. Ён не баяўся вострых пытанняў і не азіраўся палахліва на няшчыльна зачыненыя дзверы аўдыторыі, калі адказваў. Гаварыў, што думаў і як думаў. А тут павёў цяжкім позіркам па тварах і глухім голасам, выціскаючы кожную літару, сказаў: «Разумныя вы хлопцы... чытаеце разумныя кнігі... слухаеце разумных людзей... а нічога не разумееце». Сказаў і выйшаў з аўдыторыі. А назаўтра на экзамене ўсім уляпіў па тры балы. Слухаў адказ, браў у рукі заліковую кніжку, ставіў траяк і ківаў наступнаму: «Давай». І гэтак усім, хто быў на кансультацыі. Чацвёра на кансультацыі адсутнічалі — ім паставіў па пяцёрцы. І смешна, і прыкра. Быў чалавек — і не стала чалавека.

— Віця, ты жартуеш з агнём,— паспрабаваў я перасцерагчы Віктара.

Ён засмяяўся ўсё тым жа нязменным конскім смехам:

— Гы-гы-гы! Жарты! Хата згарэла, галавешкі так залілі вадой, што і чад не прабіваецца, а гаспадар усё з вядром носіцца,— агню баіцца.— Віктар ці не разумеў, пра што гаварыў я, ці не хацеў разумець.— Дык вось, капітан мой быў чалавек сур'ёзны, сваім словам даражыў. Першым разам прамахнуўся, а другім усё-ткі запраторыў мяне ў Пячэрск. «У вас будет время обо всем хорошенько подумать». І праўда, чаго толькі не перадумаеш за паўгода, якіх страхаў не наглядзішся. Але няма большага страху, чым уколы. Тут ужо я прасіўся. «Мне ж яшчэ жыць трэба, дзяцей вучыць. А можа, і свае будуць, гадаваць трэба». І скажу, не сільнічалі. Падзяржалі і выпусцілі. І нават даведку далі, што нармальны, з дзецьмі магу працаваць. Магу. А дырэктар не дапускае.

— Нават так?

— Ну. «Навошта школе ненармальныя?» Я яму даведку, а ён сваё: «Усе ведаюць, што Віктар Міхайлавіч быў у Пячэрску. А Пячэрск — гарадок для ненармальных. Значыць... дыягназ. Сёння не пацвердзіўся, заўтра пацвердзіцца». Вось так. Сам з былых палітрукоў. Турнулі з арміі — дырэктара школы далі. Не справіўся з салдатамі — справіцца з дзецьмі. «Заўтра пацвердзіцца...» Жартаўнік з сабачай слязой. Пазірае на цябе, і не ведаеш: ці то папрасіць што, ці ўкусіць хоча. «Эх ты,— падумаў я,— жартаваць дык жартаваць!» Сядзім. Ён сказаў, я маўчу, гляджу на яго. Ацёчны жаўтлявы твар, зеленаватыя падушкі пад вачыма... Піў і п'е... Жаўтаватыя бялкі. Пытаюся: «Вы ныркі даўно правяралі?» — «Даўно. А што?» — «У вас хворыя ныркі. Асабліва левая».— «Праўда, бывае, пабольвае з левага боку».— «Глуха так, быццам хто ўчора стукнуў? Потым вострыя ўкольчыкі, як іголкай».— «Адкуль вы гэта ведаеце?» — Ага, насцярожыўся, значыць, зацікавіла. Значыць, баліць. Пачакай, пачакай...— «Не, гэта не пясок і не камяні. Там боль раптоўны, рэзаны. Яго цяжка цярпець, але з ім-то яшчэ можна ваяваць. А гэта... гэта страшней. Гэта можа быць самае страшнае...» — «Што?.. Самае страшнае?!.» Бачу, як яго самазадаволеная ацёчная морда мяняе шкуру, з жоўтай робіцца беленькая. Маўчыць, лыпае вачыма. І верыць не хочацца, і не верыць нельга.— «Праверце ныркі, бо можа быць позна»,— кажу яму і выходжу. Задаў ты мне задачку — я думаю, задаў і я табе задачку — ты думай. Назаўтра ранічкай прыбягае жонка, «дагістарычная іскупаемая». «Віктар Міхайлавіч, скажыце, што гэта няпраўда!» У вачах і слёзы, і страх. «Скажыце!» Я маўчу. Ды і што я магу сказаць?!

— Як што? Што пажартаваў, што ўсё гэта выдумаў.

— Я нічога не выдумляў. Ён і праўда хворы і хворы цяжка.

— Адкуль ты ведаеш?

— Адкуль? — Віктар загадкава ўсміхнуўся, пацягнуўшы губамі, нібы сутарга іх павяла.

Я першы раз бачыў такія яго вочы — спакойныя, роўныя, пранізліва-халодныя. Нашы позіркі сустрэліся, і я адчуў усярэдзіне ледзяны дрыжачы холад. Нешта такое я адчуў аднойчы, яшчэ мальцом, калі першы раз зазірнуў цераз зруб у глыбокую студню, самую глыбокую ў нашым сяле. Зазірнуў і далёка на дне, на чорным люстры вады ўбачыў свой твар. Твар не твар — нешта цёмнае, загадкавае, так і хацелася наблізіцца да яго, прыгледзецца, і я ўжо перавесіўся напалову, цягнучы галаву ўніз, і калі б не нечая дужая рука... І цяпер на мяне зноў пазіраў той малец з калодзежа халоднымі Віктаравымі вачыма. Але тут Віктар засмяяўся, непрыгожа агаліўшы дзясны:

— Я люблю чытаць медыцынскую літаратуру, там багата цікавага, асабліва пра хваробы чалавека. А мой дзед Максім умеў лячыць — і людзей, і кароў, і коней. Загаворваў кроў, сунімаў боль, адганяў падучую.— Віктар раптам ускочыў з-за стала, стаў пасярод пакоя, выпрастаўся ўвесь, развёў плечы, узняў грудзі і застыў, нібы схоплены стаўбуном. Твар напружаны, закамянелы, вочы нерухомыя, невідушчашкляныя, пазіраюць удаль, паверх маёй галавы. Потым паволі апускаюцца ніжэй, на мой твар, знаходзяць мае вочы — і не адпускаюць іх. Губы яго варушацца, суха шэпчуць: «Згінь, хвароба, прэч з парога! Ты мяне не ведаеш, я цябе не ведаю, ты мяне не чуеш, я цябе чуць не хачу... Ты, соль,— усё засоліш! Ты, попел,— усё пераясі! Ты, чорны вугаль,— усё зачэрніш!..» — Ён ідзе па пакоі, выставіўшы рукі з растапыранымі пальцамі, водзіць імі кругамі ў паветры, нібы адганяючы насланнё, чмут нейкі. Увесь наструнены, сабраны ў адзін камяк, ступае мякка, нібы кот, гатовы ў любое імгненне скочыць, потым рэзка кідае рукі ўперад, перад маім тварам, застывае на нейкі час. Я сяджу, як пад гіпнозам. Ён забірае рукі назад, нібы хавае, як кот кіпцюры, твар яго расслабляецца, ажывае, і ён задаволена рагоча сваім грубым голасам. Гэты голас некалі я чуў у калідорах педвучылішча і тады ён мне падабаўся. Але цяпер ён здаецца мне ненатуральным і хворым.

— Ды ну цябе з тваімі прымхамі,— гавару я збянтэжана.— Гэтак ты каго хочаш напалохаеш.

— Ну, цябе ж не напалохаў.

— Напалохаць не напалохаў, але...

— Але...— Нібы ўзрадаваўшыся, Віктар падхопліваe: «Разве может нормальный человек читать провокационные стишки перед народом?»

— Усё капітан?

— Ён.

— І што за «сцішкі»?

Віктар азірнуўся на дзверы і прашаптаў:

— Яны ў мяне з сабой.— Дастаў з партфеля пакунак, загорнуты ў газету і крыж-накрыж перавязаны тоўстым шпагатам. Тры агульныя сшыткі ў каляных вокладках, спісаныя акуратным, крута нахіленым почыркам. На першай старонцы першага сшытка вялікімі чырвонымі літарамі загаловак: «Пра бандыта «Мікіту», трошкі ніжэй, літарамі меншымі — жанр: «Паэма».

Паэма была разбіта на раздзелы. «Саюзу — кукурузу», «Кароўку на вяроўку», «Нашто порткі калгаснікуі?..», «Каму жывецца весела ў нас у Беларусі...».

— І ты ўсё гэта возіш з сабой? — спытаў я.

Віктар весела кіўнуў галавой:

— Ну.

Цяпер ужо і я паглядзеў на яго, як на ненармальнага.

— А што?..— спытаў Віктар.

— Дурань, вось што,— адказаў я злосна.

У оперным на нас пазіралі як на сланоў, якія вырваліся з клеткі і спакойна разгульваюць па праспекце. Добра вычышчаныя Віктаравы кірзавыя боты давалі такі густы дух гуталіну, што ён не мог не трывожыць далікатныя насы тэатральнай публікі.

Віктар і тут быў спакойны, а калі пачуліся першыя музычныя акорды і пайшло прадстаўленне, ён нібы ўвесь перамясціўся бліжэй да сцэны, да аркестра.

І музыка, і драма, і ўся гэта прыгожая тэатральная бутафорыя ўцягнулі і мяне. Я быў рады, што Віктар прывёў мяне сюды. Слухаў музыку, перажываў драму, быў ва ўладзе прадстаўлення, але трывога за яго самога ні на хвіліну не адпускала мяне.

Спектакль скончыўся позна. Мы пеша ішлі па начным горадзе. Атмасфера тэатральнай дэкарацыі нібы выйшла сюды, на начныя вуліцы. Цішыня, тайна ценяў, напружанае чаканне невядомага. Доўга маўчалі. Першы загаварыў Віктар.

— Ведаеш, якую беларускую оперу я хацеў бы паслухаць? Оперу пра выгнанніка. Чалавека выгналі з роднай хаты, з роднай зямлі ў далёкі чужы свет. Ён бадзяецца, як непрыкаяны, яму цяжка, яму балюча, яму крыўдна. З яго здзекуюцца, з яго пацяшаюцца — за яго прастату, за яго словы, за яго мову. За яго працавітасць, за гатоўнасць рабіць любую работу. Ён цягавіты, ён мужыкаваты. Ён усё церпіць, ён усё сцерпіць, бо ў душы ў яго жыве мара, надзея: ён чакае таго дня, калі зможа вярнуцца дамоў. Гэта мара дае яму сілы вытрымаць усё. І вось настае той жаданы дзень. Ён збіраецца ў далёкую дарогу — дарогу дамоў. Я чую гэтыя мажорныя акорды, за якімі і боль, і трывога, і слёзы. Яго спрабуе не пусціць, хоча ўтрымаць там жанчына. Яна кахае яго, яна шкадуе яго і просіць, каб ён застаўся. Яна прадчувае тыя беды, што чакаюць яго, яна ведае, што яму там будзе цяжка, а сама яна не можа пакінуць сваю радзіну, сваіх блізкіх. Але і ён не можа застацца там. Ён вяртаецца дамоў. І што сустракае яго? Першы ўдар: яго радня не прызнае яго. Радня думае, што ён прыйшоў, каб выгнаць іх з хаты, з якой некалі выгналі яго, і ў якой пасяліліся яны і жывуць цяпер. І ўжо нібыта ён вінаваты, што вярнуўся дамоў. Не прызнае яго і каханая жанчына. Некалі ён пакінуў яе малой дзяўчынкай, аб ёй былі яго мары ўвесь гэты доўгі час. «Ты ж мая, ты ж мая перапёлачка...» Яна была яго перапёлачкай, яна клікала яго праз ночы і гады. Але яго сустракае не маленькая перапёлачка, а стомленая жыццём жанчына. Яна чакае дапамогі, яна шукае спакою. Ён можа дапамагчы, але даць спакою не можа. Што яму рабіць, куды ісці далей?.. Гэта драма жыцця, трагедыя душы. Калі б падаць яе праз музыку, праз слова!.. У музыцы яе мог бы асіліць Туранкоў. Праўда, яго ўжо няма. А ў паэзіі?.. Куляшоў? Надта сухі. Танк? Надта мяккі. Вось такую оперу я хацеў бы паслухаць.

Такую оперу хацеў бы паслухаць і я. Я пазіраў на Віктара, чуў яго гарачыя словы, і мне здавалася, што такая опера ўжо ёсць, што неўзабаве яе можна будзе паслухаць... Далей мае думкі пайшлі пра тое, чаму жывыя Куляшоў і Танк не могуць асіліць гэтую работу, а мёртвы Туранкоў мог бы? Чаму?

Мы падыходзілі да інтэрната, калі прыціхлі на нейкі час, Віктар раптам засмяяўся. Счакаў трохі і зноў: «Гы-гы-гы!»

— Што такое?

— Успомніў адну гісторыю. Лічы — з той жа оперы. Два першыя курсы замежнага інстытута я быў на завочным. Здаваць экзамены здаваў, але зразумеў, што замежную мову так не вывучыш. Чытаць будзеш, а гаварыць не будзеш. Патрэбна актыўная практыка, жывы кантакт. Словам, перавёўся на стацыянар. Не надта любяць такое рабіць, але зрабілі. І трапіў я ў групу выдатнікаў. Сем чалавек, я — восьмы. Гладзенькія, чысценькія, усе са спецшкол, пасля залатых атэстатаў. На практычных сякуць, як зайцы капусту. А я — пык-мык, фатэр-мутэр — і заціх. Хачу любіць, а не ўмею. Трэба даганяць, выраўнівацца. Трэба шукаць. І перш за ўсё словы. А дзе іх браць? У пісьменнікаў. Дапусцім, у Томаса Мана.

— Так проста... у Томаса Мана?..

— Не проста... Узяць якую-небудзь казачку... Там і ста слоў не набярэцца. А тут — энцыклапедыя. Узяўся за «Будэнброкаў» — і пераклаў.

— Ты так весела гаворыш: «Узяўся і пераклаў».

— Пераклаў... Канечне, для сябе, для вучобы... Надта цяжка даваўся першы раздзел. Трэба было ўлезці ў яго стыхію, адчуць стыль, потым слова, гульня з ім. Скрыпач са скрыпкай — гэта віртуоз, а скрыпач са словам — гэта яшчэ глыбей. Дык вось, «Будэнброкі». Іх мне хапіла на ўвесь інстытут. На вусным я мог даць асечку, а на пісьмовым усе мае хлопчыкі беглі да мяне. Наіўныя дурні, яны ведалі толькі адно — зубрыць, зубрыць, зубрыць. Пытаюся аднойчы: «Хто з вас быў на «Паўлінцы»? Ніхто. Бяру білеты — пайшлі. Потым оперны. Потым нехта прыехаў на гастролі. Спадабалася. Спадабалася — гэта добра. Пайшлі грошы зарабляць. На таварную станцыю прыходзяць вагоны з памідорамі, кавунамі ці іншым тэрміновым грузам. Звоняць: «Хлопцы, выручайце!».— «Хлопцы, пад'ём!» Ноч пакідалі — па трыццаць-сорак рублёў у кішэні. Жывём! І ведаеш, я з іх людзей зрабіў. Кажу: «Вы ж не бачыце, што робіцца на свеце. Паўтыкалі насы ў канспекты, у слоўнікі — і ўсё. Азірніцеся кругом, разуйце вочы». Праз год гэта была самая баявая група ў інстытуце. А яшчэ праз паўгода яе разагналі, як ненадзейную... Гы-гы-гы!

У інтэрнаце за чаем я спытаў у Віктара:

— Дзе Ніна?

Віктар доўга маўчаў. Чай быў гарачы, і ён па трошкі адхлёбваў са шклянкі, пазіраючы ў яе. Потым падняў вочы на мяне. Цяжка сказаць, якія гэта былі вочы. Задуменныя? Не. Абыякавыя? Не. Так, вочы спакойнага чалавека.

— Яна прыязджала да мяне летась.

— У школу?

— Ну. Пабывала ў Селішчы, у маці, памагла ёй грады зрабіць, узяла мой адрас і заявілася.— Памаўчаў, даліў чаю. Адхлёбваў, пазіраў у празрыстую бурштынавую глыбіню шклянкі.— Пражыла тыдзень у мяне і паехала.

— І ўсё?

— Не. Сказала, што збіраецца замуж.

— А ты?

— Сабралася — дык ідзі.

— Можа, ты дарма так з ёй?

— Калі чалавек так сказаў, значыць, у яго ўжо было гатовае рашэнне.

— Калі б было гатовае рашэнне, то навошта б яна шукала цябе?

— Шукала.

— Трэба і яе зразумець: дзяўчыне хочацца сям'і, нейкага ладу, пастаянства.

— А дзе яно, гэта пастаянства? У мяне яго няма. І ці будзе калі. Мой сусед у Селішчы любіць паўтараць: «Маленькі сабачка заўсёды шчанюк». Так і я, гаў-гаў-гаў.

Я зразумеў: ён зноў збіваў гаворку на несур'ёзнае.

Лягілі спаць. Студэнты, як і салдаты, засынаюць імгненна і спяць моцна.

Калі я прачнуўся, Віктара ў пакоі не было. На маёй тумбачцы ляжаў загорнуты ў газету, перавязаны тоўстым шпагатам пакунак. Я добра ведаў, што ў ім, але цяпер у мяне не было часу для сур'ёзнага чытання, і я засунуў яго на антрэсолі — у суседства са старымі канспектамі, кантрольнымі работамі і падручнікамі. Туды ж паклаў і два тоўстыя слоўнікі: хіндзі-рускі і арабска-рускі. Толькі адзін Віктар ведаў, навошта яны былі яму.

Летнімі канікуламі ў інтэрнаце рабілі нейкі паспешлівы рамонт, вычысцілі ўсе куткі і закуткі. Разам з канспектамі і кантрольнымі прапаў і пакунак з трыма Віктаравымі агульнымі сшыткамі. Можа, назаўсёды, а можа, дзе-небудзь яшчэ знойдзецца. Бо слоўнікі знайшліся, захаваліся ў мяне і па сённяшні дзень.

З год Віктар не аб'яўляўся. Ад Буракоўскага я чуў, што ён працягваў адчайна ваяваць, каб вярнуць сваёй школе беларускую мову. Праўда, ваяваў ён цяпер з другім дырэктарам. Былы палітрук з «дагістарычнай іскупаемай» некуды з'ехаў.

Маё жыццё крута павярнулася ў бок практычнай журналістыкі. Мне прапанавалі месца ў газеце, і я з ахвотай пайшоў туды: жыць на скупую студэнцкую стыпендыю і выпадковыя заробкі было ўсё цяжэй. І вось аднойчы адчыняюцца дзверы закутка, дзе я сядзеў, і заходзіць Віктар. Худы, сухі, запалыя вочы, але ўсмешка ўсё тая ж — зубы на продаж. Недарагі шэры касцюм, кашуля без гальштука — іх ён не любіў ніколі,— і ўсё нібы з чужых плячэй. Памяць мая адразу вярнула педвучылішча, той светлы дзень, калі Віктар выйграў на аблігацыю і частаваў мяне півам. Тады ён быў таксама ў шэрым касцюме, але які гэта быў касцюм і як ён ішоў яму!

— Іч, рассеўся, як пан, — загаварыў ён нязлосна, павёўшы вачыма па стале, за якім быў я. Нібы і нязлосна, але падкалоў мяне.

— Ага,— пагадзіўся я. Стол сапраўды быў ёмкі, на дзве тумбы, і сядзець за ім мне падабалася.

— Лепей бы пасобіў мне Ніну знайсці.

Я не ведаў, што і чаму «лепей», і хацеў ужо пачаць высвятляць, але Віктар сам апярэдзіў пытанні:

— Звольнілася са сваёй школы і паехала. Куды паехала — нікому не сказала. Спрабаваў дазнацца ў яе бацькоў — не гавораць. Адно выведаў, што некуды ў Гродзенскую вобласць. Але ж вобласць—гэта вобласць.

Гэта так. У вобласці — раёны, у раёнах — сельсаветы, у сельсаветах — школы. Але...

— А ў аблана ты не цікавіўся?

— Дзе тое аблана. Табе ж прасцей, ты не які там, ты — з газеты. Вазьмі трубку, пазвані ў міністэрства, ці ў тое ж аблана — і табе скажуць.— Нейкая раздражнёнасць, нават грубасць чуліся ў яго голасе. Нібыта я нечым перад ім правінаваціўся. Можа, тым, што Ніна хаваецца ад яго...

Я пачаў званіць. Нічога путнага мае званкі не далі. Адно з Гродна вясёлы мужчынскі голас сказаў, каб я перазваніў праз дзянёк-другі. «Мы яе хоць з-пад зямлі дастанем, калі зямля гэтая ў Гродзенскім акалотку».

Ні дзянёк, ні другі Віктар чакаць не мог, і я дакляраваў выслаць яму адрас, як толькі даведаюся.

Мой рабочы закутак мала што ўмяшчаў: акно, стол, стул. Яшчэ адзін стул стаяў напроці, ля дзвярэй. На ім цяпер і сядзеў Віктар. На гэтым стуле пераседзела шмат розных людзей, але толькі адзін з іх сказаў мне «пан», сказаў жартам, і я разумеў, што гэта жарт, але разумеў і тое, што нейкая доля праўды стаяла за гэтым словам. Віктар быў падобны на чалавека, які ў адзежы зваліўся ў ваду, і, не маючы ў што пераапрануцца, чакаў, калі адзежа высахне на ім. І ўпершыню за ўсе гады нашага знаёмства мне стала ш к о д а яго. Я востра адчуў нейкую сваю віну перад ім. Мне стала няўтульна за м а і м сталом.

Віктар маўчаў. Можна было падумаць, што ён не ведаў, куды пайсці і што рабіць. Хаця не.

Вось ён дзіўна ўсміхнуўся, скрывіўшы твар, як збіраўся заплакаць:

— Ведаеш, мне нядаўна сасніўся сон. Страшны сон. Нібыта я ў нейкім кафэ, і мы выпіваем, і прыслужвае нам сімпатычная, гадоў пад трыццаць кабета. І раптам нехта адзін з нашай кампаніі ўстае і груба гаворыць ёй:

— Пайшлі і прапусціш іх усіх.

Кабета не здзівілася яго словам, паглядзела на ўсіх спакойным балесным позіркам, і на мяне паглядзела, павярнулася і пайшла. Усталі і пайшлі за ёй усе, колькі іх там было,—чалавекі чатыры ці пяць. Я застаўся сядзець за сталом.

Праз нейкі час паўжывую кабету пранеслі цераз залу назад. За ёй ішлі тыя мужчыны, толькі цяпер яны былі ў белых сподніках, выпэцканых кроўю. Дык вось — гэта была мая жанчына.— Віктар зноў усміхнуўся жаласнай усмешкай.

Я не ведаў, што сказаць. Спытаў:

— Як ты сам жывеш?

— А ніяк,— адказаў ён злосна.

— А школа?

— Выгналі. Выгналі і ўвесь марафон.

Я чакаў, што ён яшчэ скажа. І ён сказаў:

— Пісаў і ў Мінск, і ў Маскву. Масква перапіхвае пісьмы ў Мінск, Мінск — у Магілёў, а адтуль адно: усё правільна, усё мае быць так. Скончылася тым, што зноў на шэсць месяцаў загналі ў Пячэрск. Выпусцілі з белым білетам, з правам на пенсію, без права на працу.

— Слухай, дык гэта ж...

— Ну,— пацвердзіў ён.

— Можа, я змагу чым-небудзь дапамагчы? Усё ж газета...

— Дапамажы знайсці Ніну.

Такім разгубленым я яго ніколі не бачыў.

— У мяне твае слоўнікі...

— Хай паляжаць.

— А сшыткі твае...— Я запнуўся. Мне цяжка было сказаць, што я не ведаю, дзе яны і ці жывыя наогул...

— Пасля...— адмахнуўся ён. Нібы здагадваўся, што я маю яму сказаць.

У закутку маім павісла гнятлівая цішыня. Ён устаў рашучым рыўком і, не развітаўшыся, выйшаў.

Праз дзень я дазнаўся адрас школы, куды пераехала Ніна, і выслаў яму. Чакаў якога-небудзь знаку ад яго і месяц, і паўгода, і год. Як гэта часта бывала з ім, ён зноў прапаў. І зноў, як камень у ваду.

Я шмат думаў над парадоксамі нашага лёсу. Жывеш з чалавекам побач — думаеш пра яго, перажываеш за яго, хвалюешся. Знік чалавек з вачэй тваіх — і нібы выпаў з твайго жыцця. І ўспамінаеш, і трывожышся, але не так востра, не так балюча.

З'яўленне Віктара ў маім інтэрнацкім пакоі было нібы вяртанне яго з таго свету. І мы зноў былі, як радня, як самыя блізкія людзі. Паехаў ён — і нібы забраў усё сваё з сабой. І чым болей ішоў час, тым радзей ажываў напамінак пра яго, тым глушэй чуўся ў памяці яго голас. Іншае было пасля апошняй сустрэчы. Вобраз разгубленага чалавека ў касцюме з чужых плячэй усё часцей уставаў перад вачыма. Як ён, што ён, дзе ён?..

Нейкім часам мы сустрэліся з Міколам Буракоўскім. Ён стаў добрым хірургам, загадваў аддзяленнем прыстойнай бальніцы пад Мінскам. Пабудаваў свой дом, пакруглеў, пасыцеў. Бляск надзейнай упэўненасці моцна прыжыўся ў яго карых вачах.

— Нешта даўно маўчыць Віктар. Можа, ты чуў што пра яго? — спытаў я ў Міколы.

Ён уважліва паглядзеў на мяне:

— А хіба ты нічога не ведаеш?..

Пра тое, што ён расказаў мне, лепей было б не ведаць...

Віктар прыехаў у сяло, дзе працавала Ніна, сустрэўся з ёй. Яна была замужам, мела дзіця — маленькую пушысценькую дзяўчынку. Мужык — мясцовы механізатар, сімпатычны, рахманы мядзведзь. Гэта была спакойная вясковая сям'я, здавалася, усё ў іх было добра і ладна. І тут заявіўся Віктар. Ён заўсёды ішоў напралом і заўсёды не выбіраў дарогі. Ён пачаў даказваць Ніне, што кахае яе, што толькі пра яе сніць і думае. Угаворваў пакінуць мужыка і выйсці замуж за яго. Яны пераедуць у другое месца, будуць разам жыць, разам працаваць. Ён не сумняваўся, што яму дазволяць працаваць у школе. Не ўгаварыў.

«Што было, тое згарэла, і не трэба варушыць халоднае вуголле»,— адказала яму Ніна. Тады ён прыгразіў, што нікуды ад яе не паедзе, застанецца жыць у гэтым жа сяле. «Я не магу без цябе, я не магу не бачыць цябе».

І застаўся. Узяў кватэру ў старой адзінокай жанчыны, і кожнай раніцай ішоў пад школу, каб убачыць Ніну.

І ў горадзе цяжка сабраць такое ў нейкую норму, а сяло ёсць сяло. Папаўзлі чуткі, што нібыта Ніна і Віктар раней жылі разам, а пасля яна ўцякла ад яго, што нібыта дзяўчынка болей паходзіць на яго, на вучыцеля, чым на трактарыста. Ніна ўжо хадзіла грубая другім дзіцем — чыё яно будзе?

Добра падпіўшы, разы са два трактарыст біў Віктара. Прыстрашыў і гаспадыню, дзе той браў кватэру, што калі яна не выправіць свайго пастаяльца, ён возьме трактар і гэту яе курыную хатку са ўсім шлуннем спіхне са стромы ў рэчку. У сяле і лес быў, і рэчка была, і строма высокая. Гаспадыня вымушана была адмовіць Віктару ў прытулку, і болей ніхто не захацеў узяць яго на пастаяльства. Тады ён выкапаў на ўскрайку лесу зямлянку, склаў з каменя печ і перасяліўся жыць туды. Яго часта бачылі ў сяле — то каля школы, то каля магазіна. Ён не цураўся людзей, і людзі не аббягалі яго. Гаварыў ён ўсё тым жа вясёлым грубым голасам, і ўкруга яго заўсёды збіваліся ў кучу мужчыны. У яго быў невялічкі прыёмнік, і Віктар добра ведаў, што робіцца на свеце. Ён першы сказаў мужыкам, што ў Крамлі скінулі Мікіту і што ўзышла зорка Лёнькі Брэжнева. Ён чытаў мужыкам вершы пра царыцу-кукурузу і пра тое, як кароўку залыгалі на вяроўку і пацягнулі на мясакамбінат. Праўда, ён казаў, што вершы гэтыя былі напісаны даўно, можа, нават у мінулым веку. Мужыкі пасміхаліся, ківалі галовамі: хай сабе і ў мінулым, але ж складна і праўдзіва.

Дачуўся пра вершы ўчастковы міліцыянер, завітаў у зямлянку. «Няйначай, арыштоўваць прыйшоў»,— падумалі мужыкі. Не, не арыштаваў. Ніхто не ведае, пра што яны гаварылі там, але ўчастковы стаў бываць на ўскрайку лесу ўсё часцей. Нешта пачало праясняцца трохі пазней, калі ўчастковы, узяўшы добрую чарку на хрэсьбінах, раптам стаў даказваць, што вучыцель — разумнейшы чалавек, але яму ходу не даюць. Хто любіць разумных?

Настала восень, пачаліся халады. Пад вечар кожнага дня Віктар распальваў сваю печ. Убачыўшы дым, які блытаўся між дрэў на ўзлеску, людзі жартавалі: «Вучыцель лазню топіць». Жартаваць жартавалі, але не смяяліся.

Потым раптам дыму не стала. Так было дзень, другі... Трэцім днём Ніна сказала мужыку: «Схадзі паглядзі, ці не захварэў ён».

Мужык не сказаў нічога, сабраўся і пайшоў.

Дзверы зямлянкі адчыняліся ўсярэдзіну. Яны былі зашчэплены. Трактарыст быў чалавек цяжкой сілы, націснуў плечуком — зашчапка і адскочыла.

Прывучыўшы вочы да паўзмроку зямлянкі, трактарыст убачыў свайго саперніка. Той ляжаў пад клятчатай саматканай коўдрай на тапчане, які служыў яму і лаўкай, і ложкам. Відаць, ён не даў добра перагарэць вуголлю, рана зачыніў юшку і рана лёг спаць.

І цяпер ён ляжаў ціха, як можа ляжаць толькі мёртвы.

Пахавалі яго на мясцовых могілках, на пагорку. Могілкі былі недалёка ад школы, і людзі сказалі: «Ён любіў глядзець на школку, хай і цяпер глядзіць».

— Ты быў на пахаванні? — спытаў я ў Міколы. Яго расказ глухой удаўкай узяў мяне за сэрца.

— Не быў. У яго паперах знайшлі толькі адрас маці. Яна адна і была.

— Давай з'ездзім да яго.

— Давай. Вось толькі трошкі разграбуся з клопатамі. Пачаў шаляваць дом — трэба неяк скончыць. Я ж куркуль,— усміхнуўся Мікола.— Дом, сад, агарод. Прыедзеш як-небудзь — пабачыш.—І праўда, Мікола быў не толькі добры доктар, але і добры гаспадар.

Мы разышліся. Кожны панёс у душы свой жаль і сваё адчуванне вінаватасці.

Мінула паўгода, потым яшчэ паўгода. Думкі пра Віктара і яго страшную смерць не пакідалі мяне. А паездка наша з Міколам усё адкладвалася і адкладвалася.

Неяк я перабіраў кнігі на антрэсолях і наткнуўся на два тоўстыя цяжкія фаліянты — Віктаравы слоўнікі. З хваляваннем і нейкім страхам узяў у рукі адзін з іх, сеў за стол, пачаў гартаць. То быў арабска-рускі слоўнік. Я перагортваў старонку за старонкай, стараючыся саўладаць з хваляваннем, імкнучыся пранікнуць у магічную таямніцу арабскіх пісьмёнаў—гэтых дзіўных карункаў на белым полі паперы. Такія непадобныя на нашы знакі, а гавораць тыя ж самыя словы, тыя ж паняцці.

Недзе ў самым канцы слоўніка між прыжоўклых ад часу старонак ляжаў акуратна пераламаны надвое аркушык белай паперы. Па краях ён таксама набраў колер пергаменту. Я разгарнуў яго. Зверху данізу ён быў спісаны акуратным, крута нахіленым Віктаравым почыркам.

«Добрага дня табе, мая дарагая!

Часам мне здаецца, што я нічога не ведаю — ні што некалі было, ні што некалі будзе. І дзіўлюся з сябе, сталага чалавека, рэаліста, не летуценніка. Раптам мне, не гаваруну, захацелася гаварыць, абы з кім, але гаварыць. Гаварыць пра літаратуру, пра гісторыю, пра нашу бедную зямлю. Пра сябе, пра ўсё, што бачыў, чым жыў, чым жыву. І ўсё гэта таму, што ўбачыў колькі слоў, напісаных тваёй рукой. Колькі слоў, а ўсё перавярнулася, усё стала па-новаму хораша і прыгожа.

Хочацца гаварыць, хоць я і не ведаю, ці гэта я гавару з табою, ці сам з сабою.

Ты для мяне — як хата з зачыненымі дзвярыма. Мне хочацца зайсці ў хату, але я не ведаю, як мяне там сустрэнуць. Можа, абагрэюць, прытуляць, напояць, а можа, не пусцяць далей парога...

Ты як хата, і мне чамусьці думаецца, што і табе адной холадна і зябка.

Можа, ты таксама хочаш, каб нехта прыйшоў, расчыніў твае дзверы, ажывіў халоднае паветра сваім дыханнем, расклаў агонь у печы — сагрэў цябе з сярэдзіны. Тады не так адзінока будзе стаяць табе ў бязлюдным полі.

І, можа, гэта я павінен адчыніць твае дзверы, а можа, не я? Бо нават тады, калі мяне сустрэнуць добра і будуць рады мне, я не ведаю, на колькі хопіць мне гэтай радасці. Хіба можна радавацца заўсёды? І ці не захочацца мне неўзабаве пакінуць хату і зачыніць дзверы знадворку? І як тады будзе табе? Ці не стане табе яшчэ болей зябка і няўтульна пад гэтым шырокім небам? І ці не пойдзем мы па свеце яшчэ болей адзінокія і самотныя, як зараз?

Але ўсё роўна — мне хочацца гаварыць з табою. Можа, гэта гаворка — жаданне зазірнуць у тваю душу, ці расчыніць перад табою дзверы сваёй хаты-душы? Толькі ці не застанёмся мы абое пасля гэтай гаворкі з расчыненымі напята дзвярыма? Ці не выстудзім свае хаты, і ці не застануцца яны стаяць з халоднымі ценямі па кутках і пустымі праёмамі дзвярэй? Як вечны дакор мне — чалавеку, які хацеў і баяўся, хацеў сказаць і баяўся гаварыць.

Апошні час мне вельмі няўтульна на свеце. Нідзе не магу я доўга затрымацца. Не паспею сагрэцца, як шукаю дарогі далей. Дарогі куды, дарогі навошта? У поле, на вецер, на сібер, з тым, каб праз нейкі час зноў шукаць новую хату, новае прыстанішча. Новую хату, бо ніколі не магу вярнуцца назад, дзе ўжо быў.

Я зразумеў, што свет вялікі, а людзей так небагата. І ці можа адзін сабраць тое, што рассыпаюць усе.

Я адчуваю, што ад мяне ўсе чакаюць цяпла, а я прыношу холад. Агню майго хапае вельмі на мала. Яго не хапае нават на тое, каб сагрэць самога сябе. Гэта хутчэй бянгальскі агонь на навагодняй ёлцы, а каго можа сагрэць бянгальскі агонь?.. А можа, і не бянгальскі? Можа, гэта толькі мне так здаецца?..

Даруй, што я пішу табе ўсё гэта. Магчыма, я і не пашлю гэты ліст табе, магчыма, яго ніхто ніколі не прачытае. Бо гэта толькі маё, схаванае ад усяго свету, схаванае за напускной весялосцю, за працай, за дзелавітасцю.

Як добра быць шчаслівым! А калі ў чалавека няма шчасця — ён выдумляе яго. Як добра быць каханым! А калі няма кахання, чалавек выдумляе і яго. І як ні дзіўна, чалавек з выдуманым шчасцем і выдуманым каханнем часта бывае шчаслівейшы, чым чалавек з рэальным шчасцем і каханнем. Даруй яшчэ раз».

Ні імя, ні адрасу на аркушыку не было, але я ведаў, што ліст мог быць напісаны толькі аднаму чалавеку.

«Вось і ўсё,— горка падумаў я.— Жыў-быў чалавек... Жыў-быў... Хаця не, не ўсё».

Час быў позні, і я не стаў трывожыць Міколу. Вырашыў пазваніць заўтра на працу. На мой званок доўга ніхто не хацеў браць трубку. Я набраў нумар яшчэ раз. Азваўся жаночы голас.

— Мне Мікалая Іванавіча,— папрасіў я.

У трубцы цішыня і далёкі, нібы з космасу, трэск.

— Хачу папрасіць Міколу Буракоўскага,—паўтарыў я.

— А хіба вы нічога не ведаеце?..— голас ціхі, быццам вінаваты.

— Што?!

— Мікалая Іванавіча няма. Ужо два месяцы, як яго не стала.

Я апусціў трубку на стол. Яна яшчэ доўга абзывалася жалобным тэлефонным плачам.

Нараджэнне новага прафесійнага калектыву—Мінскага дзяржаўнага духавога аркестра «Няміга»—падзея гістарычная ў культурным жыцці нашай рэспублікі. Відаць, гісторыкі-музыказнаўцы будуць потым удакладняць: ці то ад верасня 90-га пачынаць летазлічэнне гэтага калектыву, ці то ад 1984 г., калі быў створаны студэнцкі духавы аркестр БДК. А можа, аж ад 1977 г., калі ўпершыню паспрабавалі гэты моцны арэх на зуб, і канцэрт у той жа філарманічнай зале атрымаўся нядрэнны!

ДОЎГАЧАКАНЫ, ПЕРШЫ І АДЗІНЫ



Можна бясконца заглыбляцца ў гісторыю нашай музычнай культуры (нават да тых часоў, калі духавая музыка не ведала роўных у народзе па ўзроўні папулярнасці, па сіле ўздзеяння на чалавечыя душы) і прыгадваць, што заўсёды з упартай настойлівасцю ставілася пытанне пра стварэнне на Беларусі прафесійнага духавога аркестра, і захады рабіліся ў гэтым кірунку самыя сур'ёзныя. Людзі ахвяравалі і вольным часам, аддавалі свае творчыя сілы, здольнасці, талент, выяўляўся сапраўдны шквал калектыўнага энтузіязму, аднак... Вось чаму доўгачаканую прэзентацыю духавога аркестра я ўспрымаю як свайго роду перамогу. Вельмі прыемная нагода, каб паглыбляцца ў дэталі шляху да яе, каб высвятляць, што больш спрыяла гэтай перамозе: ці новае мысленне, ці неадступны, напорысты, бязмежны энтузіязм Аркадзя Берына — мастацкага кіраўніка аркестра... Ведаю, што не ўсё так проста было зрабіць, таму лічу гэтую падзею ў нашай агульнай нацыянальнай культуры — і перамогай, і здабыткам, і каштоўнасцю!

Нараджэнне наогул складаны прыродны працэс. Гэтаксама і ў жыцці творчым: неабходны час, цярпенне, уменне і, вядома,—любоў да справы. Тады нараджэнне — вялікае свята! Менавіта гэтак і трактаваў прэзентацыю «Нямігі» вядучы канцэрта У. Шаліхін. Я б дадаў сюды і думку пра будучыню. Як вядома, толькі чужыя дзеці хутка растуць, а свае вымагаюць шмат увагі. І я сапраўды хвалююся за лёс гэтага калектыву, за яго прафесійнае здароўе, творчае хараство. Час наш неспакойны, жыццё беднае, праблемы адна другую перакрываюць... Аптымізму надае ўпэўненасць мастацкага кіраўніка аркестра Аркадзя Іосіфавіча Берына, у якога я часцяком цікавіўся справамі будучага аркестра.

А ў час сустрэчы пасля першага канцэрта мы закранулі амаль усе найважнейшыя праблемы аркестра, якіх не так і мала. Мо і заўчасна я пра іх завёў гутарку: усе мы былі пад уражаннем ад прэм'еры, да таго ж, новы фінансавы год зусім блізка, і тады многае высветліцца—аркестр жа знаходзіцца на дзяржаўнай датацыі, але не Міністэрства культуры, а гарвыканкома (упраўлення культуры).

Укамплектаванне «Нямігі» адбылося практычна за кошт «мясцовых нацыянальных кадраў»—усе музыканты або выпускнікі нашай кансерваторыі, або яшчэ студэнты; іншагародніх адзінкі. Дарэчы, раней, як я памятаю, пры стварэнні новага калектыву неяк знаходзілі магчымасць выдзеліць некалькі кватэр для запрошаных музыкантаў або акцёраў. Можа, і «Няміга» не будзе выключэннем...

Даволі востра адчуваецца ў аркестры праблема інструментарыя, а гэта, як вядома, пытанне «валютнае», але ж не хацелася б думаць, што невырашальнае, бо чаго каштуе музыканту ўласны фірменны інструмент, цяжка сабе ўявіць.

І ўсё ж у асноўным гаворка вялася ў нас пра сам вечар у зале БДФ. І вось цяпер я думаю, як распавесці пра канцэрт чытачам: замінае ўпэўненасць, што словамі пераказаць музыку немагчыма... Зала філармоніі была поўная, білеты распрададзены задоўга да канцэрта—так бы заўсёды... Атмасфера нагадвала тую, што панавала на канцэртах Прэзідэнцкага аркестра марской пяхоты ЗША, які надоўга запомнілі мінчане. Яшчэ і па гэтай прычыне выходзіць да слухачоў трэба было з асаблівай прафесійнай адказнасцю. Відаць, многія міжволі параўноўвалі гэтыя два аркестры (вось толькі ці ўсе пры гэтым памяталі, што аркестр ЗША мае 200-гадовую гісторыю). Тым больш, што і рэпертуарнае падабенства было амаль з першага нумара — уверцюра да оперы «Руслан і Людміла» М. Глінкі.

З усёй праграмы вылучу тыя творы, што ўвасабляюць у сабе пэўныя рэпертуарныя напрамкі, якія мастацкі кіраўнік «Нямігі» лічыць неабходным развіваць. Сярод такіх твораў, несумненна, «Партыта» Р. Калінковіча, упершыню выкананая ў Мінску. На фоне нашых апрыклых размоў пра тое, што няма чаго іграць, мала пішуць і да т.п. «Партыта» выглядае творам авангарднага напрамку ў сэнсе новых тэмбравых здабыткаў у галіне духавой музыкі. Слухацкія сімпатыі ў такіх выпадках не паддаюцца раздзяленню: шчыра апладзіравалі і выканаўцам, і дырыжору, і—самому кампазітару, які прыехаў у Мінск.

Прыкметна, што аркестр з першых крокаў звярнуўся да твораў найсур'ёзных па змесце, складаных кампазіцыйна, як, напрыклад, «Піні Рыма» А. Рэспігі. Гэты твор не заўсёды «даецца» нават сімфанічным аркестрам. Не назавеш простымі і творы, выкананыя салісткай ДАВТа БССР Л. Колас у суправаджэнні аркестра (М. Равель, «Вакаліз», Д. Меербер, кавацціна Пажа з оперы «Гугеноты»). Выдатна прагучаў уступ да аперэты «Сільва» І. Кальмана. У канцы першага аддзялення канцэрта былі прадстаўлены на суд слухачоў аранжыроўкі Л. Муранава беларускіх народных песень, а таксама «Інтэрмецца» І. Лучанка.

Другая частка вечара аказалася насычанай сюрпрызамі. Як і ў яго пачатку прагучалі прызыўныя фанфары (Г. Ардалоўскі, «Святочнае прывітанне»), а потым—музыка Э. Л. Уэббэра з оперы «Ісус Хрыстос — суперзорка». Нацыянальна каларытным быў наступны нумар: В. Раду, «Вясенняя хора», дзе аркестр акампанаваў беларускім цымбалам (салісткі Н. Кавалеўская і В. Мішула). Многія, калі не ўсе, сталі сведкамі даволі рызыкоўнага эксперыменту ў галіне збліжэння жанру духавой музыкі з народна-інструментальнай музыкай, прынамсі, з цымбаламі. Здаецца, эксперымент удаўся.

Заслужаны артыст БССР Віталь Волкаў, вядомы выканаўца выкладчык БДК, акрамя ігры на трубе ў «Нямізе», вядзе яшчэ як бы «аркестр у аркестры»—менавіта гэтак я б назваў Біг-бэнд, якім ён кіруе і які таксама выступіў у той вечар.

Прызнаюся, што наўмысна адцягваю размову пра выступленне самага юнага ўдзельніка канцэрта і, не памылюся, наогул самага-самага, бо менавіта выступленне Сярожы Накаракава сталася сапраўднай сенсацыяй. Для тых асабліва, хто слухаў ягоную ігру на трубе ўпершыню. Гэты хлопчык з Ніжняга Ноўгарада мне чамусьці ўвесь час здаецца нашым, мінскім. Можа, таму, што ўжо многа разоў прыязджаў да нас. Можа, таму, што «адкрываў» Усесаюзны конкурс музыкантаў - выканаўцаў на медных духавых, які праходзіў у Мінску пазалетась, калі Сярожа быў зусім юны (цяпер ён васьмікласнік). А можа—ад уласных сімпатый да яго, да таленту, да ягонай ігры...

Доўга не адпускалі аркестр слухачы. І пасля ўжо вядомага ў нас амерыканскага марша «Зоркі і палосы — назаўжды» Ф. Сюзы было выканана «на біс» яшчэ некалькі эфектных твораў. Развітвацца яўна не хацелася. Яшчэ доўга ў гардэробе ды на ганку філармоніі ўзрушаныя слухачы дзяліліся ўражаннямі і агульнай вялікай радасцю ад Музыкі. Пажадаем жа беларускаму аркестру «Няміга» цікавай плённай працы, поспехаў. Планы вялікія, а творчы шлях толькі пачынаецца. Нас чакаюць цікавыя сустрэчы!

Пятро ДУДАРЭНКА,
артыст аркестра
ДАВТа БССР.

Кіно

На пераломе

Не так даўно ў калідоры «Беларусьфільма» я ўбачыла Людмілу Гурчанку і з цяжкасцю пазнала: яна была ў вялікіх цёмных акулярах, стомленая пасля ўчарашняй працы ў паўтары змены. Актрыса здымалася ў двухсерыйным тэлевізійным фільме «Даруй нам, мачыха Расія» рэжысёра Юрыя Ялхова. Здымкі, прынамсі, былі ўжо закончаны, яна прыехала на агучванне і выказала жаданне паглядзець адзняты матэрыял. Рэжысёр паказваў ёй начарна зманціраваную відэакопію.

Актрысе важна было ўзнавіць, уваскрасіць у сабе той стан, які быў у яе пад час здымак, асабліва фінальных эпізодаў. Роля ёй дасталася цяжкая, лёс яе гераіні — следчага Зіміной, якая вядзе ў 1964 годзе следства (а, правільней, даследаванне) па справе здрадніка Радзімы Русакова — завяршаецца трагічна... Дарэчы, калі Л. Гурчанка толькі прыехала на здымкі і з вытворчых меркаванняў яе папрасілі зняцца адразу ў фінальных эпізодах, яна катэгарычна адмовілася. Актрысе трэба было «нажыць» стан, які падрыхтаваў фінал — самагубства Зіміной.

У сцэнарыі В. Раздольскага, напісаным у традыцыйнай манеры, гэтае самагубства не надта пераканаўча псіхалагічна матывавана.. Дый сам сцэнарый здаецца крыху састарэлым (магчыма, п'еса, паводле якой ён створаны, успрымалася б інакш, каб з'явілася ў свой час), калі столькі ўжо напісана, пастаўлена, знята пра культ асобы, яго дбайцаў і ахвяр, яго наступствы і спробы адраджэння.

Рэжысёр Ю. Ялхоў усведамляў гэта, калі распачынаў працу над фільмам, але ён убачыў у сцэнарыі цікавы сюжэтны ход: дзеянне адбываецца літаральна напярэдадні палітычнага краху Хрушчова і заканчваецца ў момант гэтага краху, што адразу робіць непатрэбным усё, што зрабіла Зіміна,— ісціну і праўду пра «злачынства» Русакова; гэта і прычына самазабойства Зіміной. У яе лёсе адлюстраваліся лёсы шмат якіх людзей, якія паверылі ў першую адлігу і перажылі жахлівае расчараванне, калі яна так хутка скончылася.

Рэжысёр, — а гэта натуральна вынікае з яго творчых прыхільнасцяў, — ужывае своеасаблівы прыём кінааповяду. Юрый Ялхоў у мінулым — аператар, і аператар высокага класа. Ці не лепшыя яго аператарскія работы зроблены ў садружнасці з рэжысёрам В. Рубінчыкам («Культпаход у тэатр», «Адступнік»), у творах якога заўсёды высокая ступень умоўнасці. Работа з Рубінчыкам, асабліва апошні фільм «Адступнік», яўна паўплывала на Ялхова-рэжысёра. Ён не хавае гэтага... Умоўнасць, прывіднасць, фантасмагарычнасць аповяду адчуваецца ўжо ў ягоным рэжысёрскім дэбюце — «Кашкадаве Сільверы», пастаўленым паводле апавядання В. Канецкага і названым на ўсесаюзным семінары па аўтарскім кінематографе ў Мінску шматабяцальнай няўдачай.

У такую ж прывідную ўмоўнасць ператварае рэжысёр дзеянне ў сваім новым фільме. На самай справе, Зіміна наўрад ці магла давесці следства да канца, бо надта сур'ёзныя яе праціўнікі: Асмалоўскі, калега, дзейнічае супраць Зіміной з асабістых меркаванняў, і Сцеблін, высокае начальства, імпэтны абаронца культу. Ялхоў гаварыў, што дзеянне фільма павінна праходзіць як сеанс рытызму з пастаянным умоўным гукавым фонам, персанажы нібы матэрыялізуюцца ў свядомасці Зіміной, будучы, па сутнасці, фантомамі (бо ў рэальнасці большасць сведкаў мёртвыя). Гэтай задумай тлумачыцца і выяўленчае рашэнне: наяўнасць двайных экспазіцый, сэнсавае выкарыстанне колеру.

Годнымі партнёрамі Гурчанкі сталі і выканаўцы цэнтральных мужчынскіх роляў — П. Вельямінаў (Асмалоўскі) і Ю. Будрайціс (Русакоў). Вельямінаў, дарэчы, па-свойму зацікавіўся роляю: акцёр быў рэпрэсіраваны... Ён гаварыў пад час здымак, што даўно хацеў сыграць вось такога Асмалоўскага, на якіх добра нагледзеўся ў кабінетах Лубянкі.

Застаецца дадаць, што пры камеры гэтым разам малады аператар С. Зубікаў, а ў стварэнні пластычнага вобраза фільма рэжысёру памагалі два вядомыя беларускія кінатворцы — мастак-пастаноўшчык В. Дзяменцьеў і мастак па касцюмах Э. Сямёнава.

Ларыса ЗАЯЦАВА.

Л. ГУРЧАНКА (Зіміна) і П. ВЕЛЬЯМІНАЎ (Асмалоўскі).
Фота А. ДЗМІТРЫЕВА.

Беларускі шлях

У перыяд паміж лютым і кастрычнікам 1917 года беларускі рух набыў сілу, ператвараўся ў масавы. Гэты рух ачольвала Беларуская Сацыялістычная Грамада. У блоку з Цэнтральнай Беларускай Вайсковай Радай, Беларускай Радай Заходняга фронту яна стварыла Вялікую Беларускую Раду. Гэтая інстытуцыя ўзяла на сябе абавязак склікаць Усебеларускі з'езд, які павінен быў вызначыць эканамічны, сацыяльны і палітычны лад на тэрыторыі нашай краіны.

Вялікая Беларуская Рада не адмовілася ад свайго намеру і пасля кастрычніцкага перавароту. Наадварот, Дэкларацыя правоў народаў Расіі натхняла беларускіх дзеячаў. Натхняў іх і Дэкрэт аб зямлі. Было знойдзена ўзаемаразуменне з Саветам Народных Камісараў у Петраградзе. (Мушу адзначыць, што РСФСР яшчэ не было, таму Расію, як і пры Часовым Урадзе, беларускія дзеячы называюць Расейскай дэмакратычнай федэратыўнай Рэспублікай). Пасля таго, як былі праведзены выбары ад Саветаў, земстваў, вайсковых, флоцкіх, бежанскіх, кааператыўных ды іншых арганізацый, Народны камісарыят нацыянальнасцей выдаў 50 тыс. рублёў на правядзенне Усебеларускага з'езда.

Мушу адзначыць: выбары на з'езд праводзіліся без класавых адрозненняў у той час, як улада Саветаў была ўладаю рабочых, салдатаў, матросаў і сялян (а таксама бедных казакаў). Ужо гэта насцярожвала кіраўнікоў Заходняй вобласці. Не кажу пра тое (пра гэта дастаткова ўжо напісана), што і Мясніковы, і Кнорын, і Ландэр, іншыя дзеячы Абліскамзапа ды Паўночна-Заходняга камітэта РСДРП(б) і ведаць не хацелі пра нейкіх там беларусаў. Таму яны і не з'явіліся на адкрыццё з'езда, а прыслалі С. Берсана — чалавека выпадковага, як сказаў пра яго Язэп Дыла.

З'езд меліся адчыніць 5(18) снежня, але не пад'ехала патрэбная колькасць дэлегатаў. Толькі 7(20) чысла Сымон Рак-Міхайлоўскі абвясціў яго пачатак. Потым пачалося фарміраванне Прэзідыума, Савета Старэйшын, Сакратарыяту, ішлі прыватныя нарады. Два пытанні турбавалі дэлегатаў. Першае: што будзе з Беларуссю, якую дамову з немцамі падпіша Троцкі, чаму на перагаворах у Берасці няма прадстаўнікоў беларускага народа? Другое пытанне: чые інтарэсы прадстаўляе Абліскамзап? У складзе гэтага органа ўлады сотня вайскоўцаў і толькі пад семдзесят прадстаўнікоў мясцовага жыхарства, а ўзначальваюць яго людзі прышлыя. Вось чаму ён не турбуецца пра лёс Беларусі. Пытанне, як бачым, было пра ўладу.

Выбраны дэмакратычным шляхам, выразнік інтарэсаў найперш беларускага народа, прызнаны цэнтральным расійскім урадам З'езд прыходзіць да высновы: трэба ўтварыць Савет Сялянскіх, Салдацкіх і Рабочых Дэпутатаў з ліку дэлегатаў З'езда. Прачытайце рэзалюцыю, якая ўпісана ў Пратакол. Дэлегаты З'езда за адзінства з Расіяй. Значыць, не сепаратысты. Дэлегаты за Савецкую ўладу — значыць, не ворагі ёй. Але яны сталі ворагамі Мяснікова, Ландэра, Кнорына... Бюро Паўночна-Заходняга Камітэта РСДРП(б) прымае пастанову разагнаць З'езд, старшыня СНК Заходняй вобласці Ландэр падпісвае адпаведнае распараджэнне, начальнік гарнізона Крывашэін яго выконвае, а нарком унутраных спраў Алібегаў у ноч з 17 (30) на 18 (31) снежня 1917 года кідае ў турму сацыялістаў Варонку і Грыба, Сераду і Чарвякова, Вазілу і Гольмана, Дварчаніна і Бурбіса...

Прачытайце пратакол — і вы ўбачыце: пратэстуючы супраць дзеянняў СНК Заходняй вобласці, беларускія дзеячы застаюцца лаяльнымі ў дачыненні да петраградскага ўрада. Яны спадзяюцца на яго справядлівасць. Але ў студзені 1918 года III Усерасійскі з'езд Саветаў, выслухаўшы пратэст А. Чарвякова, А. Усціловіча і Т. Грыба, прызнае слушнасць дзеянняў Абліскамзапа і СНК Заходняй вобласці. Яно і не дзіва: перад самым пачаткам работы Усерасійскага з'езда быў разагнаны Устаноўчы Сход Расіі, была разагнана дэманстрацыя ў яго падтрымку.

Нават пасля разгону Усебеларускага з'езда на ўсходзе Беларусі не вынік незалежніцкі рух. Абраны законнымі прадстаўнікамі беларускага народа Выканаўчы Камітэт Рады Усебеларускага з'езда пасля ўцёкаў бальшавікоў абвяшчае Беларускую Народную Рэспубліку. Прачытайце 1-ую і 2-ую Устаўныя Граматы — там няма й намёку на адрыў ад Расіі. Толькі пасля таго, як у склад Рады ўвойдуць прадстаўнікі Віленскай Беларускай Рады, 25 сакавіка 1918 года будзе выдадзена 3-яя Устаўная Грамата — пра абвяшчэнне незалежнасці БНР. Не марылі пра незалежнасць і тыя беларускія сацыялісты, якія стаялі на платформе РКП(б) і змагаліся за правы свайго народа ў Маскве, Петраградзе ды іншых расійскіх гарадах. Толькі той факт, што пасля адступлення немцаў на чале нашай краіны зноў станавіліся Мяснікоў і прысныя, толькі факт існавання БНР вымусіў Чарвякова, Жылуновіча, ды іншых пачаць барацьбу за беларускую савецкую дзяржаву.

І дзеячы БНР, і дзеячы БССР будуць змагацца за Беларусь, супраць Мясніковых, Ландэраў і Кнорыных. І гэта галоўнае, што іх яднае. Яны знойдуць у 20-я гады магчымасць прымірыцца. Але вонкавая сіла, варожая Беларусі, прывядзе іх усіх на галгофу. Толькі адзінкі (Т. Грыб, Я. Варонка, інш.) памруць сваёй смерцю на чужыне.

Пратакол дэлегатаў Усебеларускага з'езда публікуецца тут у перакладзе з рускага друкаванага тэксту, які захоўваецца ў Цэнтральнай бібліятэцы Літоўскай Акадэміі навук. Там захоўваюцца і гранкі карэктуры з перакладам артыкула-водгуку на разгон Усебеларускага з'езда, які змясціла газета даўняга прыяцеля беларусаў Максіма Горкага. У якой газеце змешчаны гэты пераклад, пакуль што невядома. Друкуем яго з захаваннем арфаграфіі і лексікі.

ПРАТАКОЛ ДЭЛЕГАТАЎ УСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДА

1917 год. Ноч з 17-га на 18-ае снежня. Мы, ніжэйпадпісаныя члены Усебеларускага З'езда ў горадзе Мінску-Беларускім, гэтым пратаколам пацвярджаем наступнае: а палове другой гадзіны ночы, калі пленарнае пасяджэнне З'езда перайшло да абвяшчэння рэзалюцыі ў пытанні аб сучасным становішчы Беларусі і аб формах арганізацыі краёвай улады, у залу пасяджэння з'явіліся прадстаўнікі гэтак званага «Савета народных камісараў» Заходняй вобласці пп. Крывашэін (начальнік Мінскага гарнізона) і Рэзаўскі[1] і заявілі аб сваім жаданні зрабіць нечарговую афіцыйную заяву. У гэты ж час Прэзідыуму З'езда стала вядома, што будынак нацыянальнага дома (былы дом шляхецкай зборні), у якім адбывалася пасяджэнне З'езда, ачэплены па іх загадзе коннымі і пешымі войскамі з дзвюма бранявымі машынамі і ля ўсіх выхадаў пастаўлены каравул. На просьбы старшыні З'езда таварыша Серады прад'явіць дакументальныя паўнамоцтвы і сказаць, у чым сутнасць іх афіцыйнай заявы, пп.Крывашэін і Рэзаўскі растлумачылі, што дакументальных паўнамоцтваў яны з сабою не захапілі, што такія яны могуць прадставіць на другі дзень і што сутнасць іх заяў стане вядомая ўсяму З'езду з іх далейшых дзеянняў.

У гэты час сярод удзельнікаў З'езда пачуліся недаўменныя і абураныя выклікі і заклікі працягваць перапыненую працу.

Дзеля таго, каб унікнуць ускладненняў, Прэзідыум упаўнаважыў для перагавораў з названымі прадстаўнікамі «Савета народных камісараў» аднаго з сакратароў З'езда таварыша Грыба, а тым часам З'езд перайшоў да разгляду абвешчанай раней рэзалюцыі і пры бурнай маніфестацыі адзінагалосна вынес наступную пастанову:

«Усебеларускі З'езд, які сабраўся ў Мінску Беларускім, абмеркаваўшы цяжкое становішча краіны і Беларусі, замацоўваючы сваё права на самавызначэнне, заваяванае Расійскай рэвалюцыяй, і пацвярджаючы дэмакратычны рэспубліканскі лад у межах Беларускай зямлі дзеля ахавання цэласнасці Беларусі ў складзе Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі, пастанавіў вылучыць са свайго складу орган краёвай улады ў асобе Усебеларускага Савета Сялянскіх, Салдацкіх і Рабочых Дэпутатаў, якому ўручыць кіраванне Беларуссю аж да склікання Беларускага Устаноўчага Сходу».

Прыняцце астатніх пунктаў, абвешчаных рэзалюцыяй, было перапынена новым настойлівым патрабаваннем п. Крывашэіна, асоба якога і афіцыйнае становішча былі пасведчаны двума членамі З'езда, прадаставіць яму слова для нечарговай заявы.

Вызначыць змест заявы п. Крывашэіна Прэзідыуму З'езда не ўдалося з тае прычыны, што п. Крывашэін быў у нецвярозым стане. Гэтая апошняя акалічнасць з усёй відавочнасцю выявілася для ўсяго З'езда ў бязладнай прамове п. Крывашэіна, які ўзяў слова прывітання і дапусціў такія недапушчальныя выразы, як «заклікаю прэзідыум да парадку, загадваю З'езду маўчаць» і да т. п.

На пачатку гэтай прамовы п. Рэзаўскі неаднаразова перапыняў свайго калегу і прасіў старшыню З'езда пазбавіць яго слова. З тае прычыны, што ён аб'яўляе Усебеларускі З'езд закрытым і прэзідыум яго арыштаваным. Тым не менш п. Крывашэін працягваў сваю прамову да таго моманту, пакуль у залу пасяджэння не былі ўведзены па загадзе т. Рэзаўскага ўзброеныя салдаты. Грубае ўмяшанне ў працу З'езда і нічым не матываваная аб'ява пра яго закрыццё, арышт прэзідыума выклікаў з боку ўдзельнікаў З'езда выбух абурэння. У хвіліны супакаення членам З'езда таварышам Селіванавым, які з'яўляецца прадстаўніком Беларускага абласнога камітэта Усерасійскага Савета сялянскіх дэпутатаў пры Савеце народных камісараў у Петраградзе, членам З'езда — дэлегатам Балтыйскага флоту Мухам, які з'яўляецца адначасова камісарам апекі Савета народных камісараў Заходняй вобласці ў Мінску, зроблены заявы, што дзеянні пп. Рэзаўскага і Крывашэіна яны лічаць неправамернымі і супярэчнымі інтарэсам беларускага народа, а таму рашуча пратэстуюць супраць грубага гвалту, які чыніцца над народным беларускім сходам. Аднак гэтая заява не мела ніякага дзеяння. Узброеныя салдаты сілаю прасунуліся да стала прэзідыума, арыштавалі старшыню З'езда і ўсіх членаў прэзідыума ды вывелі з залы пасяджэння. Бяззбройны Усебеларускі З'езд сустрэў гэты грубы акт гвалту магутным спевам рэвалюцыйнага гімну і неадкладна выбраў новы прэзідыум на чале з таварышам Гольманам. Пасяджэнне зноў аднавілася.

У прысутнасці узброенай варты і пп. Крывашэіна і Рэзаўскага, якія ў гэты час арыштоўвалі асобных членаў З'езда, Усебеларускі З'езд прыняў наступную рэзалюцыю: «Усебеларускі З'езд прадстаўнікоў Саветаў сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў, прадстаўнікоў салдат-беларусаў усіх франтоў і флотаў, прадстаўнікоў земстваў, гарадоў, кааператываў ды іншых дэмакратычных арганізацый Беларусі, у колькасці больш за тысячу чалавек, сабраўшыся дзеля вырашэння пытанняў, звязаных з лёсам Беларусі, якой пагражае падзел і адрыў ад Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі, выказвае сваё глыбокае абурэнне гвалтоўнымі дзеяннямі гэтак званага «Савета народных камісараў Заходняй вобласці ў Мінску», якія выявіліся ва ўвядзенні на пасяджэнне З'езда ўзброенай сілы, аб'яўленні яго закрытым ды арышце прэзідыума, і пастанаўляе:

1). Давесці да ведама ўсіх грамадзян Расіі, цэнтральнага ўраду, усіх рэспублік Расійскай федэрацыі аб грубым гвалце над свабодным Беларускім народам, які заваяваў і мае права нароўні з народамі Расіі на самавызначэнне.

2). Не прызнаваць улады гвалтаўнікоў і заклікаць увесь Беларускі народ стаць на шлях адкрытай і рашучай барацьбы з прадстаўнікамі гэтай улады ў горадзе Мінску».

Пасля прыняцця гэтай рэзалюцыі ўзброеныя салдаты па загадзе начальніка сілы п. Рамнёва, які з'явіўся ў зале пасяджэння, некаторыя з ружжамі на руку, цераз барыкады з крэслаў і лавак прарваліся ў групу членаў З'езда, што акружылі новы прэзідыум, і, пагражаючы штыкамі, арыштавалі апошні. У зале ўзнялося невераемнае абурэнне. Пачалася барацьба. Сталі гаснуць люстры. Адчуваючы сябе бяссільнымі перад узброенымі гвалтаўнікамі,— З'езд шчыльнымі радамі і са спяваннем жалобнага маршу і рэвалюцыйнага гімну рушыў да выхаду скрозь строй штыкоў услед за аршытаваным прэзідыумам. Пры выхадзе з нацыянальнага дома члены З'езда былі сустрэты атрадам кавалерыі і двума браневікамі. Каб пазбегнуць бессэнсоўнага праліцця крыві, у начной цемры разышліся асобнымі групамі. Гвалт на Усебеларускім З'ездзе, апісаны вышэй, працягваўся ад палавіны другой да пяці гадзін раніцы. Былі арыштаваныя: 1) Старшыня З'езда Я. М. Серада (старшыня выканаўчага камітэта Беларускай Цэнтральнай Вайсковай Рады), 2) таварыш яго А. Ц. Вазіла[2] (старшыня Быхаўскага павятовага земства Магілёўскай губерні), 3) сакратары: А. В. Шаўчук[3] (старшыня Беларускага выканаўчага камітэта воінаў Петраградскага гарнізону і яго ваколіц), 4) Л. С. Калядка[4], член Беларускага камітэта пры Усерасійскім савеце сялянскіх дэпутатаў, 5) таварыш сакратара Гушча (прадстаўнік чыгуначнікаў Мінскага вузла), 6) Т. Т. Грыб (прадстаўнік выканаўчага камітэта Беларускай Цэнтральнай Вайсковай Рады), 7) Старшыня Савета[5] Я. Я. Варонка, прадстаўнік Беларускага выканаўчага камітэта Петраградскага гарнізону і яго ваколіц, 8) член з'езда Г. Н.Астроўскі[6], член Усерасійскага савета сялянскіх дэпутатаў, 9) Я. А. Мамонька, Ярушэвіч, Дварчанін, А. Бурбіс, Чарнякоў[7], член Устаноўчага Сходу Валышчыцкі, Гольман, Манцівода, Вараб'ёў, Красоўскі, З. Юр'ева ды інш., усяго 27 чалавек.

Гэты пратакол падпісалі ў горадзе Мінску Беларускім 18 снежня 1917 года.

Арыгінал падпісалі члены Прэзідыума і Савета.

---

[1] У тэксце Пратаколу — Резаузский.

[2] У тэксце Пратоколу памылкова набрана Вязило.

[3] Імя і імя па бацьку А. Шчаўчука публікатару невядомыя.

[4] У тэксце Пратаколу памылкова набрана Л. О. Колядко. На самай справе будучага савецкага генерала звалі Лукашом Сямёнавічам.

[5] Язэп Варонка быў старшынёй Савета Старэйшын Усебеларускага з'езда.

[6] Імя і імя па бацьку сацыяліста-рэвалюцыянера Астроўскага публікатару невядомыя.

[7] Так у тэксце Пратаколу. З літаратуры публікатару вядома, што быў арыштаваны Алесь Чарвякоў.

ГВАЛТ НАД БЕЛАРУСКІМ НАРОДАМ

Пад гэтым загалоўкам вось што паказвае з Пецярбургу газэта М. Горкага «Новая жизнь» з 12 студня (№ 213).

«Ня скончыўшы разгонам пры помачы прыкладаў усебеларускага кангрэсу, рада народных камісараў заходняга краю разагнала Беларускую раду, загадала расфарміраваць першы беларускі полк, адабрала ад яго аружжа і выслала ў 24 гадзіны з Беларусі ўсіх тысячу прадстаўнікоў краю, што з'ехаліся на кангрэс. Ня толькі самі беларусы назвалі гэта нячутным гвалтам над цэлым народам і цэлым краем, але таксама зрабіла Мінская мясцовая рада (дума) і бяз мала ўсе палітычныя партыі, апрача бальшавікоў.

Прэдставіцель мясцовай рады народных камісараў латыш Ландэр наказаў у Пецярбург, што «быццам хочучы паддзержываць цэнтральную ўласьць, беларускі кангрэс прабаваў скінуць мясцовую краёвую ўласьць утвораную з'ездам саветаў, і што цяпер прымаюцца меры проціў кадэтаў, што схаваліся ў беларускай радзе».

Гэты наказ зусім не адпавядае праўдзе і быў зроблены дробязным учуцьцём страху за ўласьць. Канечна патрэбна заўважыць, што ў радзе народных камісараў заходняга краю зусім няма мясцовых людзей. Рада гэта ўтворана другім фронтавым з'ездам, іначай кажучы, фронтам, але ня краем, не мясцовымі жыхарамі і дзеля гэтага складаецца з прыязджовых — беларусаў, латышоў, украінцаў, але ў ёй зусім няма прадстаўнікоў Беларусі, каторай доляй распараджаюцца пры помачы штыхоў і прыкладаў. Беларускі кангрэс стаў на пункце прызнаньня ўласьці рад і Беларуская Рада яшчэ да кангрэсу ўваходзіла ў зносіны з народным камісарам нацыянальных спраў Джугашвілі-Сталіным і мела ў нацыянальнай радзе (Радзе народаў. — Прып. Рэдакцыі) сваіх двох прадстаўнікоў.' Наагул, бальшавіцкі кірунак узяў верх на кангрэсе і рэзалюцыя аб краёвай уласьці была ўложана ў духу сканцэнтраваньня яе ў руках салдацкіх, работніцкіх і сялянскіх дэпутатаў Беларусі, ажно да скліканьня беларускага сэйму, каторы ўстановіць і форму праўленьня і далейшы лад краю. У гэтай пастанове бальшавіцкая рада народных камісараў[2] убачыла пакушэньне на сваю ўласьць — велікарускую ўласьць у беларускім краі — і, баючыся канкурэнцыі, ня зьдзержалася перад гвалтам над цэлым народам, жадаючым незалежнага федэратыўнага ладу ў Расейскай Рэспубліцы. Пры гэтым бальшавікі прыкрыліся яшчэ фіговым лістком «барацьбы з кадэтамі», каторых у беларускім нацыянальным руху зусім няма. Бязбогія адносіны, выказаныя падчас разгону з'езду і Рады, выказаныя тут грубасьць і зьдзекі, а таксама і самыя звычайныя гвалты — далёка выперадзілі дзеяньня жандараў мікалаеўскіх часоў.

Характэрна, што за 2 дні да закрыцьця

(Працяг на стар. 14).

МІКАЛАЙ АЛАДАЎ: ЗНАЁМЫ І НЕЗНАЁМЫ

Калі да мяне звярнуліся з просьбай даць для «ЛіМа» матэрыял пра Мікалая Ільіча Аладава — з нагоды ягонага юбілею, я засумнявалася: як жа тое можна было б зрабіць! Акурат на той час я працавала над матэрыяламі па гісторыі беларускай савецкай музыкі: цікавілі «белыя плямы», трэба было сеё-тое пераправерыць. У пошуках дакладных звестак звярнулася да старых падшывак «ЛіМа». І хаця нумароў газеты было небагата (ці то згубіліся ў гады ваеннага ліхалецця, ці то зрабіліся ахвярамі чыёйсьці пільнасці), з іх я даведалася пра шмат чаго новага, цікавага, у прыватнасці, пра свайго бацьку. Многае ўбачылася ў іншым святле. Прыйшлі думкі, якімі і хачу падзяліцца з чытачом.

Да 100-годдзя з дня нараджэння кампазітара



З цягам часу ўсё часцей народнага артыста БССР М. Аладава называюць кампазітарам-класікам. Вядома, што ён стаяў ля вытокаў беларускай кампазітарскай школы, быў адным з арганізатараў сістэмы музычнай адукацыі ў рэспубліцы, шэраг ягоных твораў закладваў аснову для развіцця буйных музычных жанраў у мастацтве Савецкай Беларусі. Гэтыя аб'ектыўныя факты прадстаўляюць парадна-афіцыйны бок справы.

Але тут жа паўстае шэраг трывожных пытанняў. Чаму пра большасць твораў Аладава нават прафесіяналы ведаюць толькі з кніг? Як здарылася, што, нягледзячы на высокія ацэнкі шэрагу ягоных сімфоній, ніводная з гэтых партытур не надрукаваная? Адкуль пайшло меркаванне пра цяжкасці выканання і ўспрымання ягонай музыкі?

Думаю, каб адказаць на гэтыя пытанні, трэба звярнуцца да тых фактаў яго біяграфіі, якія раней сарамліва абміналіся ці несвядома скажаліся. Вось, скажам, гэты, што мімаходзь успамінае С. Нісневіч у брашуры пра Аладава. Тут гаворка ідзе пра жыватворны ўплыў, які зрабіла на Мікалая Ільіча тая творчая дыскусія, калі ў Саюзе кампазітараў абмяркоўвалі рэдакцыйныя артыкулы газеты «Правда» — «Сумбур вместо музыки» і «Балетная фальшь» (1936 г.). Што хаваецца за тымі сціплымі радкамі? Каб узнавіць падзеі цалкам, звярнуся да ўспамінаў бацькі, якія я запісала ад яго летам 1969 года.

Да гадавіны смерці У. І. Леніна (1934 г.) М. Аладаў напісаў сімфанічную паэму «Мацней за смерць». Партытура яе, як большасць нотных запісаў даваеннага перыяду, згубілася. Але ўскосныя сведчанні даюць падставу меркаваць, што эмацыянальна-вобразны змест твора і яго музычны стыль былі блізкія да экспрэсіянізму. Канцэртнае жыццё паэмы напачатку складвалася няўдала. Дырыжор І. Гітгарц позна атрымаў партытуру і на рэпетыцыі быў вельмі раздражнёны, ці не паўгадзіны дамагаўся ад трубача дакладнай перадачы рытму, увесь час чапляўся да музыкантаў і давёў іх да шаленства. У час абедзеннага перапынку, у сталовай, гаварыў, што музыка паэмы чорт ведае што, нічога няма, суцэльныя дысанансы. Папаўзлі чуткі... Трэба было шукаць іншага дырыжора, але А. Бяссмертны хварэў, і за пульт давялося стаць самому аўтару. Як звычайна, твор развучваўся па групах аркестра, асобна адна ад адной. І хаця пра цэласнае ўражанне гаворкі быць на той час не магло, вечарам да Мікалая Ільіча прыйшлі змрочныя струннікі з двухсэнсоўнымі заўвагамі.

Толькі на аб'яднанай рэпетыцыі пачало нешта ясніцца. Затое на генеральнай аркестранты ў гонар аўтара наладзілі апладысменты. Там жа адбыўся імправізаваны лятучы мітынг, на якім прынялі рэзалюцыю аб звароце ў Наркамасветы з прапановай надаць Аладаву званне заслужанага артыста рэспублікі.

Гэты выпадак мне здаецца сімвалічным. Праўда, тады пашанцавала. А колькі разоў складаныя па змесце, індывідуальныя па інтанацыі творы Аладава не знаходзілі сваіх выканаўцаў? Бо чым сур'ёзней задума, своеасаблівей аўтарская манера кампазітара, тым большага прафесіяналізму і вышэйшай культуры патрабуецца ад інтэрпрэтатара. Страшна падумаць, колькі твораў у гісторыі музыкі аказаліся не пачутымі сучаснікамі з-за адсутнасці адэкватнага выканання!

Але звернемся да падзей 30-х гадоў. У сувязі з «антышастковічаўскай» кампаніяй, пра што таксама піша С. Нісневіч, аналагічныя з'явы пачалі шукаць у беларускай музыцы. Вось тут і прыдаліся бацькавы «злоўжыванні»: трагедыйная напружанасць і гарманічная складанасць паэмы «Мацней за смерць», гратэск ва уверцюры «Зары насустрач», «мудрагелістасць» музычнай мовы вакальна-сімфанічнай паэмы «Над ракой Арэсай».

З літаратуры вядома, што музычным «пакаяннем» Аладава з гэтай нагоды, як тады казалі, «адказам на крытыку» сталася Сімфаньета, выразная меладычная музыка якой і сёння не страціла сваёй прывабнасці. Бацька крыху інакш і не без гумару каменціраваў акалічнасці яе нараджэння.

У 1936 г. з Масквы прыслалі нашаму Саюзу кампазітараў значную грашовую суму на тое, каб заказаць беларускім аўтарам новыя творы. Тагачасны адказны сакратар саюза М. Іваноў (нядаўна рэабілітаваны, узнаўленне яго біяграфіі яшчэ наперадзе) разважыў, што паколькі ўсім і без таго вядома, што В. Залатароў і М. Аладаў умеюць пісаць сімфанічныя творы, ім трэба заказаць рамансы. Тым жа, хто ў буйных жанрах не працаваў (бракавала прафесіяналізму, менавіта тут і трэба паспрабаваць свае сілы. Бацька быў сведкам размовы Іванова з маладым кампазітарам: «Ну, Нестар, што ты будзеш пісаць, кантату ці сімфонію?» — Н. Сакалоўскі сціпла адказаў сваім «мядовым» голасам: «І тое, і іншае».

Зазначу, што сітуацыя парадаксальная, аднак вельмі тыповая для нашай палітыкі ў галіне

(Пачатак на стар. 13).

з'езд зьвярнуўся да Троцкага з пытаньнем, ці праўда, што на перагаворах ў Берасьці падымалася пытаньне аб прылучэньні Беларусі да Польшчы, на гэта дастаў катэгарычныя ўпэўненьня камісара інастранных спраў, што аб долі Беларусі пастановіць сам беларускі народ. У сваёй ноце саюзнікам Троцкі таксама спомніў, што работніцкі і сялянскі ўрад прызнаў аўтаномную Беларусь.[3] Гэтак згаджаюцца слова і дзела ў вуснах цяперашняй уласьці.

Мяйсцовыя газэты «страха ради нудейска» аднесьліся ціха да разгону з'езду. «Минский Голос» нічога не напісаў. «Минская газета» назвала гэта недаразуменьнем. Больш зачапіў гэтае «Социалист-Революционер», адзначыўшы нават факт нанясеньня п'янаму начальніку гарнізона Крывашэіну, зачыняўшаму з'езд, аплявухі членам з'езду п. Юр'евай за брыдкае («гнусное») абходжаньне,[4] што пацьверджана подпісамі 3-х членаў Устаноўчага Сэйму.[5] Газэта была зачынена быццам за надрукаваньне адозвы Украінскай рады. Назаўтра замест зачыненага «С.-Р.» выйшаў «Новый Социалист- Революционер».

[1] На ўвазе маецца кансультацыйны орган пры Народным камісарыяце нацыянальных спраў.

[2] Рада народных камісараў Заходняй вобласці.

[3] Урад Леніна не прызнаваў аўтаномію Беларусі і нават права на аўтаномію, калі не лічыць агульнай Дэкларацыі правоў народаў Расіі. Пра «безумоўнасць і поўнае права» беларусаў на самавызначэнне заявіў камісарыят Сталіна. Таварыш старшыні Усебеларускага з'езда Савіч правёў тэлеграфныя перагаворы са Сталіным. Адказы народнага камісара былі блытаныя. З іх вынікала, што самавызначэнне Беларусі павінна было адбыцца шляхам рэферэндуму. Толькі пасля гэтага Петраград абяцаў вывесці войскі, а беларусы атрымлівалі права ўстанавіць сваё кіраванне. Паколькі ў рэферэндуме павінны былі прыняць удзел і бежанцы, а іх вяртанне магло зацягнуцца на доўгі час, паколькі ў час рэферэндума войскі не выводзіліся, З'езд, на якім прысутнічалі прадстаўнікі бежанцаў і воінаў-беларусаў, палічыў неабходным спачатку ўтварыць дэмакратычнае кіраўніцтва, а потым арганізаваць вяртанне бежанцаў і выбары ва Устаноўчы Сход (Сойм) Беларусі.

[4] Пра грубае абыходжанне Крывашэіна з З. Юр'евай пісаў у сваіх мемуарах дэлегат Макар Косцевіч (Макар Краўцоў).

[5] Мабыць, маюцца на ўвазе ўжо абраныя дэлегаты на Устаноўчы Сход Расіі.

Прадмова, падрыхтоўка тэкста і каментарыі А СІДАРЭВІЧА.

МУЗЕЙ БУДУЕЦЦА, МУЗЕЙ ПРАЦУЕ

Беларуская экспазіцыя ў Гайнаўцы

Вось яна, доўгачаканая хвіліна адкрыцця! Праўда, пакуль што не музея, а ўсяго толькі выстаўкі ў памяшканнях фондасховішчаў будучага музея. Збудаваны першы і другі з трох карпусоў музейнага комплексу: першы — названае вышэй фондасховішча з майстэрнямі і рэстаўрацыйнай лабараторыяй, іншымі рабочымі памяшканнямі; у другім — размесціцца гатэль на 40 месцаў, бібліятэка, пакоі для супрацоўнікаў музея, актавая і канферэнц-зала (тут узведзены сцены і пракладзены камунікацыі); трэцяга, галоўнага корпуса, у якім размесцяцца экспазіцыйныя залы музея, пакуль яшчэ няма, ён існуе толькі ў праекце.

Гэткая чарговасць пабудовы музейных карпусоў цалкам апраўданая. Бо перш, чым стварыць музей, трэба сабраць экспанатуру, адрэстаўраваць гэтыя рэчы, стварыць умовы для іх захавання. Таму і патрэбны першы. Зараз ужо збудаваны і добраўпарадкаваны корпус, пазначаны ў афіцыйных дакументах індэксам «А». Другі корпус «Б» амаль гатовы. Тут будзе працаваць адміністрацыя музея, навуковы калектыў — тыя, хто будзе рыхтаваць канцэпцыю, тэматычныя планы экспазіцый, што размесцяцца ў будынку «В». А зараз патрэбны грошы, каб распачаць будаўніцтва корпуса «В» і дабудаваць другі. Шчыра скажам, што энтузіязм, з якім яшчэ пару гадоў пасылалі ахвяраванні на будаўніцтва музея беларусы з усяго свету, значна паменшаў, у той час як будаўніцтва далёка яшчэ не скончана. Адкрыццё выстаўкі ў напаўзбудаваным музеі мае адной з мэтаў актывізацыю магчымых фундатараў (ці спонсараў, як гавораць цяпер) Беларускага культурнага цэнтра на Беласточчыне...

На аўтобус у Гайнаўку я спазнілася, і сакратар Беларускага культурнага таварыства ў Беластоку Віктар Стахвюк узяўся падвесці мяне на сваёй «Сірэнцы». Мы памалу рушым па дарозе, а паабапал адкрываюцца велічныя, манументальныя краявіды з дубовымі гаямі, палеткамі, маляўнічымі буслянкамі ці не праз кожныя дзвесце метраў. Узгадваюцца класічныя апісанні беларускай прыроды Якубам Коласам. А вёскі зусім такія ж, як і ў нас на Вілейшчыне ці Магілёўшчыне, і мясцовае насельніцтва гаворыць па-беларуску, толькі з характэрным «польскім» вымаўленнем. На беларускай мове выдаюцца мясцовыя газеткі ў гмінах (рэдактарам адной з такіх з'яўляецца мастак Лёнік Тарасевіч). Ёсць штодзённая паўгадзінная беларуская перадача па мясцовым радыё. Беларусы Беласточчыны вельмі ганарацца гэтай сваёй перамогай. І гэта сапраўды перамога. Бо і сёння беларусам Беласточчыны даводзіцца супрацьстаяць паланізацыі, бараніць ад пажару цэрквы. Сваімі вачыма бачыла па дарозе ў Гайнаўку пагарэлішчы.

У Гайнаўцы нас сустракае Канстанцін Мікалаевіч Майсеня, старшыня грамадскага камітэта пабудовы музея. У камітэт уваходзяць, акрамя Майсені, старшыня Беларускага таварыства ў Гайнаўцы Аляксандр Баршчэўскі, дырэктар Гайнаўскага ліцэя Аляксандр Іванюк, віцэ-дырэктар Гайнаўскага тэхнікума Мікалай Нікалаюк і іншыя.

Неўзабаве сабраліся ўсе. Размеркавалі абавязкі, абмеркавалі культурную праграму выставы, на гэтым і развіталіся. Майсеня перадаў мне спіс будаўнічых матэрыялаў, неабходных для завяршэння аздаблення корпуса «А» пад выставу, якія Беларускі фонд культуры ўзяўся забяспечыць (і забяспечыў разам з абсталяваннем коштам больш як 20 тысяч рублёў, потым падараваным музею).

І вось новая вандроўка на Беласточчыну: нарэшце едзем рабіць выставу. У «Ікарусе» група мастакоў творчай суполкі «Пагоня» — іх запрасілі паказаць свае карціны і зрабіць экспазіцыю (перад намі перасек дзяржаўную мяжу фургон з мастацкімі творамі). Настрой ва ўсіх выдатны. Алесь Ліс і Віктар Доўнар спяваюць у час прыпынку. Яны нават і не падазраюць, што ў Гайнаўцы яны будуць рабіць нешта зусім іншае, далёкае ад мастацтва...

Сустрэлі на Беласточчыне вельмі гасцінна. Але тое, што мы ўбачылі ў музеі, нас ашаламіла: пакоі, прызначаныя пад выставу, застаўлены мэбляй, ацяпляльныя батарэі нефарбаваныя, у памяшканнях халадэча, асвятленне не падключана. А адкрыццё — неўзабаве, на яго запрошана шмат гасцей, у тым ліку і з эміграцыі.

Узяліся за работу. Праз дзень-другі падключылі ацяпленне, пафарбавалі батарэі. Музей ператварыўся ў мурашнік, дзе адначасова працавалі мастакі з Мінска, актывісты музея, вучні беларускага ліцэя і навучэнцы Гайнаўскага тэхнікума. Апошнюю ноч не клаліся зусім, але ўсё ж пад раніцу стала зразумела — паспелі, да таго ж выстава атрымалася, прычым вельмі прыстойная.

Я падала «кухню» падрыхтоўкі выставы не дзеля таго, каб упікнуць некага ў недапрацоўках, а дзеля таго, каб чытачы маглі ўсвядоміць своеасаблівасць, складанасць стварэння музея ў Гайнаўцы. Потым, калі страсці аціхлі, мы са спадаром Майсенем у ягонай канторы разважалі аб гэтым. На думку Канстанціна Мікалаевіча, падрыхтоўка выставы паказала, што пройдзена тая мяжа, дзе якой магчыма было весці справу стварэння музея на грамадскіх пачатках. Надышоў час пераводзіць яе на колы навуковай арганізацыі з адпаведным стаўленнем да кадраў супрацоўнікаў. Музей пачаў жыць, і гэта жыццё не павінна спыняцца з закрыццём выставы.

На адкрыццё ў Гайнаўку прыехалі дырэктар Дзяржаўнага музея БССР І. Загрышаў і старшы інспектар па музеях Міністэрства культуры БССР С. Маслоўскі. Прыехалі з канкрэтнай прапановай — узяць на стажыроўку ў Дзяржаўны музей БССР на некалькі месяцаў супрацоўнікаў Беларускага музея ў Гай-

культуры. Такое мажліва і сёння. Але што дзіўна, дык гэта рэакцыя Мікалая Ільіча, у якой вельмі дакладна адбіўся ягоны характар. Спрачацца і не спрабаваў. Напісаў два рамансы. А «сустрэчным планам» — Сімфаньету. Маўляў, можам і так. Але што выдае руку сапраўднага творцы, дык гэта індывідуальная «аладаўская» інтанацыя, якая прысутнічае ва ўсіх ягоных творах, незалежна ад таго, простай ці складанай мовай гаворыць кампазітар.

Да таго дадам, што змены стылю ў ягонай творчасці не адбылося. Проста стыль Сімфаньеты адпавядаў жанру і выканальніцкім магчымасцям студэнцкага аркестра, якому твор адрасаваўся. А вось у сімфоніі-баладзе «У суровыя дні» (1942 г.) трагедыйны змест зноў вымагаў экстатычна-напружаных кульмінацый, жорсткасці гучання. Гэта было ў рэчышчы традыцыі «ваеннай» сімфоніі, якая сфарміравалася ў еўрапейскай музыцы ў першай палове 40-х гадоў XX стагоддзя.

На кампазітарскім пленуме 1947 г. балада М. Аладава атрымала самую высокую адзнаку. Але не за гарамі быў год 48-ы, калі новыя дырэктывы партыі змянілі яе на процілеглую. Гэтыя падзеі ў беларускай музыцы, у адрозненне ад рускай гісторыкі старанна абыходзілі — быццам іх не было. Маўчаць пра іх і біёграфы кампазітара. Аднак прыадкрыем заслону часу.

У лютым 1948 г. ва ўсіх газетах з'явілася чарговая пастанова ЦК ВКП(б) «Об опере В. Мурадели «Великая дружба», [illegible] ў фармалізме, антынародным характары творчасці абвінавачваліся вядучыя савецкія кампазітары, якія сёння прадстаўляюць музычную класіку XX стагоддзя, — Д. Шастаковіч, С. Пракоф'еў, М. Мяскоўскі, А. Хачатуран і інш. На партыйных сходах ва ўстановах культуры Беларусі адразу пачаліся пошукі фармалістаў мясцовага ўзору. Непрыемнасці пагражалі многім, бо адсутнасць дакладных крытэрыяў з'явы давала неабмежаваныя магчымасці знеславіць як фармаліста кожнага, чыя музыка некаму асабіста не падабалася. Напачатку так яно і было. Але Саюз кампазітараў узяў справу ў свае рукі. 27 сакавіка ў «ЛіМе» быў надрукаваны даклад А. В. Багатырова, дзе прафесійна грунтоўна былі прааналізаваны праявы фармалізму ў беларускай музыцы. Першым у спісе з трох кампазітараў стаяла прозвішча М. Аладава — «самага яркага прадстаўніка мадэрнісцкага напрамку». Адзначаліся сувязі ягонай творчасці з экспрэсіянізмам, «неапраўданае «бушаванне» пачуццяў, пакутлівае ў сваёй перабольшанай складанасці». У творах кампазітара выяўляліся «рысы абстрактнай самапаглыблённасці і замкнутага псіхалагізма». Зразумела, у эпоху, калі добрае змагалася з лепшым, такія «рысы» ды настроі былі не своечасовымі.

Найбольш вострая крытыка прагучала ў адрас сродкаў музычнага ўвасаблення, якія «не даюць магчымасці стварыць музычныя вобразы, блізкія і зразумелыя нашаму савецкаму слухачу». Дакладна сказана, калі ўспомніць галоўную эстэтычную дактрыну таго часу з яе культам «обыденного сознания». Здаецца, каментарыі тут не патрэбныя.

Як жа паўплывала тое на бацьку? Не ведаю чаму, але тэма гэтая на маёй памяці ў нашай сям'і не абмяркоўвалася. У сваіх успамінах бацька яе таксама абмінаў. Толькі маці, хлебасольства якой увайшло ў легенды, абуралася, што калі неўзабаве пасля «лаянкі» святкавалі бацькаў юбілей і яна наладзіла шыкоўны банкет, прыйшло толькі сямёра гасцей. Не, яна не асуджала людзей за празмерную асцярожнасць. Але — «які ж зарад прапаў марна!»

Чаму я так падрабязна спынілася менавіта на гэтых эпізодах жыцця Аладава? Гэта не даніна модзе і ўжо зусім не спроба стварыць вакол бацькі нейкі арэол барацьбіта супроць палітычнай сістэмы. Ды апошняе было б няпраўдай. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі М. І. Аладаў свядома застаўся на Радзіме, з уласцівай для яго самаадданасцю і не без задавальнення займаўся асветніцкай дзейнасцю. У 1944 годзе ўступіў у партыю (успамінаў, што падаваў заяву ў 43-м, але ў сувязі з «падазроным» паходжаннем прымаць яго туды не спяшаліся).

Аладаў быў чалавек шчыры, цэласны і гарманічны. Ён прымаў жыццё такім, якое яно ёсць. І мяркую, таму, што ўсе ягоныя думкі былі сканцэнтраваныя на прафесіі: ёй быў адданы фанатычна. А вось у сістэму «не ўпісваўся».

Памятаю, А. В. Багатыроў, які добра ведаў бацьку яшчэ з юнацкіх сваіх гадоў, назваў яго лібералам. Здаецца, дакладней сказаць нельга. Аладава вылучалі сапраўдная інтэлігентнасць і высокая духоўнасць. Адказнасць за кожны свой крок, сумленнасць і бескампраміснасць нярэдка прымушалі яго рухацца супраць плыні, станавіцца на бок слабейшага (як, напрыклад, здарылася ў гісторыі з музыказнаўцам М. Р. Шыфрыным, якога ў свой час зняславілі як «касмапаліта»).

Кожны, хто сустракаўся з Аладавым, адразу адчуваў: гэта Асоба. Усё ў ім было незвычайнае: і вонкавы выгляд, і манера гаварыць, і жывое ўсеабдымнае пачуццё гумару. У сваім жыцці ён заўсёды кіраваўся цвярозым розумам, не прымаў бюракратычных правілаў. Адным словам — «нефармал». У гэтай сувязі вядомы беларускі фальклярыст Л. С. Мухарынская з асалодай успамінала такі выпадак.

Аднойчы ў кансерваторыі зрывалася фальклорная экспедыцыя, якой яна кіравала. Студэнты ўжо сядзелі ў аўтобусе, а тут высветлілася, што на падарожнай паперы не хапае подпісу. Начальства некуды з'ехала, і сітуацыя здавалася тупіковай. У роспачы Мухарынская кінулася параіцца да Аладава. Той, доўга не думаючы, распісаўся на дакуменце (маўляў, якая розніца, чый подпіс будзе стаяць, была б карысць справе) і пажадаў экспедыцыі шчаслівага шляху.

Так, М. Аладаў са сваёй гранічнай натуральнасцю і нежаданнем прыстасоўвацца да абставін «не ўпісваўся» ў сістэму, але і не адвяргаў яе. Сістэма ж яго не прымала. І менавіта таму я так падрабязна спынілася на афіцыйнай крытыцы ягонай музыкі, што гэты факт безумоўна адбіўся на лёсе творчай спадчыны Аладава. Грамадская думка была сфарміраваная. А каб мець чалавеку сваю асабістую — трэба музыку слухаць і вывучаць. Дзеля гэтага, як мінімум, патрэбны запісы ды партытуры. А каб з'явіліся тыя — маюць быць афіцыйныя рэкамендацыі. А каб іх даць — трэба абапірацца на грамадскую думку. Адным словам — казка пра белага бычка. Каб змяніць такое становішча, патрэбны вялікія намаганні многіх. Але прынясуць плён яны толькі ў адным выпадку — калі музыка жыццяздольная.

Вядома, час — лепшы суддзя. Сапраўднае жыццё твораў пачынаецца толькі пасля смерці іх творцы. Вось ужо 18 гадоў прайшло, як памёр Аладаў. Не, не было намаганняў многіх, каб загучалі ягоныя сімфоніі — лепшае, на думку беларускіх музыказнаўцаў, з ягонай спадчыны. Такія намаганні не ў традыцыях нашых музычных дзеячаў, і тых, хто кіруе мастацтвам. Ці то нацыянальнай свядомасці не хапае, ці то бракуе культуры. Правесці нейкую юбілейную кампанію — гэта калі ласка, а вось заняцца планамернай руплівай працай па адраджэнні спадчыны беларускіх савецкіх кампазітараў не атрымліваецца.

Канечне, я далёкая ад думкі, што ўсе творы Аладава, гэтаксама як і іншых кампазітараў, трэба адраджаць. У рэшце рэшт, і Бетховена дэмакратычны слухач ведае як аўтара трох сімфоній: 3-й, 5-й і 9-й. Патрабуецца адбор, стварэнне хрэстаматыі.

Сімфоніі Аладава яшчэ чакаюць свайго сапраўднага выканаўцу. А вось камерная музыка яго — ужо дачакалася. І што цікава, яна не страціла сваёй сучаснасці, а нават выявіла нейкія новыя рысы, новую выразнасць.

Вялікі поспех выпаў В. Цішынай, якая выступала ў Маскве з вакальным цыклам М. Аладава на вершы А. Кальцова. Моцнае ўражанне робяць рамансы Мікалая Ільіча ў выкананні В. Скорабагатава. Дарэчы, гэты таленавіты спявак не толькі ўзнавіў у канцэртным жыцці шэраг вакальных твораў, якія не гучалі многія гады, але і некаторыя з іх «рэабілітаваў» у мастацкіх адносінах. І яшчэ адно сённяшняе адкрыццё — выкананне І. Шумілінай фартэпіянных прэлюдый М. Аладава. У яе інтэрпрэтацыі яны набылі імпрэсіянісцкую вытанчанасць, абаяльную лірычнасць.

І вось што падумалася: калі ў музыцы Аладава новае пакаленне музыкантаў знаходзіць нешта блізкае свайму светаадчуванню, а слухачы ўспрымаюць гэтую музыку як напісаную сёння, дык яна не музейны экспанат, не помнік часу. Гэта жывая рэчаіснасць, элемент таго, што можна азначыць ёмістым паняццем — сучасная нацыянальная культура.

І ў ёй гучыць голас не толькі настаўніка, але і ягоных вучняў. Я ўпэўнена, што сёння можна гаварыць пра аладаўскую лінію ў беларускай музыцы — гэта значыць, звяртацца канкрэтна да творчасці Р. Бутвілоўскага, Ф. Пыталева, А. Зарубкі (чыя партытура «Курапаты», дарэчы, ужо год ляжыць у нашай філармоніі і, баюся, так і не дачакаецца свайго выканання), А. Соніна. Але гэта тэма асобнай гаворкі.

Радаслава АЛАДАВА.
Фота Ул. КРУКА.

Вучні гайнаўскіх школ аглядаюць выставу.

К. МАЙСЕНЯ, старшыня грамадскага камітэта пабудовы Беларускага музея.

Перад творамі мастакоў суполкі «Пагоня».

наўцы з тым, каб закончыць яе сумеснай экспедыцыяй па Гродзеншчыне, а сабраныя разам экспанаты перадаць Гайнаўскаму музею. Хацелася б, каб гэта выдатная ідэя была здзейснена.

Выстава ў будучым музеі мае назву «Жыве Беларусь!». Складзена экспазіцыя з трох асноўных раздзелаў. Адзін з іх — этнаграфічны, які ўтвораны з трох невялікіх залаў этнаграфіі з фондаў Гайнаўскага музея. Гэты раздзел мне падаўся найбольш прывабным. Цеплыня чалавечых рук ідзе ад гэтай экспазіцыі, афармленнай на сродкі Беларускага фонду культуры мастакамі Іграм Марачкіным і Хведарам Ладуцькам. Народны касцюм, маляўнічыя посцілкі, драўляная скульптура, кераміка, ручнікі, шыяны і корабы размешчаны на арыгінальных подыўмах і стэндах.

Другая частка экспазіцыі — зала сучаснага дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва (афармляў яе Леанід Бартлаў) — паслужыла мастком ад этнаграфічнай часткі да экспазіцыі твораў сучаснага мастацтва, прысвечаных выдатным дзеячам беларускай культуры, значным падзеям нацыянальнай гісторыі, помнікам дойлідства Беларусі. У гэтай зале экспанаваліся габелены Валянціны Маркавец-Бартлавай і Галіны Крываблоцкай. Зала габеленаў нібы прамянямі сонца асвятляецца вырабамі з саломкі — вялізнымі «павукамі» і саламянымі коньмі Таццяны Маркавец і птушкамі Алеся і Алены Лось.

Габелены «Шлях» (1986), «Светач» (1988) — Г. Крываблоцкай, «Набат» (1986), «Адраджэнне» (1988) В. Маркавец-Бартлавай настройвалі на хвалю духоўнага ўздыму. На гэтай хвалі і пачынаецца агляд экспазіцыі творчай суполкі «Пагоня».

Светлы вялікі калідор аддадзены пад графіку. Тут экспанавалася серыя плакатаў У. Крукоўскага «У бітвах за волю, у бітвах за долю» (1980), «Францішак Скарына» (1976), «Шануйма родную мову!» (1987) і іншыя, малюнкі Я. Куліка «Рагвалод. Тур», «Рагнеда. Ізяслаў», «Паўстанцы ля кузні» (1988), «Кірмаш на Беларусі ў XVIII ст.» (1977), серыі твораў М. Купавы «Сейбіты вечнага» (1976), «Пуцявінамі Якуба Коласа» (1984), «Родны кут Якуба Коласа» і «Шляхамі Янкі Купалы» (1982), аўталітаграфіі А. Лапіцкай, работы Уладзіміра і Міхася Басалыгаў, П. Драчова, выцінанкі Алеся Лася, каляровыя гравюры Я. Ліс, В. Мікіты, акварэлі В. Свістуновіча і аўталітаграфія Р. Сітніцы «Пакутнікам Беларусі» (1990 г.).

У зале жывапісу паўстала галерэя дзеячаў беларускай гісторыі і культуры: Рагнеда, Ефрасіння Полацкая, Францішак Скарына, Кірыла Тураўскі, Вітаўт... Прывабныя беларускія краявіды, нацюрморты, шэраг тэматычных карцін мастакоў А. Марачкіна, Я. Батальёнка, У. Сулкоўскага, Л. Бартлава, Ю. Піскуна, В. Свентахоўскай, У. Хадаровіча, А. Тарановіча, В. Маркавец прадставіў дзве карціны, напісаныя па ўражаннях паездкі па Беласточчыне, па мясцінах Кастуся Каліноўскага — «Мастаўляны. У старым парку» і «Мастаўляны. Рэчка Свіслач» (1988).

Скульптура на выставе была прадстаўлена творчасцю А. Шатэрніка: «Векапомная (Рагнеда)», «Кірыла Тураўскі», «Максім Багдановіч», «Якуб Колас», «Вінцэсь Дунін-Марцінкевіч» і інш.

Мастакі, якія прыехалі манціраваць выставу, прывезлі шэраг твораў у падарунак музею. Я. Батальёнак падараваў адну з лепшых сваіх карцін «Вечар у Суцечыцах», А. Марачкін ахвяраваў карціну «Навагрудак. Замчышча». Краявід «Дубы над Нёманам» падараваў У. Сулкоўскі. Графічныя творы перадалі музею браты Басалыгі, М. Купава, А. Лапіцкая, Я. Ліс, В. Мікіта, В. Свістуноў і Р. Сітніца, серыі плакатаў — У. Крукоўскі і У. Васюк, акварэлі — Л. Бартлаў, міні-габелены — Г. Крываблоцкая і В. Маркавец-Бартлава, саламянага коніка — Т. Маркавец.

Уразіла, як аглядалі выставу гайнаўскія дзеткі. Іх было вельмі шмат, як і дарослых (я не памятаю ў Мінску ніводнага такога шматлюднага вернісажу), і гэта вельмі ўзрадавала.

Справа зроблена, выстава працуе. Застаецца спадзявацца, што яна паслужыць справе прапаганды слаўнай мінуўшчыны беларускага народа, будзе будзіць гістарычную памяць і чалавечую годнасць беларусаў на Беласточчыне, ва ўсёй Рэспубліцы Польшча.

А сваім суайчыннікам яшчэ раз нагадваю рахунак для ахвяраванняў на будаўніцтва музея ў Гайнаўцы: 141 713 у рэспубліканскім жылсацбанку горада Мінска. Наша матэрыяльная дапамога Беларускаму музею ў Гайнаўцы вельмі патрэбная.

Таццяна ГАРАНСКАЯ,
сябра суполкі «Пагоня»,
загадчык аддзела помнікаў БФК.

СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

Знаходка ў Варацэвічах

Відаць, Напалеона Орду можна аднесці да тых мастакоў, якім удалося ажыццявіць абраную, галоўную мэту творчасці і жыцця. Для Орды мастака-рысавальшчыка, майстра архітэктурных краявідаў такой мэтай было стварэнне мастацкага вобраза радзімы.

Незвычайна склаўся і жыццёвы лёс Напалеона Орды. Нарадзіўся пад Пінскам. Вучыўся ў Свіслацкай гімназіі, Віленскім універсітэце, з якога быў выключаны, нават год і тры месяцы адседзеў у турме за прыналежнасць да тайнага таварыства. Але, апынуўшыся на волі, Орда неўзабаве зноў пацвердзіў сваю адданасць рэвалюцыйна-вызваленчаму руху — прыняў актыўны ўдзел у паўстанні 1831 года. У гэты час ён якраз служыў у коннай гвардыі Літоўскага корпуса і разам з многімі гвардзейцамі далучыўся да паўстанцаў. За адвагу Орда атрымаў чын капітана паўстанцкага войска і быў узнагароджаны ордэнам Залаты крыж.

Потым — вымушаная эміграцыя, дваццаць пяць гадоў жыцця ў Парыжы. Тут ён вучыцца жывапісу ў пейзажыста П'ера Жырара, музыцы і кампазіцыі ў свайго суайчынніка Фрэдэрыка Шапэна. У Парыжы Орда знаёміцца і з Адамам Міцкевічам.

І вось нарэшце абвешчана амністыя. Напалеон Орда адразу вяртаецца на радзіму. Зімой ён сціплы настаўнік, гувернёр у якім-небудзь магнацкім маёнтку, але толькі каб сабраць сродкі на летнія і восеньскія незалежныя вандроўкі са сваім знакамітым планшэтам і алоўкам. Змерыць, падлічыць вёрсты, што праехаў, прайшоў па дарогах Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны Орда, немагчыма. Але для характарыстыкі гэтага мастацка-грамадзянскага подзвігу Напалеона Орды можна прывесці выразную лічбу: ягоныя вандроўкі па радзіме працягваліся амаль дваццаць пяць(!) гадоў і зрабіў ён за гэты тэрмін амаль тысячу архітэктурных пейзажаў, заўсёды сціпла адзначаючы ў левым кутку малюнка: «Зрысавана з натуры».

Пасля смерці мастака сваячка перадала амаль усе ягоныя малюнкі ў Кракаўскі нацыянальны музей, які, нарэшце, усяго гадоў дзесяць таму назад выдаў поўны — 977 малюнкаў і акварэляў — з біяграфічнымі звесткамі, з падрабязным даведачным матэрыялам Каталог архітэктурных малюнкаў Напалеона Орды.

Памёр Напалеон Орда ў 1883 годзе ў Варшаве, дзе ён знаходзіўся па справах выдання чарговага свайго альбома архітэктурных відаў, але, згодна з завяшчаннем, быў пахаваны на радзіме, на могілках у Янаве (цяпер Іванава Брэсцкай вобласці) у родавым склепе.

Ад фальварка Варацэвічы, якім каля трохсот гадоў валодалі Орды (знаходзіўся ён, як звычайна, на ўскраіне вёскі з той жа назвай — Варацэвічы), амаль нічога не засталося. Адзінае — на роўным полі, за абсаджанай таполямі прамой дарогай і насыпам расце дубок. Прыблізна тут і стаяў вядомы па некалькіх малюнках Орды даволі сціплы драўляны дом.

Здавалася б, усё, што нагадвала пра жыццё мастака-патрыёта ў родных мясцінах, загінула. І вось нядаўна ў саміх Варацэвічах удалося выявіць «ордаўскую» рэч. Колькі часу назад у вёсцы была адноўлена і пачала дзейнічаць Крыжаўзвіжанская царква, невялікі цагляны храм. У час, калі цэрквы, касцёлы беспакарана зачыняліся, іх ператваралі ў склады, а то і разбуралі, варацэвіцкія прыхаджане з ужо зачыненай царквы разабралі абразы па хатах. Вось тады, гэта гадоў з дваццаць назад, адзін з сялян, сённяшні царкоўны стараста, і заўважыў на адваротным баку аднаго з абразоў з выявай Хрыста надпіс. Прачытаць яго ўдалося толькі часткова, але сэнс лёгка было зразумець: праваслаўным сяла Варацэвічы ў дзень асвятлення Варацэвіцкай крыжаўзвіжанскай царквы дораць абраз «владетели им. Ворацевичи фамилии Орда». Ніжэй допіс: «Обновлена сія икона... в 1907 году 12 декабря». Зараз гэты каштоўны менавіта сваім надпісам абраз заняў сваё месца ў храме.

Вядома, што Варацэвіцкая царква была пабудавана і асвечана ў 1872 годзе. Напалеон Орда, вярнуўшыся з эміграцыі, пражыў на радзіме 16 гадоў, дасягнуў вышыні ў сваёй творчай дзейнасці — якраз распачаў выданне славутых альбомаў. Значыць, гэты вечны вандроўнік ніколі не губляў сувязі з роднымі Варацэвічамі — бываў, жыў тут, паважаў сваіх землякоў-сялян, аб чым яшчэ раз сведчыць «імянны» варацэвіцкі абраз. Хоць і ад імя роду Ордаў, але абраз, безумоўна, падарыў царкве сам Напалеон Орда, бо ніякай радні, дарослых нашчадкаў Ордаў, у Варацэвічах у той час не было.

Л. ПРАКОПЧЫК.

ПОЗІРК У МІНУЛАЕ

Яшчэ адна ахвяра

У лістападзе 1927 года ў Слоніме адбыўся павятовы з'езд членаў Таварыства беларускай школы. На з'ездзе выбралі акруговую ўправу з пяці чалавек. Старшынёй стаў Сымон Жыткевіч, сакратаром — Алена Лябецкая з Казлоўшчыны.

Для беларускай культурна-асветнай установы ледзь удалося знайсці памяшканне з двух пакояў на Ружанскай вуліцы ў доме № 5. У адным з пакояў размясцілася ўправа, у другім — беларуская кнігарня.

Мне пашэнціла ведаць Сымона Мікалаевіча.

У той час я вучыўся ў Віленскай беларускай гімназіі і, прыязджаючы на канікулы ў родную вёску Чамяры, сяды-тады бываў у Слоніме, дзе заўсёды заходзіў у кнігарню. Мяне ветліва сустракаў старшыня акруговай управы ТБШ С. Жыткевіч, распытваў пра вучобу, раіў пачытаць творы беларускіх пісьменнікаў, што выдаваліся ў Вільні.

У тым жа 1927 годзе не без дапамогі старшыні ўправы сяляне Вялікай Кракоткі адкрылі бібліятэку-чытальню імя Янкі Купалы, якая працуе і сёння, а сяляне вёскі Чамяры — такую ж бібліятэку імя Якуба Коласа.

Тады я, пятнаццацігадовы юнак, не ведаў біяграфіі гэтага культурнага, тактоўнага, лагоднага чалавека. І толькі праз гады даведаўся пра яго няпросты жыццёвы шлях.

Сымон Мікалаевіч Жыткевіч нарадзіўся ў 1893 годзе ў сялянскай сям'і. У 1914 годзе скончыў Свіслацкую настаўніцкую семінарыю і працаваў настаўнікам у Слонімскім павеце. У час першай сусветнай вайны, у 1915 годзе, разам з бацькамі эвакуіраваўся ў Магілёў. У тым жа годзе быў мабілізаваны ў армію. У 1916 годзе закончыў Аляксандраўскае ваеннае вучылішча ў Маскве і быў пасланы на фронт. Бацькі тым часам апынуліся ў Сібіры, і ў 1918 годзе ён паехаў да іх. І трэба ж так здарыцца, — яго там мабілізавалі ў армію Калчака і, як пісьменнага чалавека, прызначылі камандзірам узвода Саянскага палка горада Омска. У канцы года ён трапіў у палон, ці мо наўмысна перайшоў да чырвоных, і з 1919 года служыў у 1-й Чырвона-Уральскай дывізіі, настаўнічаў сярод чырвонаармейцаў. У 1920 годзе на Каўказскім фронце ваяваў з часцямі Врангеля, быў паранены і эвакуіраваны ў Саратаў. У 1921 годзе вярнуўся дадому, працаваў настаўнікам. З 1926 года стаў членам ТБШ.

У архіўнай даведцы гаворыцца, што С. Жыткевіч быў членам КПЗБ, членам Грамады. У 1928 — 1930-х гадах удзельнічаў у рабоце Цэнтральнага сакратарыята Беларускага рабоча-сялянскага клуба «Змаганне», працаваў загадчыкам кнігарні ў Вільні, а таксама арганізоўваў беларускія харчовыя кааператывы, у праўленні якіх вылучаў актыўных членаў КПЗБ. 1 ліпеня 1929 года яго выбралі сакратаром клуба «Змаганне» ў Слонімскім павеце.

30 студзеня 1930 года польская паліцыя арыштавала Сымона Мікалаевіча і пасадзіла ў вядомую турму Лукішкі. А праз год Віленскі акруговы суд засудзіў яго на 4 гады катаржнай турмы.

Сымон Мікалаевіч радасна сустрэў вызваленне і ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Ён лічыў, што збываюцца яго запаветныя мары. Нарэшце, у Вялікай Кракотцы адкрылася доўгачаканая беларуская школа. І былы вязень панскіх турмаў з вялікай ахвотай пайшоў туды працаваць настаўнікам.

Толькі радасць была кароткая. 12 кастрычніка 1939 года С. Жыткевіча арыштавала НКУС. Абвінавацілі яго было вельмі лёгка: служба ў Калчака. І хоць Сымон Жыткевіч потым заяваў з белымі, гэта нікога не цікавіла. 2 ліпеня 1940 года яго асудзілі на 8 гадоў папраўча-працоўных лагераў.

Ужо ў нашы дні ў КДБ сыну Сымона Мікалаевіча паведамілі, што праз тры месяцы пасля таго суда бацька «памёр».

... Жонка Сымона Жыткевіча Вера Міхайлаўна засталася ў вёсцы з трыма малымі дзецьмі. Праўда, не надоўга. Восенню сям'ю «ворага народа» вывезлі ў Паўночна - Казахстанскую вобласць. Сем гадоў жылі ў зямлянцы. Галадалі, хоць маці і працавала ў саўгасе.

Вера Міхайлаўна, дзве дачкі і сын — выжылі. Вярнуліся ў Кракотку на папялішча. Зноў, як і ў Казахстане, дзеці пайшлі жабраваць.

Не пералічыць гора, якое зазнала рэпрэсіраваная сям'я. Толькі ўпартасць і прага да жыцця не далі памерці, перамаглі. Сын Мікалай скончыў Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію, стаў кандыдатам навук. Малодшая дачка Марыя — ветурач. Старэйшая Галя была дырэктарам школы, цяпер на пенсіі...

Пастановай Прэзідыума Гродзенскага абласнога суда 17 красавіка 1967 года прысуд у адносінах да Сымона Мікалаевіча Жыткевіча ад 12 кастрычніка 1940 года быў адменены і «справа вытворчасцю спынена за адсутнасцю складу крымінальнага злачынства».

Анатоль ІВЕРС.

г. Слонім.

«НАША СЛОВА» ПРА РОДНАЕ СЛОВА

На вокладцы чарговага нумара бюлетэня Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны «Наша слова» — партрэт У. Караткевіча. Да 60-годдзя з дня нараджэння выдатнага дзеяча на нашай нацыянальнай ніве, цудоўнага пісьменніка прымеркаваны і артыкул-успаміны С. Законнікава «Ахоўная зорка». «Слова Уладзіміра Караткевіча, — зазначае аўтар, — абуджае страчаную беларусамі нацыянальную годнасць, свядомасць, дапамагае нам адчуць сябе роўным народам між іншымі. Яно і надалей заўсёды будзе ахоўнаю зоркаю над «зямлёю пад белымі крыламі».

Пад рубрыкай «Трыбуна дэпутата» — развагі намесніка старшыні Смаргонскага гарвыканкома, народнага дэпутата БССР А. Вярцінскага «Няхай радуе роднае слова». Загалоўкам «Калі слова прыроднае, дык яно і годнае» аб'яднаны выпісы, зробленыя З. Санькам і А Гурыновічам пераважна з даўнейшых і сучасных слоўнікаў, з артыкулаў па культуры мовы Ф. Янкоўскага, А, Каўруса, В. Красоўскага.

Друкуецца заканчэнне артыкулаў Г. Сагановіча «Літва! Мая Айчына!..», артыкулы А. Каўруса «Вус, Вусік... Усаў», А. Мікалайчанкі «Адраджэнскі марафон», падборка «Лісты на адрас «Нашага слова», рэзалюцыя мітынгу-рэквіему «Дзяды-90», вершпрысвячанне А. Хатэнкі А. Марачкіну, іншыя матэрыялы.

Дзякуючы «Нашаму слову» ёсць мажлівасць зазірнуць і ў штотыднёвы самвыдатаўскі лісток пад назвай «Аб усім, што баліць», які выходзіў у 1975—1976 гадах за подпісам Сымона Беларуса.

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКАЯ ОРДЭНА ДРУЖБЫ НАРОДАЎ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАНСЕРВАТОРЫЯ ІМЯ А. В. ЛУНАЧАРСКАГА

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад прафесарска-выкладчыцкага складу (для тых, хто мае мінскую прапіску):

Кафедра струнных народных інструментаў (гітара)

ст. выкладчык — 1

Кафедра інструментоўкі, аранжыроўкі і чытання партытур

ст. выкладчык — 1

Кафедра грамадскіх навук (палітычная гісторыя)

ст. выкладчык — 1

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Заявы і дакументы, згодна Палажэнню аб конкурсах, накіроўваць на імя рэктара на адрас: 220600 г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30.

Даведкі па тэл.: 27-49-42; 26-06-70

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и совета Союза писателей БССР. Минск. На белорусском языке.

Літаратура і Мастацтва

Выходзіць раз на тыдзень, па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61; намеснік галоўнага рэдактара — 33-25-25; адказны сакратар — 33-19-85; аддзел публіцыстыкі: Міхась ЗАМСКІ, Віталь ТАРАС — 33-19-65; аддзел пісьмаў і грамадскай думкі: Людміла КРУШЫНСКАЯ, Марыя ГІЛЕВІЧ — 33-19-85; аддзел інфармацыі: Алесь МАРЦІНОВІЧ — 33-24-62; аддзел крытыкі і бібліяграфіі: Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ — 33-22-04; аддзел літаратуры: Юрась СВІРКА — 33-22-04; аддзел музыкі: Святлана БЕРАСЦЕНЬ — 33-21-53; аддзел тэатра, кіно і тэлебачання: Жанна ЛАШКЕВІЧ — 33-21-53; аддзел выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў: Пётра ВАСІЛЕЎСКІ — 33-24-62; аддзел народнай творчасці і культасветработы — 33-24-62; аддзел мастацкага афармлення: Уладзімір ТАБУШАЎ — 33-44-04; фотакарэспандэнт: Уладзімір КРУК — 33-24-62; бухгалтэрыя — 23-73-37.

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛіМ». Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Галоўны рэдактар Мікола ГІЛЬ.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Анатоль БУТЭВІЧ, Анатоль ВЯРЦІНСКІ, Андрэй ГАНЧАРОЎ (нам. галоўнага рэдактара), Уладзімір ГІЛЕП, Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Лілія ДАВІДОВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Алесь ЖУК, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Юрась СВІРКА, Рычард СМОЛЬСКІ, Уладзімір СТАЛЬМАШОНАК, Віктар ТУРАЎ.

Адказны сакратар Барыс ПЯТРОВІЧ.